№ 34 (344) 19 верасьня 2003

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Тэма нумару

Нашы грыбы



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Яны многа могуць расказаць пра нас. На іх зьбіраньне мы марнуем час, сілы і бэнзын. Яны калярыйныя, але маласпажыўныя. Яны падступныя і небясьпечныя, як рыба фугу. Яны нашпігаваныя радыяцыяй, нібы маленькія атамныя бомбы. Аднак грыбная ліхаманка чапляе нас ня менш за дакопкі й газавы крызыс. Нібы на генным узроўні беларусаў цягне ў лес. Чым грыбы гэтак вабяць беларусаў? Грыбы ў страве, у дыеце, на кірмашы, у мове, у прозьвішчах. Галоўныя грыбнікі Беларусі — у грыбах з «НН». Старонкі 4—7.

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Да пытаньня пра Люксэмбург,

або Труба ў руках і радовішчы ў небе

Сярод сочынскіх выказваньняў Пуціна два падаюцца ключавымі. Адно зь іх адрасавана беларускаму народу, другое — менскаму кіраўніцтву. Народу Пуцін паабяцаў захаваньне беларускага сувэрэнітэту, падмацаваўшы яго магутным прыкладам Вялікага Герцагства Люксэмбурскага. Для лукашэнкаўцаў да сочынскай сустрэчы была падрыхтаваная больш дзелавая прапанова — беларускі ўдзел у распрацоўцы газавых радовішчаў Сібіру.

«Як мы ведаем, Люксэмбург карыстаўся валютай Бэльгіі, і ад гэтага ягоны сувэрэнітэт не цярпеў», — сказаў Пуцін. Па-першае, гэта не зусім так. Нягледзячы на валютны саюз, грашовая адзінка Люксэмбургу называецца люксэмбурскім франкам, і хоць каштуе ён сапраўды столькі, колькі й бэльгійскі, але люксэмбурскі мае свой дызайн, а Люксэмбург — гарантаваныя правы ў саюзе. Між тым Беларусі прапануецца расейскі рубель і Крэмль на ім. Гэта значыць, не «інтэграцыя з», як у выпадку Люксэмбургу, а «інтэграцыя ў». А пры такіх прапановах да горла беларуса падступае камяк трывожнага досьведу. Бэльгія ж ніколі не акупавала Люксэмбургу. Тады як за 200 гадоў расейскага панаваньня Беларусь была бязжальна скарыстаная Масквой як буфэр і разьменная манэта ў крывавых войнах, што тройчы ставіла беларусаў на мяжу фізычнага вынішчэньня. Я ўжо не кажу пра такія імпэрскія дробязі, як векавая забарона беларускай мовы ці 40 тысячаў расстраляных у Курапатах. Калі б краіне прапаноўвалі эўра, а не рубель, напэўна, у Беларусі менш было б насьцярожанасьці, але рубель, ды ў такой форме…

Гэта не эканамічны, а палітычны канфлікт і не эканамічныя, а палітычныя прапановы. Калі адкінуць усе дробязі — асабістыя амбіцыі мясцовага князька і г.д. — клясычная імпэрыялістычная сытуацыя: вялікая дзяржава выкручвае рукі малой, каб узяць пад кантроль яе багацьці.

У абмен за адмову ад манэтарнага сувэрэнітэту і продаж «Белтрансгазу» па зьніжанай цане лукашэнкаўскім бізнэсоўцам абяцаецца ўдзел у распрацоўцы газавых радовішчаў у Сібіры. Маўляў, спадарыня Жураўкова толькі нядаўна зь Цюмені, дык мілості просім назад. Расея — шчодрая душа, толькі ня мае гатоўкі, каб заплаціць за «Белтрансгаз» адразу?

Нядаўна ў Маскву на даверлівую размову запрашалі лідэраў правае апазыцыі, каб бяз прэсы і публічнасьці пачаць адносіны з чыстага ліста. Апазыцыя паверыла, мусіць, дазволіла сабе шчырасьці і чуласьці. І стужка з запісам гэтых шчырасьцяў кладзецца на стол беларускіх спэцслужбаў. Дайце веры, не Аляксандар Дабравольскі запісаў яе пад сталом. У гэтым — уся сёньняшняя Масква. Яна сьлязам ня верыць, як, зрэшты, даўно ўжо ня верыць і любові.

Толькі добры дурань у Халопенічах паверыць, што ў 2008 годзе Расея сапраўды адмовіцца ад «часовага» расейскага рубля і пяройдзе на «сталы» саюзны. Але трэба быць папраўдзе дабрызным дурнем, каб паверыць у казку пра радовішчы, якімі нашых Жураўковых ды Ваганавых Расея адорыць пасьля пераходу на рубель і продажу «Белтрансгазу». І трэба быць поўным Ванькам-славяназнаўцам, каб думаць, што Масква так ставіцца толькі да апазыцыі, а вось з намі, Ванькамі-славяназнаўцамі, яна абыходзіцца чэсна і па-брацку.

Рызыкну патлумачыць псыхалягічныя прычыны такога абыходжаньня. У Расеі — шавіністычны чад. Дастаткова зірнуць на спэктар перадвыбарчых кааліцый, што рвуцца ў Думу. «Радзіма» з Рагозіным у першай тройцы, «Вялікая Расея — Эўразійскі Саюз» з Барадзіным, ЛДПР з Жырыноўскім, камуністы з Кандраценкам, «Русь», Усерасейскі дзяржаўны саюз… Магчыма, гэта вынік чачэнскае траўмы і з часам мінецца. Расейская палітычная эліта складаецца з нацыяналістаў. А для нацыяналіста слова, дадзенае чалавеку зь іншае супольнасьці, значыць столькі ж, колькі для мафіёзі — дадзенае фраеру.

Беларусы для Расеі — «іншае». Так было, і так будзе. Як палякі. Яруззэльскі, дарэчы, таксама залежаў ад паставак расейскае нафты й вугалю і таксама душыў апазыцыю. Ён да таго ж насіў тоўстыя акуляры. Гэта ня шкодзіла яму бачыць нацыянальныя інтарэсы Польшчы далей за заўтрашні дзень.

* * *

Недзе зараз павінны стаць зразумелымі прычыны камбінацыі з Навіцкім. Пакуль няма кадравых зьменаў, няма ніякіх зьменаў.

Ключавое пытаньне, якім мучацца нашы дыялектыкі ботаў і анучаў (маю на ўвазе палітыкаў і палітолягаў усіх колераў): а што будзе, калі сапраўды Расея газ... ммм… Беларуская палітыка пачнецца з чыстага ліста. У астатнім жа Захад ня выдасьць, Масква ня зьесьць і неба — г.зн. дэмакратыя і манна нябесная — на зямлю не ўпадзе.

Андрэй Дынько

АР

Далі газу, але не адразу

Саюз Беларусі і Украіны

Колькі будзе каштаваць газпромаўскі тавар? Інфармаваныя расейскія крыніцы ня маюць тут адзінства. Паводле «Коммерсанта», да канца гэтага году ў Беларусь будуць дапастаўленыя раней заплянаваныя 10,2 млрд кубікаў газу па цэнах «пятага поясу» Расеі (912 расейскіх руб. за тыс. куб.м). Да 1 студзеня 2004 г. застануцца ранейшымі для «Газпрому» і кошты транзыту праз Беларусь (у 2,5 разоў ніжэйшыя, чым ва Украіне). Кошт паставак газу «Газпромам» у Беларусь у 2004 г. можа скласьці 50—55 даляраў за тыс. куб.м. Дадатковыя затраты беларускага бюджэту ў такім разе складуць 300—400 млн даляраў.

«Газпром» здаўся? Лукашэнка называў лічбу ў 120 мільёнаў даляраў, але гэта магчыма толькі пры кошце газу ў 42 даляры за тыс. кубоў пры нязьменнасьці адпаведных цэнаў «Ітэры». Праўда, «Известия» пацьвярджаюць, што «Газпром» «зьдьмуўся» і гатовы прадаваць газ па 40—45 даляраў за тыс. куб.м. «А ўсё таму, што да 2007 году альтэрнатывы прапампоўцы газу праз Беларусь «Газпром» ня мае. Дакладней, ёсьць — тая самая Украіна, альтэрнатыву якой яшчэ нядаўна шукалі ў Беларусі».

Выдаткі могуць быць часткова кампэнсаваныя за кошт транзытных тарыфаў. Транзыт па газаправодзе Ямал—Эўропа цяпер прыносіць Беларусі 30 млн даляраў. Пасьля падвышэньня тарыфаў прыбыткі дзяржавы ўзрастуць да 75 млн даляраў у год.

Працяг тэмы на старонцы 3.

Падпіску на чацьвёрты квартал

(кастрычнік—сьнежань) прымаюць на поштах і ў шапіках «Белсаюздруку». Падпіскаю газэта абыдзецца таньней, асабліва калі падпісвацца на шапік (у Менску). Падпісны індэкс 63125. Цана на месяц 2043 рублі, на шапік — 1360 рублёў.

Беларусь мяняецца — «Наша Ніва» застаецца. Газэта і надалей будзе незалежнаю, саліднаю, пазытыўнаю.

Дык падпісвайся!

Ліцэісты вучацца

Чыноўнікі робяць выгляд, што Беларускага ліцэю не існуе. А міліцыянты ў форме і ў цывільным дзяжураць каля памяшканьняў, дзе зьбіраюцца ліцэісты.

Ад 8 верасьня ў Беларускім ліцэі йдуць заняткі. Будынак на вул.Кірава стаіць пусты, дзяцей і выкладчыкаў туды не пускаюць. Аднак 16 верасьня ліцэістам вярнулі частку кампутарнае клясы, абсталяванай у ліцэі на бацькоўскія грошы, — пяць машынаў і дзевяць сталоў да іх (усяго было па дванаццаць — рэшту вернуць пазьней, пасьля афармленьня астатніх дакумэнтаў). Ліцэйскае дабро пакуль захоўваецца ў Чырвоным касьцёле і ва Ўправе БНФ.

Працяг на старонцы 13.

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Cuba libre!

18 верасьня спаўняецца роўна паўгоду з таго дня, як рэжым Фідэля Кастра адправіў за краты 75 кубінскіх апазыцыянэраў. У камэрах апынуліся больш за сорак каардынатараў ініцыятывы «Варэла», больш за дваццаць журналістаў ды іншыя людзі з прадэмакратычных рухаў. Усе яны асуджаныя па сфабрыкаваных абвінавачаньнях на тэрміны ад 6 да 28 гадоў турмы толькі за тое, што выказалі пункт гледжаньня, адрозны ад афіцыйнага.

Аднак голас свабодных кубінцаў гучыць усё мацней. Менавіта гэтага баяцца Фідэль Кастра і ягоны ўрад. Тысячы кубінцаў ужо праявілі сьмеласьць: не зважаючы на ўсюдыіснасьць таемнай паліцыі, насуперак урадавай прапагандзе, яны паставілі свае подпісы пад дэклярацыяй ініцыятывы «Варэла». Гэты дакумэнт заклікае да правядзеньня, у адпаведнасьці зь дзейнай кубінскай канстытуцыяй, свабодных выбараў, а таксама рэфэрэндуму аб свабодзе выказваньняў і сходаў, прадпрымальніцтва, аб вызваленьні палітычных вязьняў. Рэжым гэтыя патрабаваньні ў лепшым выпадку ігнаруе, у горшым — перасьледуе людзей, якія наважваюцца іх выказваць... Тое самае і зь любымі падобнымі ініцыятывамі.

Апошняя хваля канфрантацыі, якая супала з антыэўрапейскімі выпадамі кубінскіх афіцыйных асобаў, гэта ня што іншае, як праява слабасьці ды роспачы. Рэжым губляе сілы, як гублялі іх намэнклятурныя ўлады краінаў за жалезнаю заслонаю пры канцы 1980-х. Унутраная апазыцыя ўмацоўваецца. Яе не скарыла сакавіцкая карная акцыя. Мінае час, рэвалюцыя разам з сваімі правадырамі старэе, рэжым нэрвуецца. Фідэль Кастра добра ведае, што аднойчы рэвалюцыя памрэ разам зь ім.

Што будзе пасьля — ніхто дакладна ня ведае. Але чым ясьней сёньня будуць разумець у Брусэлі, Вашынгтоне, Мэхіка, сярод кубінскае эміграцыі ды на самой Кубе, што свабода, дэмакратыя і працьвітаньне вострав залежаць ад падтрымкі кубінскіх дысыдэнтаў, тым больш шанцаў на негвалтоўны пераход кубінскай супольнасьці да дэмакратыі заўтра.

Падтрымка кубінскай апазыцыі зьяўляецца абавязкам дэмакратычнага сьвету, безадносна да таго, як доўга яшчэ кубінскія сталіністы будуць трымаць уладу. Апазыцыя мусіць адчуць такую ж замежную падтрымку, якую мелі 13 гадоў таму палітычныя дысыдэнты ў яшчэ падзеленай Эўропе. Асуджэньне рэпрэсій і канкрэтныя дыпляматычныя крокі Эўропы, Лацінскай Амэрыкі ды Злучаных Штатаў былі б найлепшым спосабам ціску на рэпрэсіўны кубінскі рэжым.

Нельга сказаць, што амэрыканскае эмбарга Кубы дало патрэбны вынік, але нельга гэтага сказаць і пра эўрапейскую палітыку, якая данядаўна была мякчэйшая. Трэба пераадолець трансатлянтычны раскол у пытаньні эмбарга і скіраваць усе сілы на непасрэдную падтрымку кубінскіх дысыдэнтаў, вязьняў сумленьня ды іхных сем'яў. Эўропа мусіць цьвёрда сказаць, што Фідэль Кастра дыктатар, а дыктатар ня можа быць партнэрам дэмакратычных краінаў, пакуль не распачне працэсу палітычнае лібэралізацыі.

Эўрапейскія краіны мусяць стварыць «Кубінскі дэмакратычны фонд» для падтрымкі маладое кубінскае грамадзянскае супольнасьці. Фонд мусіць быць гатовы да хуткага выкарыстаньня ў выпадку палітычных зьменаў на высьпе.

Нядаўні эўрапейскі досьвед мірнага пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі ў Гішпаніі, а пазьней у краінах Цэнтральнае Эўропы натхніў кубінскую апазыцыю. Сёньня менавіта Эўропа, улічваючы яе гістарычны досьвед, не павінна вагацца. Гісторыя ўскладае на яе гэты абавязак.

Вацлаў Гавал, былы прэзыдэнт Чэскай рэспублікі
Арпад Гэнц, былы прэзыдэнт Вугоршчыны
Лех Валэнса, былы прэзыдэнт Польшчы

Артыкул друкуецца адначасова ў наступных газэтах: Frankfurter Allgemeine Zeitung (Нямеччына), The Daily Telegraph (Вялікая Брытанія), The Washington Post (ЗША), Le Monde (Францыя), La Repubblica (Італія), Politiken (Данія), MF Dnes (Чэхія), SME (Славаччына), Gazeta Wyborcza (Польшча), Der Standard (Аўстрыя), Neue Zurcher Zeitung (Швайцарыя), Trouw (Нідэрлянды), Наша Ніва (Беларусь), Новые известия (Расея), Magyar Hirlap (Вугоршчына), Romana Libre (Румынія), Jutarnji list (Харватыя).

PHOTO.BYMEDIA.NET

Дзень зачыненых газэтаў

19 верасьня Беларуская асацыяцыя журналістаў ладзіць акцыю «Дзень зачыненых газэтаў». У праграме — уручэньне прэміі імя Дз.Завадзкага, выстава зачыненых газэтаў, вёрстка сымбалічнай «Адкрытай газэты», выступы Зьмітра Бартосіка і Лявона Вольскага зь Пітам Паўлавым. Месца правядзеньня — канфэрэнц-заля гатэлю «Беларусь». Пачатак а 16-й.

Час правых

У 1999 г. Анатоль Лябедзька, камэнтуючы саюзную дамову, сказаў: яе рэалізацыя залежыць ад таго, хто каго перахітруе. Паколькі ўлада ў Беларусі не абапіраецца на інтэлектуальную эліту і нават варожая ёй, няцяжка было прадказаць хто — Масква зь яе тысячагадоваю азіяцка-бізантыйскаю традыцыяй ці каманда палітыкаў-аматараў, якая вырашыла зрабіць 10-мільённы народ закладнікам сваіх амбіцыяў.

Пуцін дамогся галоўнага: у вачох расейскага электарату ён стаў галоўным інтэгратарам. Пачаўшы распрацоўку грашовае тэматыкі, ён свае пазыцыі ўмацоўвае. Ствараецца нэгатыўны вобраз «хітрага бульбаша», які хацеў за пустыя абяцанкі мець дармовыя расейскія газ і нафту. Церпіць фіяска галоўная мроя Лукашэнкі — пра «шапку Манамаха». Цяперашняе кіраўніцтва Беларусі стала закладнікам уласнае інтэграцыйнае рыторыкі.

Нашу гаспадарку чакае нялёгкі час. Ня будзем шкадаваць народ: некалі, пабачыўшы цяжкасьці пераходнага пэрыяду ў суседніх краінах, ён сам запатрабаваў сабе кіраўніцтва, якое абяцала захаваць востраў «рэальнага сацыялізму». Больш істотна тое, што за гэтыя дзевяць гадоў бальшыня пераканалася: захаваць востраў ня ўдасца. Альтэрнатывы эканамічным і сацыяльным рэформам няма. Гэтая бальшыня бачыць месца Беларусі ў супольнасьці эўрапейскіх дзяржаваў, а ня ў нейкім небывалым саюзе.

Каб перажыць нялёгкі час, патрэбныя рэформы. Але прэзыдэнцкая каманда рэтраградаў ex definitio ня здольная правесьці эканамічныя і сацыяльныя рэформы. Няздольныя правесьці рэформы і гэтак званыя левацэнтрысты. Раздробленая сацыял-дэмакратыя ў Беларусі мае варты жалю інтэлектуальны ды кадравы рэсурс. Калі б цяпер у Беларусі склалася форс-мажорная сытуацыя, «левацэнтрысты» ня мелі б на руках ніводнае гатовае праграмы, канцэпцыі, законапраекту... Сьцяг сацыяльнае дэмакратыі паступова перахоплівае ПКБ, але ўжо адна назва гэтае партыі адпалохвае ад яе левадэмакратычны электарат. У лепшым стане правы бок палітычнага спэктру. Ён не сэгмэнтаваны. Кожная партыя займае сваё месца: нацыяналісты (КХП-БНФ), нацыянал-дэмакраты (Партыя БНФ) і лібэралы (АГП). Нягледзячы на перасьлед, дзьве апошнія партыі маюць кадравы й інтэлектуальны рэсурс, а АГП — даволі салідныя праекты сацыяльна-эканамічных рэформаў.

У Беларусі — у адпаведнасьці з законам сацыяльна-палітычнага ківача — можа надысьці час правых. Усё залежыць ад таго, наколькі правільна яны змогуць выпрацаваць і рэалізаваць сваю тактыку ў бліжэйшыя тры гады.

Анатоль Сідарэвіч

ЖАРТ

«Да 2005 г. абменны курс беларускага рубля за адзін даляр ЗША не перавысіць 2000—2100 рублёў»

А.Лукашэнка на Другім усебеларускім сходзе, «Советская Белоруссия» ад 22 траўня 2001 г., старонка 2.

КАЛЯНДАР ЛЕВЫМ ВОКАМ

Перадапошняя сакральная карова

У хуткім часе пасьля таго, як у Нью-Ёрку зьявілася новая турыстычная адметнасьць — пункт «Зэра», амэрыканцы заснавалі фонд для стварэньня культурных артэфактаў, прысьвечаных 11 верасьня. Адным зь першых заяўку на «finance asistance» прынёс брытанскі рэжысэр Кені Лоач.

Кені Лоач — вядомы ў кінэматаграфічных колах кадзер. Дастаткова прыгадаць яго стужку «Зямля і Свабода» — «Залатая Галіна» Канаў'98. Звычайна Лоач здымае бязвольных ахвяраў капіталізму — беспрацоўных чыгуначнікаў і тарчкоў. Або, наадварот, мужных барацьбітоў з тым самым капіталізмам — трацкістаў і сандыністаў. Нарэшце ён высьпеў для таго, как зрабіць нешта патрыятычнае пра 11 верасьня.

На атрыманы ад янкі грант Лоач зьняў фільм пра падзеі 11 верасьня 1973 г. у Чылі — пераварот, арганізаваны пры ўдзеле адміністрацыі Ніксана.

Ангельскі кіношнік не афэрыст. Без Сант'яга 73-га не было б Нью-Ёрку 2001-га. У Чылі амэрыканцы пахавалі сацыял-лібэральны праект, які ў пэрспэктыве мог стать мадэллю для залежных краінаў капіталістычнай пэрыфэрыі. Масон Альендэ — кораш Улафа Пальмэ і Франсуа Мітэрана — пра дыктатуру пралетарыяту, новую сэксуальную мараль, забарону буржуазных клясыкаў нават ня марыў. Аб якой «дыктатуры пралетарыяту» можа ісьці мова, калі хаўрусьнікам маеш кампартыю. А тая кіруецца распрацоўкамі брэжнеўскіх ідэолягаў аб «мірным суіснаваньні дзьвюх сыстэмаў».

Чылійскі coup d'Etat даў штуршок антыамэрыканскаму палітычнаму экстрэмізму ў Трэцім Сьвеце. Нэафітам яго ў хуткім часе стаў сэксуальна заклапочаны студэнт лёнданскага інжынэрна-будаўнічага — Усама бэн Ладэн.

Люстэркавым адбіткам тае антыамэрыканскасьці стаў рынкавы экстрэмізм, які акупаваў беларускую думку пачатку 90-х. Нашы дэмакраты чамусьці лічылі Піначэта ідэальным палітыкам усіх часоў і народаў, бо «ён зьнішчыў камуняк і запусьціў рынкавыя рэформы». Але дзякуючы бацьку, які намагаецца спалучыць рынак і дыктатуру, імідж Піначэта канчаткова пажух. Рынак перастаў быць сынонімам «свабоды» і «дэмакратыі».

Левы дыскурс працягвае рэканкісту — адваёўвае беларускую інтэлектуальную прастору, зь якой яго папрасілі ў 90-я. Сёньня ў правых засталася толькі адна «сакральная карова» — жалезная лэдзі Маргарэт Тэтчэр. Налета прагрэсіўны сьвет будзе сьвяткаваць гадавіну шахцёрскага страйку і катаваньня ірляндзкіх рэспубліканцаў. Паглядзім, што напіша Севярынец.

Лёлік Ушкін

КАЛЯНДАР ПРАВЫМ ВОКАМ

Справа бяз права


PHOTO.BYMEDIA.NET

Паўтара стагодзьдзя таму Ігнат Дамейка адкрыў сьвету Чылі. З тае пары Беларусь мае пэўную долю адказнасьці за ўсё, што там адбываецца.

У верасьні 1973 г. Піначэт зьявіўся на палітычнай сцэне як герой: эканамічная катастрофа, справакаваная сацыялістычным урадам, пагражала разваліць краіну. Несумненны і факт «чылійскага цуду» 1976—81 г. з 6% росту ВУП штогод і ператварэньнем Чылі ў перадавую гаспадарку рэгіёну. Але якім коштам?

Пра левых мы не гаворым. Яны давялі краіну да эканамічнага каляпсу й стану грамадзянскае вайны. Ідзецца якраз пра кансэрватараў, войска і Аўгуста Піначэта. Ці мелі правыя права на ўсталяваньне аўтарытарнае дыктатуры? На расстрэлы? Канцлягеры на стадыёнах? Караваны сьмерці?..

Суд вырашыў, што Піначэт ня можа адказваць за злачынствы. Цяпер 70% чылійцаў лічаць час кіраваньня хунты трагедыяй, 20% — дабром для дзяржавы.

Супраць Піначэта сьведчыць сама кансэрватыўная й хрысьціянска-дэмакратычная ідэя. Калі палітычны лідэр пачынае зьнішчаць бяззбройных апанэнтаў, ён губляе маральнае права называцца *правым* і робіцца проста дыктатарам. Правыя бяз права — гэта ня справа. Фашызм Мусаліні, нацызм Гітлера й хунта Піначэта — правалы правага руху, якім няма апраўданьня.

Кажуць, Піначэт быў пабожным. Не ўяўляю. Палітычная інквізыцыя, загады забіваць ды катаваць несумяшчальныя з шчырай верай у Ісуса Хрыста.

Беларусі не патрэбны Піначэт.

Дамейка згадзіўся б са мной.

Павал Севярынец

Саюз Беларусі і Ўкраіны

Газавы ціск з усходу падказвае Менску і Кіеву ідэю стварэньня газатранспартнага ОРЕС

Два мінулыя тыдні Беларусь ваявала з Расеяй. На шчасьце, толькі ў інфармацыйнай прасторы. Сыгналам да пачатку баявых дзеяньняў стала пасланьне Ўладзімера Пуціна. Той прапанаваў Лукашэнку зараз жа падпісаць пагадненьне аб выкарыстаньні расейскага рубля ў якасьці адзінага плацежнага сродку на тэрыторыі Беларусі. Лукашэнка не сьпяшаўся пагадзіцца. У адказ — дэмарш «Газпрому».

У газэтах зьяўляюцца загалоўкі кшталту «Расея дала Лукашэнку тры тыдні», «Расея аб'явіла Беларусі газавую вайну». Друкуюцца лічбы, якія хвалююць абсалютную большасьць грамадзянаў краіны, — колькі будуць каштаваць жыльлёва-камунальныя паслугі пасьля рэзкага падвышэньня цэнаў на газ. Былы прэм'ер **Вячаслаў Кебіч**, вынаходнік інтэграцыйнае схемы датаваньня беларускае эканомікі, прадказвае крах беларускай прамысловасьці і радзіць шукаць паразуменьня з Расеяй. **Міхаіл Марыніч**, эканамічны гуру новае апазыцыі, наадварот, упэўнівае, што надышоў час Беларусі зьлезьці з «наркатычнай іголкі» — яе выратуюць толькі «новая эканамічная палітыка» ды «новае парадкаваньне дзяржавы».

Тым часам 6 верасьня прэм'ер Касьянаў выказаў «разуменьне» рашэньня «Газпрому» аб спыненьні льготных паставак газу ў Беларусь.

Аляксей Мілер, старшыня ААТ «Газпром», у інтэрвію праграме **НТВ** «Асабісты ўнёсак» робіць досыць рэзкія і катэгарычныя заявы: «Мы лічым, што працяг перамоваў немагчымы. У нас прынцыпова рознае бачаньне прынцыпаў працы ў газавым бізнэсе. Адрозьненьні ў падыходах зьяўляюцца непераадольнымі... Мы ставім кропку. Усё! Мы разышліся. У нас розныя бачаньні». Тэлекамэнтатар працягвае: «У суботу беларускі ўрад распачаў шантаж Масквы». Маецца на ўвазе заява **міністра эканомікі Андрэя Кабякова**, які нагадаў расейцам, што транзыт газу ў Эўропу праз Беларусь пакуль абыходзіцца «Газпрому» ў 2,5 разу таньней, як праз Украіну.

Нечакана 13 верасьня прэм'ер Касьянаў адмаўляецца ад свайго ранейшага меркаваньня і прапануе «гаспадарчым суб'ектам» адумацца.

Аляксандар Лукашэнка адказаў на расейскі ціск не на прэсавай канфэрэнцыі, а падчас чарговага «культурнага мерапрыемства». Пасьля ўрачыстае пасадкі дрэва каля будоўлі Нацыянальнай бібліятэкі Лукашэнка пракамэнтаваў і сытуацыю з расейскім газам. Лукашэнка раздражнёны, усхваляваны: наперадзе яго чакаюць цяжкія перамовы з расейскім прэзыдэнтам. Але ён з усіх сілаў хавае ад народу слабасьць сваёй пазыцыі: «Нас усё палохаюць Расеяй. Што «мы цэны на газ падымем» і г.д. І ўсё гэта абыдзецца прыблізна ў 120 млн даляраў. Для нашай краіны 120 мільёнаў даляраў... нават і няма чаго гаварыць пра гэту цану. Але вы павінны разумець, што гэта грошы. І эканоміць давядзецца. Пачынаючы ад вокнаў пры падрыхтоўцы да зімы, каб ня плакалі пасьля на тэлебачаньні з кожнага экрана: «Ах, у нас тут вось холадна». Хочаце, каб было цёпла, зрабіце хоць тое, што ад вас залежыць. Вы павінны разумець, што толькі мы сваёй працай, як бы мы ні плакалі, можам забясьпечыць свой дабрабыт». І дадае: «Беларускі народ ня будзе анучай у чужым боце».

СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

З наступных выпускаў навінаў гэтае выказваньне старанна выражуць. Затое камэнтатары **БТ** патлумачаць сытуацыю больш разгорнута: «Газавы кран ужо стаўся галоўным аргумэнтам расейскай замежнай палітыкі. Летась яго закручвалі дзеля нежаданьня Беларусі ўліцца ў Расею сямю губернямі, сёлета — за прынцыповую пазыцыю нашай краіны не распрадаваць дзяржмаёмасьць «па дзяшоўцы». Абодва разы газавы шантаж саюзьніка пачынаўся самым цынічным чынам — напярэдадні зімы... Беларусі на відавочна непрымальных умовах прапанавалі ўвесьці рубель. Калі Беларусь адхіліла гэтыя прапановы, нам адключылі газ. Хацелі ашчасьлівіць рублём, адкруціўшы галаву. Сваімі дзеяньнямі Расея паказала, што ня хоча саюзу зь Беларусяй».

…Верасень, Сочы, аксамітны сэзон. **Джордж Буш-старэйшы, Пуцін, Лукашэнка**. Першыя два, напэўна, гавораць пра нешта, зьвязанае з купляй «Шэўронам» чвэрці акцый «ЮКАСу». Другія два — пра «Белтрансгаз». **РТР**, яшчэ не перакрытая «Беласпортам», наглядна дэманструе, як беларускія ўлады ўдвая «накручваюць» цэны на газ для беларускіх спажыўцоў. А Расея, нібыта, прапануе газ непасрэдна беларускім спажыўцам — без накрутак! Беларусы вядуць млявую контрпрапаганду. Чым скончыцца сочынскі ваяж Лукашэнкі, яшчэ няясна…

Пра зьмест прэзыдэнцкіх перамоваў, па-за агучанымі на прэсавай канфэрэнцыі зьвесткамі, вядома мала. Відавочна адно — беларускаму прэзыдэнту давялося выкручвацца. Якімі аргумэнтамі апраўдваў ён свае дзеяньні? Можна дапусьціць, што ў ход пайшлі звыклыя абяцаньні «саюзьніцкай вернасьці».

Ня выключана, што Лукашэнку прапанавалі адмовіцца ад падтрымкі антыпуцінскай апазыцыі. Бо на вельмі ж значныя саступкі пайшоў расейскі прэзыдэнт. «Газпром» атрымаў «рэкамэндацыю» аднавіць перамовы. У тых узаемаразьліках чорт нагу зломіць, — махнуў рукою цар Пуцін.

«Газпром» будзе пастаўляць нам газ за тую самую цану, што і Украіне, але й плаціць Беларусі за транзыт. Відавочна, гэтаксама будуць вырашацца фінансавыя пытаньні, зьвязаныя зь дзейнасьцю расейскіх вайсковых аб'ектаў на нашай тэрыторыі, карыстаньнем чыгуначнымі і шасэйнымі камунікацыямі», — так прадказвае будучыню паводле вынікаў сочынскай сустрэчы «Советская Белоруссия». З гэтых настойліва-пагрозьлівых пералікаў вынікае, што лукашэнкаўцы яшчэ гандлююцца. Нешта хочуць атрымаць і нешта аддаць. У адваротных выпадках яны звычайна сядзяць і маўчаць.

Канчатковая ўкраінізацыя Беларусі зноў адкладзеная. Беларускі урад мае час, каб падрыхтавацца да сацыяльных катаклізмаў. Але калі пераход на сусьветныя цэны на газ сапраўды непазьбежны, тады стабільнасьць новае палітычнае і эканамічнае сытуацыі ў Беларусі будзе шмат у чым залежаць ад цеснаты беларуска-ўкраінскага партнэрства, здольнасьці ўрадаў вызначыць узаемапрымальныя цэны на транзыт газу й нафты і інтэнсіфікаваць міждзяржаўнае эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва. Дагэтуль Беларусь была своеасаблівым штрэйкбрэхерам у дачыненьнях з расейскімі кампаніямі. Пляны ж пабудовы расейскага газаправоду па дне Балтыйскага мора, які дазволіць пампаваць паліва ў Эўропу ў абыход Украіны й Беларусі, застаюцца прывіднымі.

Алег Тачоны

Сяргей Чыслаў:
«Пара вызначацца»

Ціск Расеі на Беларусь дасягае рэкордных паказчыкаў. Што будзе, калі Лукашэнка пяройдзе апошнюю мяжу і дапусьціць панаваньне расейскага капіталу ў Беларусі? Якой будзе рэакцыя грамадзтва, войска і сілавых структураў? Карэспандэнт «НН» гутарыць зь Сяргеем Чыславым, афіцэрам запасу, у мінулым — адным зь лідэраў Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў.

«НН»: Як Вы ацэньваеце цяперашнюю сытуацыю?

Сяргей Чыслаў: Аляксандар Лукашэнка трапіў у сваю ж пастку. Усе праблемы — ад ягонай нявызначанасьці. Калі ты сказаў, што будуеш сваю дзяржаву, дык мусіш гэтым займацца. Пара з гэтым вызначацца. Хаця тут ёсьць адна спакуса. Тая ідэалёгія, якую Лукашэнка спрабуе ўводзіць, будзе грунтавацца на ягонай асобе. Гэта сумна і непрыемна. Ідэалёгія павінна будавацца на каштоўнасьцях дзяржавы, нацыі, на патрыятызьме, а не на адданасьці нейкай асобе. У Іраку ідэалёгія была таксама збудаваная на асобе. Але, як толькі цьвік зь сьценкі выцягнулі, усё абрынулася...

«НН»: Ці можа ўзьнікнуць сур'ёзны канфлікт між беларускім і расейскім кіраўніцтвам?

С.Ч.: Сёньня ідзе шантаж з боку Расеі. Нахабны і адкрыты. Таму трэба было адразу, як яны заявілі пра газ, ставіць пытаньне пра транзыт. Расея адчувае сябе ўпэўнена. Праўда, увесь расейскі «эканамічны цуд» грунтуецца на высокіх сусьветных цэнах на нафту. Але амэрыканцы ж не для гэтага бамбілі Ірак. Зараз яны разьбяруцца з нафтай, кошты папаўзуць уніз — і ўсё, цуд скончыцца. Наагул, Расея моцна зьменіцца. Праз два пакаленьні яна перастане быць славянскай краінай, а там недалёка і новая раздробленасьць...

Лукашэнка мусіць сам закончыць свой гістарычны этап, захаваўшы беларускую дзяржаву. Але без канфліктаў не абыдзецца. Дарэчы, якраз на мінулым тыдні ў Менск прыяжджаў астроляг Павал Глоба. Ягоная лекцыя ў Доме афіцэраў была прысьвечаная супрацьстаяньню Марса і таму, што нас чакае ваяўнічая, канфліктная будучыня.

«НН»: Як Вы ставіцеся да меркаваньня, што расейцы ў любы момант могуць прыбраць Лукашэнку сілавым шляхам?

С.Ч.: У Маскве разглядаліся такія варыянты. Але ж наколькі гэта рэальна... І чаго яны даб'юцца? Правядуць выбары і паспрабуюць паставіць свайго чалавека?.. Нядаўна на ўзроўні спэцслужбаў была запушчаная плётка, што можа адбыцца замах на нейкага ўплывовага беларускага чыноўніка і гэта стане падставай для ўвядзеньня надзвычайнага становішча...

«НН»: Калі б здарыўся «гарачы» канфлікт паміж Беларусяй і Расеяй, ці стала б сёньняшняе войска РБ бараніць незалежнасьць?

С.Ч.: Калі канфлікт выйдзе з плоскасьці палітычнай, для Беларусі гэта стане той грамадзянскай вайной, якую мы не закончылі ў 1945-м. Будзе падзел і раскол.

Сяргей Чыслаў (справа) на летніку «Белага легіёну»

«НН»: І ніякага адзінства?

С.Ч.: Не. Усё будзе вырашацца індывідуальна.

«НН»: Беларускае войска існуе ўжо больш за дзесяцігодзьдзе. І што — у ім нічога не зьмянілася? Усё такое ж савецкае?

С.Ч.: Ніводная сілавая структура за гэты час, па сутнасьці, не зьмянілася. А калі і зьмянілася, дык у горшы бок. Бо адсутнасьць разьвіцьця — гэта ўжо рэгрэс. А ў нас цяпер разваляваюць тыя напрацоўкі, якія засталіся з часоў Савецкага Саюзу. Гэта датычыць і КДБ, і МУС.

Беларусы — унікальна ўладапаслухмяная нацыя. Загад ёсьць, начальнікі сказалі — значыць, так трэба. Парадокс, але для таго, каб сёньня будавалася беларуская дзяржава, патрэбны дазвол начальнікаў. Гэта адзінае, чаго нам не хапае. У тым жа войску толькі адзінкі будуць пратэставаць супраць беларусізацыі і напішуць рапарты на звальненьне.

Запісаў Сяргей Ёрш

Грыбная

Я нарадзілася ў вёсцы й жыла там сямнаццаць першых гадоў. Гэтулькі ж гадоў тапчу бліскучымі чаравікамі менскі брук. Як пралетар разумовай працы, нікуды ўлетку не выяжджаю, а замяняю тых шчасьлівых калегаў, што выбылі з рэдакцыяў і офісаў на адпачынак. Таму, выкалупнуўшы тым жа бліскучым чаравікам з-пад гарадзкое бярозкі баравічка, я пусьціла шчодрую сьлязу настальгіі. Адназначна вырашыла: «у грыбы!», узяла псэўданароднага каша з-пад хлеба й падалася на кірмаш.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Кожны трэці гандляр за доўгімі кірмашовымі лавамі спрадае грыбы. На сталах і мэксыканцы ў вялізных самбрэра, і немаўляткі-баравічаняткі. І абабкі, і апенькі, і чорныя грузды, і нават сінія палявыя грыбы, якія вараць пяць гадзінаў і толькі пасьля ядуць… Грыбы прыехалі з-пад Асіповіч, Пінску, Старых Дарог, Стоўбцаў, Верхнядзьвінску… Пяцілітровае вядро каштуе 8—10 тыс., трохлітровае — 5—8, літар — да 6 тыс., кучка зь пяці грыбоў — паўтары тысячы. Хто лянуецца доўга стаяць, той яшчэ таньней прадасьць — па 2—3 тыс. за невялікае вядзерца ці вялікую кучку. За дзень гандлю зарабляюць па 40—60 тыс. рублёў. Мо й больш, але не прызнаюцца.

Іду па шэрагах, набываю патроху грыбкі.

— Бярыце, слаўныя, чыстыя грыбочкі, — кажа маладзіца з-пад Талачына. — Сёлета ў Віцебскай вобласьці іх хоць касой касі… Мужа ў мяне няма, а мы зь дзецьмі ўставалі ў 4 раніцы і ехалі на электрычцы далёка, грыбы зьбіраць. У лесе пад кожным кусьцікам рубель.

— Дзевушка, бярыце чорныя груздэ, — заклікае бабця з-пад Баранавіч. — Мы іх вымочваем два-тры дні, зьліваем ваду два-тры разы на дзень, а потым хто варыць, а хто й сырыя есьць… Я-то зубоў ня маю, дык вару, каб мякчэй было...

Грыбы зьбіраюць цэлымі сем'ямі, потым адпраўляюць ганца-спрадаўца ў Менск. Прыцэньваюся да грыбкоў старога дзеда з-пад Пухавіч. На зэдліку побач зь ім сядзіць пяцігадовы праўнучак. Відаць, што дзіця зьбіралася ў горад: яркая байкавая кашулька, прыгладжаныя віхры, цьмяныя ад сонца й пылу. Твар памыты аж па беражкі шчок, далей пачынаецца шэрая зона.

— І ты зь дзедам грыбы зьбіраў?

— Не, там іх мала, адных мухамораў многа. Я з афтаматам немцаў у лесе шукаў. Мухаморы то былі немцы.

Малая ахвяра мілітарысцкай прапаганды сьвеціць блакітнымі вочкамі на недамытым тварыку. Дзед глядзіць то на праўнука, то на мяне, запрашаючы замілавацца. Я відавочна замілавалася. І стары вагаецца: мо саступіць спагадлівай кабеціне вось гэту кучку за тысячку? Але я — фыррр! — і адлятаю, бо грыбоў накупляла досыць. Я іх ня ем, а сушу. А вязанкі вывешваю ў кухні для калярыту.

Пад рогам Камароўкі стаіць парачка алькаголікаў, абодва з рэдкімі нямытымі валасамі, але дбайна прычасаныя. Ля ног — бруднаваты пакет з шампіньёнамі. Я ведаю, што шампіньёны й пакет падабраныя недзе на Розачцы-Карлачцы ў сквэрыку. Парачка ваўкавата сочыць, ці ня зьявяцца скуль кантралёры, — іхні прадукт яўна ня мае санітарнага сэртыфікату. Без аналізу лябараторыі грыбоў на Камароўцы не спрадасі.

Іван Яшкін:

Грыбы для крамлёўскае кухні нарыхтоўвалі ў Калінкавічах

Ужо трыццаць гадоў мовазнавец Іван Яшкін вывучае грыбныя назвы. І ўсё жыцьцё — грыбныя мясьціны Беларусі. У даведніку, які ён падрыхтаваў разам зь біёлягам Галінай Сяржанінай, — зьвесткі пра 270 відаў грыбоў і ў дзесяць разоў болей іхных народных назваў. Кніжку пісалі заўзятыя грыбнікі: малюнкі грыбоў, мапы распаўсюду назваў грыбоў, мапы грыбовішчаў, рэцэпты страваў з грыбамі…

Іван Яшкін: А як іначай! Грыбы — гэта скарб Беларусі, у нас грыбная краіна.

«НН»: Які грыб беларусам самы дарагі?

І.Я.: Вядома, баравік. На Гомельшчыне ён называецца «добры грыб», «дабрак». На Палесьсі — папросту «грыб» (а ўсе астатнія грыбы — «казьлякі»). На мяжы з Польшчай — «шчыры грыб», «справядлівы грыб», «шчырак».

«НН»: Ці чуецца ў грыбных назвах адгалосак гісторыі народу?

І.Я.: Сустракаюцца вельмі незвычайныя аналёгіі. Напрыклад, назва «беразак» (падбярозавік) сустракаецца толькі ў Закарпацьці ды ў нас, на Берасьцейшчыне.

Нястраўныя грыбы ў розных рэгіёнах завуцца па-рознаму. На паўночным усходзе іх называюць «сабачымі грыбамі», а на поўдні — «жабічымі», «жабскімі». Гэта зьвязана зь якімісь старымі татэмамі…

«НН»: Вы адзін рабілі ўсю мовазнаўчую частку даведніка?

І.Я.: Не, і спн.Сяржаніна шмат гадоў займаецца вывучэньнем грыбоў. Яна распрацавала навуковую тэрміналёгію — на аснове народных і літаратурных назваў. Аналізавала, як называюць тыя ці іншыя грыбы нашыя суседзі: украінцы, палякі, латышы, як яны выпрацоўвалі сваю навуковую тэрміналёгію.

«НН»: Ці доўга складалі кнігу?

І.Я.: Сяржаніна зьбірала матэрыялы пра грыбы трыццаць гадоў, і я столькі ж езьдзіў у экспэдыцыі. Апроч таго, я глядзеў розную літаратуру: дыялектную, лясьніцкую…

«НН»: Грыбных даведнікаў ёсьць безьліч. Чым ваш будзе ад іх розьніцца?

І.Я.: Мы ў сваім зьмясьцілі мапу грыбовішчаў — мясьцінаў, дзе сама лепш зьбіраць грыбы. Напрыклад, каля мястэчка Бобр у сярэдзіне XIX ст. быў кірмаш на Міколу ўвосень, куды зьяжджаліся купцы з Масквы, Смаленску ды іншых гарадоў. Бо ў тым Бабры нарыхтоўвалі пад шэсьцьдзесят пудоў баравікоў! І цяпер там грыбное месца, хаця ляндшафт і зьмяніўся… Альбо такі факт. Для крамлёўскае кухні і перад вайной, і па вайне грыбы нарыхтоўвалі ў Калінкавічах пад Мазыром. Лічылася, што яны там высакаякасныя: баравікі дый іншыя. Баравікі ж ёсьць і ў Сібіры, але нашыя лепшыя!

«НН»: Дык гэта ж такі скарб для грыбнікоў!

І.Я.: Во і я кажу: тут выдаём амаль дзяржаўную таямніцу гэтым выдаўцам, а яны нас выдрукаваць ня могуць! Аддалі былі кніжку ў «Беларускую навуку» — там на яе грошай не знайшлі. Цяпер наш даведнік ляжыць у «Беларусі», дык і гэтым дванаццаці мільёнаў не хапае, каб яго выдаць. А кніга ж магла б стаць падарункавым выданьнем і добра паспрыяць разьвіцьцю турызму. Яна б імгненна разышлася!

«НН»: Ці шмат грыбовішчаў накрыла радыяцыя?

І.Я.: Гомельшчына, Магілёўшчына да Слаўгараду… Трапляюцца радыяцыйныя плямы і ў больш-менш грыбных мясьцінах. Напрыклад, у Налібоцкай пушчы каля Івянца вялікі кавалак тэрыторыі забруджаны.

«НН»: Такая небясьпечная ежа — грыбы, а вы ў кнізе рэцэпты страваў падаяце.

І.Я.: Усе стравы праверанныя, пад кожным рэцэптам пазначана, у якой вёсцы і ад каго ён запісаны… Калі асвойваліся пасьля вайны, дык часта выкарыстоўвалі такую мэтодыку (хоць гэта і грэх). Навараць ці натушаць малазнаёмых грыбоў — і даюць пакаштаваць кату: каты дужа любяць грыбы. Калі кот жыў яшчэ 2—3 сутак, дык і самі сьмела ўжывалі… Частка рэцэптаў, якія я сабраў, была зьмешчаная ў кнізе «Грыбы ў традыцыйнай беларускай кухні», што выйшла ў 1995 г.

Але Галіна Сяржаніна — і сама цудоўны кулінар. Таму яна сумнеўныя зь ейнага гледзішча рэцэпты выкрасьліла. А ад сябе дадала стравы з замежнай кухні: гішпанскай, нямецкай ды інш.

«НН»: А ці маеце нейкія перасьцярогі для грыбнікоў?

І.Я.: Ёсьць грыбы, якімі нельга закусваць гарэлку, — гнаявік шэры ды гнаявік пнёвы. Самі па сабе яны страўныя, хоць і ня першага гатунку, як тыя ж валуі…

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ну і ня варта браць старых грыбоў.

«НН»: І чарвівых.

І.Я.: Тут перабольшваць ня варта. Ёсьць далікатныя людзі, якія выкідаюць грыбы яшчэ не чарвівыя, а толькі ў адным месцы прабітыя мушкай. Гэта ж як зь яблыкам: у нясмачны яблык ні чарвяк, ні муха не палезуць! Таму бывае крыўдна за людзей, якія так марнуюць грыбы.

«НН»: А самі Вы якім грыбам аддаяце перавагу?

І.Я.: Ну, пра баравік і казаць няма чаго. Але калі, напрыклад, з махавікамі наварыць крупніку (ці, як у нас на Слаўгарадчыне кажуць, крупені), дадаць туды сала кавалак — дык гэта ж смаката! Дзеля букету ў крупнік трэба даваць усе грыбы: і лісічкі, і сыраежкі, і махавікі… Чым болей розных — тым лепей.

Гутарыў Адам Воршыч

Р Э Ц Э П Т

Курыца, начыненая баравікамі

З тушкі куры зьняць скуру. Мяса аддзяліць ад касьцей і здрабніць. Баравікі парэзаць, пасмажыць з цыбуляй і перцам. Перамяшаць здробненае курынае мяса з пасмажанымі баравікамі. У гэтую начынку дадаць размочаныя ў малацэ 2—3 кавалачкі хлеба (белага), 2 яйкі, пасаліць і ўсё перамяшаць. Зьнятую суцэльную скуру напоўніць начынкай, прыдаўшы форму курыцы. Ніжні бок нацерці часнокам, верхні намазаць сьмятанай. Ніжнім бокам пакласьці на патэльню, паставіць у горача напаленую печ (духоўку) і выпякаць да залацістага колеру. Падаецца на стол з гарачым гарнірам (бульба, буракі, морква, зялёны гарошак).

(Запісана ў вёсцы Тычынкі на Ўзьдзеншчыне)

Камароўка

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На любы густ і ў любым выглядзе!

Іду шукаць тую лябараторыю. У кіёску з надпісам «Справка» сядзіць бабуля, якая строіць зь сябе старую даму-шыньён: ружовая шмінка, на пальцах пярсьцёнкі з фэанідам. Эўрыка! Вось куды дзяюцца афіцэрскія жонкі пасьля сьмерці мужоў і страты мужовае пэнсіі — сядзяць у даведках і шатнях. І сапраўды, Зоя Кірылаўна, гэты элеганцкі грыбок, — афіцэрская ўдава. Пытаюся, як знайсьці санітарную лябараторыю. Пачуўшы маю мову, Кірылаўна выходзіць з кіёску й пераможна кажа:

— Русский язык наиболее доходчивый, и я тебе, деточка, на нём объясню, как пройти до лаборатории.

Дзякуючы даходлівасьці расейскай мовы я сапраўды лёгка знаходжу лябараторыю. Там сядзяць дзьве цёці ў белых халатах. Пытаюся ў іх пра грыбкі — адпавядаюць санітарным нормам ці не?

— Без заведуюшчай мы ня знаем, добрыя яны ці кепскія… — адказваюць. — А заведуюшчая будзе па абедзе, падажджыце.

Мне карціць пабачыць загадчыцу, якая сядзіць, бы той прэзыдэнт з показкі пра бульбу, і бубніць: добры грыб, кепскі, добры, кепскі... Але час падціскае, і я сыходжу, кінуўшы жанчынкам: «Ну дык я напішу, што ў вас усе грыбы добрыя і што вашая загадчыца добра знаецца на грыбох!» Старэйшая жанчынка ўскідваецца й крычыць:

— Карэспандэнт! Карэспандэнт! Нічога не пішыце! Мы бракуем цэлыя кучы грыбоў! Што вы будзеце пісаць?

Я іду, сумна раздумваючы, што вось ужо й пра грыбы не напішаш толкам у гэтай паліцэйскай дзяржаве, дзе душаць СМІ й трэці сэктар…

Толькі прыйшоў да галавы трэці сэктар, аж бачу — стаіць адзін зь ягоных кіраўнічкоў, прыгожы, асаністы мужчына ў скураным плашчы да зямлі. Ён разьмерана ківае галавой, слухаючы сваю мабілу. У левай руцэ кодавы чамаданчык. Ягоную шпіянаватую элеганцкасьць псуе толькі сетачка з трыма падасінавікамі й крамянымі суравежкамі (дарэчы, чаму прыметнік «крамяны» прыўлашчылі баравікі? Я лічу, што нават сыпучыя суравежкі ў маладосьці бываюць «крамяныя», ня кажучы ўжо пра бабак). Сетачка з грыбамі прычэпленая да ручкі чамаданчыка. І гэты элегант таксама ня ўстояў! Я надзяю капюшон, каб не вітацца, і ныраю паўз элеганта ў кнайпачку, дзе наліваюць. Бяру стоцінку з сокам. Бачу: элегант заходзіць сьледам, бярэ тую ж стоцінку і плюхае ў сябе. Потым, азірнуўшыся і пабачыўшы толькі шкляны позірк прадавачкі і мой унураны капюшон, зладзеявата закусвае шапачкай суравежкі. Усё ж прабілася праз лоск грыбное вясковае маленства! Зьдзейсьніўшы гастранамічнае злачынства, элегант сыходзіць.

Я б ніколі не закусвала гарэлку грыбамі. Гарэлка бывае страшэнна карыснаю й разбуральна шкоднаю, але, умеючы, ёю можна карыстацца. Напрыклад, каб паставіць уваччу залаты фільтар, які не прапусьціць кепскіх уражаньняў і думак. А вось грыбы карысныя не бываюць. Гэта ўмоўна спажыўная ежа, якая большаю часткаю асядае ў пячонках-селязёнках ды нырках. Радыяцыя, цяжкія мэталы… Фу! Грыбамі трэба любавацца, а ня есьці іх.

Гэта такія хохлікі, «аднаногі лясны народзец», дзеці ўсімі каханай залатой восені.

Ева Вежнавец

Грыбы — беларуская рыба фугу

Зьбіраць грыбы — рызыкоўнае мастацтва. Сваёй падступнасьцю яны нагадваюць японскую рыбу фугу, якую трэба лавіць у пэўны час, адмысловым чынам разьбіраць і гатаваць з сэкундамерам. Памыліўся — і капцы, атрымай сьмяротнае атручэньне. Пра тое, як зьбіраць і спажываць грыбы, каб не нашкодзіць здароўю, карэспандэнтка «НН» распытала спадара Юр'я Гузіка, які выконвае абавязкі загадчыка аддзелу гігіены харчаваньня ў Менскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялёгіі і грамадзкага здароўя.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН»: Калі едзеш машынай па вялікай трасе, мінаеш безьліч гандляроў грыбамі. Тавар у іх — любата папросту. Ці можна сьмела купляць такія грыбы?

Ю. Г.: У месцах, не абсталяваных спэцыяльна, на трасах, я бы ня раіў набываць грыбы. Мы ж ня ведаем, дзе гэтыя грыбы зьбіраліся, — можа, у прыдарожнай лесапаласе.

«НН»: І што тады?

Ю.Г.: Такія грыбы назапашваюць сьвінец. Паліва, якое мы заліваем у бакі нашых аўтамабіляў, у вялікіх колькасьцях утрымлівае гэты цяжкі мэтал. Уся расьлінная прадукцыя на прысядзібных участках побач зь вялікімі аўтатрасамі наліваецца сьвінцом. Таму ў выпадковых месцах, у невядомых людзей — не купляйце. Гэта тычыцца ня толькі грыбоў, але і ўсіх харчовых прадуктаў.

Яшчэ «дарожныя» грыбы не праходзяць лябараторнага кантролю. А ў лесе і, адпаведна, ва ўсім, што там расьце, добра назапашваюцца радыенукліды.

«НН»: Ці ўсе грыбы аднолькава добра «глытаюць» радыяцыю?

Ю.Г.: Не. Напрыклад, у белых грыбах радыенукліды назапашваюцца горш, чым у тых самых казьляках. Але ў забруджаных радыяцыяй месцах любыя грыбы будуць аж сьвяціцца ад радыенуклідаў.

«НН»: Як можна зьменшыць рызыку атручэньня грыбамі?

Ю. Г.: Звычайна ў грыбы ходзяць сем'ямі і бяруць з сабой дзяцей. Вельмі ўважліва трэба ставіцца да тых грыбоў, якія сабралі дзеці. Трэба іх пасьля перабраць.

«НН»: І на якіх грыбах можна гэтак фатальна падмануцца?

Ю. Г.: Самыя падступныя — паганкі. Яны бываюць белыя, зялёныя і жоўтыя. Іх часта блытаюць з сыраежкамі і шампіньёнамі. Адрозьніць іх можна так: паганкі маюць клубнепадобнае патаўшчэньне і каўнерык унізе ножкі. Пласьцінкі грыба да старасьці белыя. У сыраежак няма каўнерыка на ножцы, а шампіньёны адрозьніваюцца колерам пласьцінак: ад бледна-ружовага ў маладых грыбоў да бурага ў старых.

Пасьля ўжываньня стравы зь белай паганкі людзі каля дванаццаці гадзінаў адчуваюць сябе добра. Захворваньне пачынаецца раптоўна, часьцей за ўсё ўначы. Больш чым у палове выпадкаў хвароба канчаецца сьмерцю пры поўнай сьвядомасьці і памяці, часьцей за ўсё на другі-трэці дзень. Другое месца па атрутнасьці пасьля белай паганкі займаюць страчкі. Іх часта блытаюць са смаржкамі.

«НН»: А як адрозьніць?

Ю.Г.: Атрутныя страчкі маюць шапку бясформенную, з хвалепадобнай паверхняй. Яе краі толькі часткова зрастаюцца з цыліндрычнай, вельмі кароткай ножкай. І ўвогуле: калі пэўнасьці няма, лепш не чапай. Сёлета хапае добрых белых грыбоў, таму ня трэба квапіцца на «ўмоўна ядомыя». У гэтым годзе ўжо быў адзін выпадак атручэньня кабылкамі. Цяпер ідзе гаворка аб тым, каб прызнаць іх неядомымі. Кабылкі ўтрымліваюць два моцныя таксыны, адзін зь якіх выводзіцца пры тэрмічнай апрацоўцы, а другі — не. Атрута назапашваецца ў арганізьме. Таму выпадкі вострага атручэньня гэтымі грыбамі практычна не фіксуюцца.

«НН»: Вы сказалі «ведаць, як гатаваць». А хіба ня ўсё адно, калі грыб ядомы?

Ю. Г.: Вядома ж, не! Няправільна прыгатаванымі ядомымі грыбамі толькі так можна атруціцца. Грыбы-малочнікі (тыя, у якіх на зрэзе выступае белая вадкасьць, — грузды, ваўнянкі, рыжыкі і г.д.) перад засолкай мусова варыць альбо вымочваць на працягу 2—3 сутак, двойчы на дзень мяняючы ваду. Пласьцінстыя грыбы (усе, у якіх пад сподам шапкі месьцяцца пласьцінкі) неабходна перш адварыць у падсоленай вадзе на працягу 5—7 хвілінаў і прамыць, а толькі пасьля саліць і марынаваць. Пласьцінстыя грыбы нельга сушыць, зь іх нельга рабіць ікру. Ваўнянкі і падгруздкі, нарыхтаваныя на зіму без папярэдняга вымочваньня ці адварваньня, могуць выклікаць гастраэнтэрыт. Бывае, труцяцца салёнымі, марынаванымі і сушанымі грыбамі, у якіх разьвіваецца мікрафлёра, што выклікае токсыкаінфэкцыі.

«НН»: А спажываньне грыбоў «пад гарэлку» зьмяншае рызыку?

Ю. Г.: Гарэлка можа ўратаваць хіба ад батулізму. Але гэтае атручэньне неабавязкова зьвязанае з грыбамі. Яго можа выклікаць любая кансэрваваная прадукцыя, што гатуецца з парушэньнямі тэхналёгіі. Бяз доступу кісларoду — калі робяцца тушонкі, вяндліна, паляндвіца ў вялікім кавалку — можа выпрацоўвацца атрутны таксын. Гэты таксын выклікае сьмерць. Бываюць выпадкі, калі ад спажываньня такой прадукцыі пад гарэлку атручэньне працякае ў лягчэйшай форме.

«НН»: Жахаў вы нарасказвалі — хоць зусім адмаўляйся ад тых грыбоў. А яны ж такія смачныя, такія спажыўныя...

Ю. Г.: Я б не сказаў, што дужа спажыўныя. Бялок, які ўваходзіць у склад грыбоў, даволі цяжкі для расшчапленьня ў арганізьме чалавека. Зрэшты, залежыць ад арганізму. Таму адзін і той самы грыб, нават калі ён няшкодны, на розных людзей узьдзейнічае па-рознаму. Адзін зьеў — і хоць бы што, а камусьці іншаму можа не пайсьці. У нас грыбы спажываюць не дзеля іх дыетычных вартасьцяў. Наш чалавек прызвычаіўся харчавацца з поля ды лесу, і гэтыя звычкі ня так лёгка зьмяніць.

«НН»: А самі ці ясьцё грыбы?

Ю. Г.: Так, я аматар грыбоў. Але ем толькі грыбы, якія сабраў сам. Не купляю іх прынцыпова.

Гутарыла Вераніка Дзядок

Правілы бясьпекі:

Нельга зьбіраць грыбы ў прыдарожнай лесапаласе.

Менш радыяцыі зьбіраюць баравікі і лісічкі.

Смаржкі ядомыя, а страчкі атрутныя.

Кабылкі ўтрымліваюць таксыны, якія назапашваюцца ў нашым арганізьме і ўрэшце правакуюць рак.

Грузды і рыжыкі перад засолкай мусова варыць альбо вымочваць 2—3 сутак, двойчы на дзень мяняючы ваду.

Пласьцінстыя грыбы нельга сушыць, зь іх нельга рабіць ікру.

Белая паганка. Праз сваю распаўсюджанасьць і падабенства на сыраежку — адзін з самых небясьпечных грыбоў Беларусі.

Умоўна ядомая кабылка.

Вясновы дар лясоў — страчок, таксама ўмоўна ядомы.

Дзікая спажыва

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Грыбок, выстаў лабок:
Я цябе пацалую.
З народнага

Калі род людзкі на Зямлі зьвядзецца, яго месца зоймуць грыбы. Менавіта гэтыя арганізмы, што зьявіліся на плянэце куды раней за большасьць ведамых нам, запалоняць цэглу, цэмэнт, асфальт, а нават і плястыкі. Не, яны ня будуць пакрываць усю Зямлю спрэс, але пасадзейнічаюць невераемна хуткаму разбурэньню матэрыі постчалавечага сьвету. Паўсюль, дзе будзе каліва вады й тэмпэратура ў +15—25 °С. Уявіце сабе, што грыб вясёлка, які месцамі ў нас называюць яшчэ весялухаю, расьце па 5 мм за хвіліну! Вось так затрымаешся на хвілінаў колькі каля такога грыба — і будзе пасьля пра што ў горадзе распавесьці.

Ціск у клетках грыбоў можа дасягаць ажно сямі атмасфэраў. Гэта прыкладна як у шынах дзесяцітонных грузавікоў. Дзіва што грыб здольны разьвярэдзіць любы бэтон! А за ім налятуць насёны расьлінаў.

Пытаньне, ці ёсьць расьлінамі самі грыбы, не такое й пустабаўнае. Грыбы ня маюць ані кветак, ані лісьця, ані сьцёблаў. Замест гэтага ўсяго ў іх ёсьць орган памнажэньня — ножка з галоўкаю. Фалічны выгляд некаторых грыбоў (тае самае вясёлкі) можа пасеяць сумнеў у самых спрактыкаваных натуралістаў. А ці бачылі вы такі грыб — юдава вуха? Асацыяцыі таксама навідавоку. Дарэчы, самое слова «фалас» першапачаткова значыла «грыб».

«Цела» ж грыбоў складаецца з гіфу — танюткіх ніцяў. Грыбы ня маюць зялёных клетак з хлярафілам, з дапамогаю якіх усе расьліны засвойваюць вуглякіслы газ. Клеткі грыбоў складаюцца з фунгіну — рэчыва, блізкага да хіціну, зь якога ўтвораныя панцыры ракаў ды скрыдлы рознае жамяры. Праз тое грыбныя клеткі надзвычай цьвярдыя, і разбурыць іх можна толькі шляхам доўгай тэрмічнай апрацоўкі. Уяўляеце, колькі трэба варыць, напрыклад, рака, каб разварыўся ягоны панцыр? На тое ня варта забывацца, калі гатуеце малавядомыя альбо, напрыклад, веснавыя грыбы, кшталту смаржкоў. Бялок грыбоў — глікаген, такі самы, як і ў жывёлаў. Дадайце да таго, што ў грыбах, як і ў іншых прадстаўніках фаўны, зьбіраецца мачавіна, праз што ўсе старыя грыбы стаюцца няўежнымі.

Грыб на грыбу,
А мой навярху.

Грыбы — самы беларускі з усіх беларускіх прадуктаў. Бо тую ж бульбу прывезьлі з Амэрыкі. А грыб — гэта нашае роднае. Яго апявалі нашыя паэты, ад Купалы й Коласа да Мінкіна й Глёбуса. А мастакі пачалі яго маляваць яшчэ раней. У першай палове XIX стагодзьдзя клясычныя натурморты з грыбамі пісаў Іван Хруцкі. Так што нацыянальная «грыбаніяна» ў нас пераваліла за паўтара стагодзьдзя.У Беларусі расьце больш за тысячу відаў грыбоў — дзясятая частка ўсіх вядомых грыбоў сьвету... Гэта прыкладна як ва ўсёй Сібіры ці ў Канадзе. Большасьць зь іх прыдатныя да ежы, хоць у беларуса давер выклікаюць з тузін вядомых відаў. Людзей неспрактыкаваных бянтэжаць дэфініцыі, што сустракаюцца ў даведніках: «умоўна ядомыя грыбы», «малавядомыя ядомыя грыбы», «харчовага значэньня ня мае» і г.д. Беларусы традыцыйна грэбуюць зборам дзікіх шампіньёнаў, парасонікаў ды труфэляў.

Ну хто пасьля гэтага будзе браць якія пячурыцы, падгруздкі ці таўсьцянкі?

Ня ўсе грыбы, што растуць у нас, ёсьць у Расеі. Напрыклад, падгрыб, альбо польскі грыб, грабовік, шатанскі грыб ды дзясяткі іншых на ўсходзе ад Беларусі не сустракаюцца.

З аднаго боку, у Беларусі часам бытуюць дзясяткі розных назваў для аднаго тутэйшага грыба. З другога — абабкамі, асавікамі ці паддубнікамі могуць называцца ў суседніх вёсках розныя грыбы. Таму, перш чым пакласьці невядомы грыбчык у рондаль ці на патэльню, гараджаніну варта зазірнуць у навуковыя даведнікі. Каб чаго не паблытаць. Напрыклад, сапраўдны махавік на лаціне будзе Suillus variegatus, а махавік зялёны, ці заечы баравік па-нашаму, завецца ўжо Xerocomus subtomentosus... Разумееце розьніцу?

І ўжо ж у любым выпадку ня варта экспэрымэнтаваць у хатніх умовах з грыбамі-галюцынагенамі. Можна не вярнуцца...

А грыб-грыбавік,
Што пад дубам баравік,
Над грыбамі палкавік.

Але 5—6 відаў сьмяротна небясьпечных грыбоў з роду Amanitaides на сотні ядомых — дробязная плата за нашыя неабсяжныя прыродныя скарбы. Болей чытайце ды часьцей хадзіце ў грыбы!

Часьцяком даводзіцца чытаць пра г.зв. чатыры катэгорыі грыбоў паводле харчовых якасьцяў. Там пліскі (лісічкі) аднесеныя да 3-й катэгорыі, а грузды — да першай. Бо катэгорыі складалі паводле эканамічнае карысьці ў межах былога СССР, а не паводле сапраўдных гастранамічных якасьцяў. Тое, што ў Беларусі засолкай груздоў (толькі гэтак іх і можна ўжываць) займаюцца адзінкі, — факт. Затое ня знойдзецца беларуса, што ня еў бы з асалодаю падсмажаных з цыбуляю лісіцаў.

Ні ў якія часы нідзе не выклікаў сумневы ба-

Грыбныя дыеты

— Адзін бок зробіць цябе большай,
другі — меншай.
— «Адзін бок *чаго*? І другі бок *чаго*?»
— задумалася Алеся.
— Грыба, натуральна, — сказаў
Вусень...
Люіс Керал. «Алесіны прыгоды ў Дзівоснай краіне»

Вы ніколі не заўважалі, што сапраўдны грыбнік — амаль як сапёр? Дый славуты дэвіз сапёраў, калі трошкі перафразаваць, вельмі пасуе грыбнікам: «Есьці можна ўсе грыбы, але некаторыя — толькі раз у жыцьці».

Аднак будзем лічыць, што ўсе мы — альбо дасьведчаныя грыбнікі, альбо з пэўнасьцю набываем на рынку няшкодныя пячуркі. Таму глянем на грыбы ня з боку іх ядомасьці-неядомасьці, а з боку іх карыснасьці-некарыснасьці. Бо адрозьніваць ядомыя ад неядомых людзі ўмелі яшчэ да таго, як заняліся земляробствам. Сур'ёзнае ж вывучэньне карыснасьці грыбоў пачалося толькі гадоў трыста таму. І ўсё адно іх яшчэ доўга асьцерагаліся. У 1713 г., напрыклад, у Парыжы францускі батанік Ваян называў грыбы д'ябальскім стварэньнем, пакліканым бянтэжыць самых таленавітых дасьледнікаў і выклікаць адчай у маладых батанікаў.

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

І дагэтуль ад розных дактароў можна пачуць, што грыбы — ежа, цяжкая для страўніка. А ўжо паняткі «грыбы» і «дыета» — рэчы проста несумяшчальныя. Што, дарэчы, пацьвярджае Інтэрнэт. Калі кінуць гэтыя два словы ў пошукавік, палова спасылак будзе пра людзей, што згубіліся ў лесе, сядзелі на «грыбной дыеце», а пасьля пакутавалі на страўнік.

Што ўвайшло — тое і выйшла

Але нездарма ж грыбы выкарыстоўваюцца ў «нетрадыцыйнай» усходняй мэдыцыне. Дый у Старым Сьвеце ніводзін адвар чараўнікоў — мясцовых прадстаўнікоў нетрадыцыйнай мэдыцыны — не абыходзіцца без грыбоў.

А навукоўцы XX ст. адшукалі ў грыбах бялкі, мінэральныя рэчывы і вітаміны ў незьлічонай колькасьці. У кілі сушаных баравікоў бялкоў у два разы больш, чым у ялавічыне, і ў тры разы больш, чым у рыбе. Грыбны булён у сем разоў калярыйнейшы ад мяснога. Але арганізм чалавека засвойвае грыбныя бялкі горш за жывёльныя. Клеткі грыбоў абараняе шчыльная клеткавая сьценка, зь якой зь цяжкасьцю змагаюцца страўнікавыя фэрмэнты. Таму грыбы і выкарыстоўваюць у дыетах «для пахудзеньня». Страўнік набіваецца смачнаю ежай, але амаль нічога не засвойвае: што ўвайшло — тое й выйшла. Калі хочаце насамрэч наесьціся грыбамі, добра адварыце іх, нарэзаўшы як мага драбней, а лепш прапусьціўшы праз мясакрутку. І ў такім стане грыбы добра кампэнсуюць адсутнасьць мяса на вашым стале, калі вы посьціце ці трымаецеся вэгетарыянства.

У грыбах (асабліва ў белых, пячурках і вешанцы) нямнога тлушчаў (ліпідаў). Дый тыя ня ўтрымліваюць халестэрыну, а зьмяшчаюць рэчывы, што нармалізуюць узровень ліпідаў у крыві, зьніжаюць ціск і рызыку сардэчна-судзінавых хваробаў.

У маладых грыбах больш вітамінаў групы В і РР, чым ва ўсіх іншых прадуктах, за выключэньнем хіба дрожджаў. Вітаміны ж групы РР паляпшаюць вугляводны абмен, станоўча дзейнічаюць пры лёгкіх формах дыябэту, захворваньнях печані, сэрца, язьве. А вітаміну B_2 у маладых баравіках у 10—12 разоў болей, чым у хлебе, бульбе, малацэ. Яшчэ ў грыбах багата рэдкага вітаміну D_2. Ён засьцерагае ад зьменаў у шкілетных цягліцах, цягліцы сэрца, ад ломкасьці капіляраў. А кілё вешанак забясьпечвае дзённую патрэбу ў аскарбінавай кісьліне. Але памятайце: у старых грыбах колькасьць вітамінаў падае ў два разы.

Грыб і камяні выводзіць

У народнай мэдыцыне грыбы выкарыстоўваюць даўно. Баравік, напрыклад, — падчас стэнакардыі і сухотаў. Кажуць, ён нават засьцерагае ад раку. Гісторыя навуковага вывучэньня грыбоў як патэнцыйных лекаў пачалася ў 1990-я. Ангельскія навукоўцы высьветлілі, што грыбы — тэрапэўтычны сродак пры самых розных хваробах. «Грыбная дыета», якая складаецца зь пячурак, дапамагае падчас жоўцекамянёвай хваробы. Мала тлушчаў і шмат клятчаткі — ідэальныя ўмовы для вывядзеньня камянёў.

Грыбы, дзякуючы рэчывам з супрацьзапальным узьдзеяньнем (трытурпіноіды), аблягчаюць хаду такіх захворваньняў, як артрыт, грып, ВРЗ. Грыбы могуць стымуляваць імунітэт і выкарыстоўвацца падчас лячэньня гепатыту В і С. «Грыбную дыету» прапісваюць пацыентам, што перанесьлі трансплянтацыю, каб зьнізіць рызыку адчужэньня тканак, і хворым на рак — для нэўтралізацыі эфэкту зьнясіленьня арганізму пасьля хіміятэрапіі. Каб адкрыць новую старонку ў фармакалёгіі, пакуль малавата вынікаў, але дасьледнікі поўныя аптымізму.

І апошняе. Калі хто паквапіўся на гэты артыкул, каб дазнацца, як пахудзець з дапамогай грыбоў, чытайце ўважліва. Трэба раненька ўстаць, выправіцца ў лес і не выходзіць адтуль, пакуль кошык ня будзе поўны. Тут вам і «дацягваньне рукамі да зямлі», і «павольныя прысяданьні», і «паступовае павелічэньне паднятага цяжару», і сьвежае паветра, і нават «водныя працэдуры» (як не пашчасьціць з надвор'ем). Як мае быць, два-тры кіляграмы скінеце.

Б.Паганка

равік — Boletus edulis, Белагрыб. Яго можна было б паставіць у адзін шэраг з гэткімі нашымі нацыянальнымі знакамі, як бульба і сала. Застаецца дзівіцца, але на Альпах, на Балканах ды на Каўказе іх традыцыйна не ядуць (месцамі там не ядуць грыбоў наагул).

Баравік сьвежы можа сягаць вагою ажно за 5 кг! Хоць белыя грыбы, большыя за 300 грамаў, зазвычай непрыдатныя для спажываньня. На жаль.

Дзе шукаць баравікі? Белыя грыбы растуць у самых прыгожых месцах. Паўзірайцеся каля мухамораў. Дзе тырчаць іхныя чырвоныя капялюхі — там недзе побач будуць і баравікі. У тых, што вырастаюць у яловым лесе, шапка будзе чырванавата-бураватая, а ў тых, што ў бары, — шаравата-бураватая, дый ножка будзе таўсьцейшаю. Дарэчы, спажыўныя якасьці шапак і ножак аднолькавыя толькі ў маладзенькіх баравічкоў. Зь цягам часу ножкі трухлеюць. А вось у шапачках застаецца ў два разы болей бялкоў, тлушчаў, цукру й мінэральных рэчываў. Таму сушыце ды гатуйце ножкі асобна. Сушаныя баравікі маюць самы моцны водар сярод усяго астатняга грыбнога царства. Можна, вядома, замяніць грыбы мясам ды хлебам. Але водар грыбны замяніць няма чым.

Дарэчы, апроч смажаных, вараных, сушаных ды тушаных, баравікі можна есьці й сырымі. Каліва солі — і вы адчуеце гэты дзіўны, саладкаваты смак, што ня зблытаеш ня з чым. І зноў задасі сабе пытаньне: што ж такое грыбы? Дзікарослая харчовая прадукцыя?

А можна перавярнуць пытаньне наадварот: грыбы могуць нам замяніць мяса й хлеб. Ды яшчэ дзясяткі іншых прадуктаў.

Дзіва — пры такім невераемным багацьці сьвету грыбоў у Беларусі няма свайго грыбнога брэнду, як, напрыклад, з бульбаю ці торфам. Цяжка сказаць, на якім этапе разьвіцьця знаходзіцца айчынная мікалёгія (навука пра грыбы). Але, мяркуючы з татальнай непісьменнасьці беларусаў у грыбных справах, можна канстатаваць, што мікалёгія ня выйшла за межы кабінэтаў. Грыбаводзтва ў нас наагул у зародкавым стане, тым часам як у Эўропе даўным-даўно культывуюць вешанкі, шампіньёны ды труфэлі, што прыносіць вялізарныя даходы. А ў крамах Менску сваіх айчынных грыбоў не купіць. Ні залацістых рыжыкаў, ні духмяных махавікоў. А ўжо ж ці каштаваў хто беларускіх труфэляў, якіх з асалодаю жаруць нашыя дзікі?

Сяргей Харэўскі

Галоўны беларускі Грыб

аддае перавагу груздам з цыбулькай у сьмятане

PHOTO.BYMEDIA.NET

Кіраўнік беларускай дзяржавы напярэдадні прыходу Лукашэнкі да ўлады, дзяяч сацыял-дэмакратыі, генэрал-лейтэнант міліцыі ў адстаўцы. Гэта ўсё пра Мечыслава Грыба, чалавека, чый подпіс стаіць пад Канстытуцыяй 1994 г. Мы адшукалі спадара Мечыслава на Нарачы, дзе ён адпачывае ў санаторыі. 28 верасьня сп.Грыбу споўніцца 65 гадоў.

«НН»: Адкуль у Вас такое прозьвішча?

Мечыслаў Грыб: На Дзятлаўшчыне шмат Грыбоў, але жывуць яны ў асноўным каля Наваельні. Там іх цэлыя вёскі. Але мы зь імі ня маем сваяцкіх сувязяў. Бацька мой паходзіць з-пад Казлоўшчыны. А ў вёску Савічы ён прыйшоў у прымы. Бацька загінуў на фронце ў 1945-м, і маці нас, чацьвярых дзяцей, адна выгадавала. І ўсе мы вышэйшую адукацыю атрымалі. Даводзілася шмат працаваць, дамагацца ўсяго ў жыцьці сваімі сіламі... Мой малодшы брат Станіслаў — навуковец, акадэмік. Мы зь ім у даведніках ідзём адзін за адным…

«НН»: Можа, прыгадаеце нейкія кур'ёзныя выпадкі, зьвязаныя з прозьвішчам?

М.Г.: Калісьці я балятаваўся на Дзятлаўшчыне ў дэпутаты Вярхоўнага Савету. І што цікава, маім супернікам быў старшыня пасялковага савету з Наваельні па прозьвішчу Грыб. Але ён зьняў сваю кандыдатуру. Я да гэтага ніякага дачыненьня ня меў. Відаць, зь ім мясцовыя людзі папрацавалі. Пабаяліся блытаніны — двух Грыбоў у адным бюлетэні...

Усялякае было ў жыцьці. Але я ніколі ня ставіў пытаньня пра зьмену прозьвішча. Можна ж было стацца, на расейскі капыл, «Грыбавым». Але я не лічыў гэта патрэбным, як і ня ўзяў больш прыгожага прозьвішча маці — Сокал. Паразважаў і застаўся Грыбам.

«НН»: А беларускаму эсэру Тамашу Грыбу Вы не сваяк?

М.Г.: Не, ён з Астравеччыны родам.

«НН»: Ці ёсьць грыбы ў нарачанскіх лясах?

М.Г.: Тут, на Нарачы, столькі грыбоў! Цягаюць іх людзі мяхамі! Сёньня і я з жонкай пахадзіў па лесе гадзіны тры: і сьвежым паветрам падыхалі, і грыбоў пазьбіралі. Наагул, у санаторыі ўсё пахне грыбамі: хто іх сушыць, хто смажыць…

«НН»: Якія грыбныя стравы Вы любіце?

М.Г.: Падабаюцца грузды белыя і чорныя. Калі іх добра прыгатаваць — вымачыць, пасаліць, а потым з цыбулькай і сьмятанай — смаката выйдзе!

Гутарыў Сяргей Ёрш

Бульба & К°

— На бульбу даецца адгул, як і на пахаваньне родных, — паведаміў мне мой начальнік, калі я ўладкоўваўся на дзяржаўнае прадпрыемства ў Баранавічах. — Ніякіх заяваў за свой кошт пісаць ня трэба!

Нават прадпрымальнікі даюць дадатковыя адгулы сваім супрацоўнікам, каб тыя маглі выкапаць «другі хлеб». Паддатыя трактарысты з капалкамі швэндаюцца па калгасных палях, з надзеяй паглядаючы на людзкія дзялкі. Шараговыя калгасьнікі й «дачнікі» панукаюць коніка за плугам ці наагул шчыруюць з капачамі і драбцямі. Капаньне і пасадка бульбы ператварыліся ў рытуал, куды, як і на пахаваньне, зьбіраюцца найбліжэйшыя сваякі. Пасьля зьяўляецца нагода адсьвяткаваць дакопкі — добрая ж кампанія ўжо ёсьць. Пасядзець, пагутарыць, выпіць, забыцца пра будзённшчыну. Бульба і кампанія — вось чым жывуць людзі ў гэтыя восеньскія дзянькі. Адзін знаёмы нават прапаноўваў паставіць у Беларусі помнік бульбе — сымбалю надзеі й клопатаў кожнага чалавека, ратаўнічцы нацыі. Вялізны камень, падобны да бульбы, усталяваць на пастамэнце. Да тае «бульбіны» можна прычапіць мэталёвага калярадзкага жука — як сымбаль варожых падкопаў пад Беларушчыну.

Бульба сёлета ўрадзіла, але цэны на яе ў Баранавічах пакуль трымаюцца — 200 руб. за кілё. Хаця тыя, хто цягам году не займаўся пошукам гною, агорваньнем і крапленьнем жука, пакуль не сьпяшаюцца набываць яе ў зімовы запас. Спадзяюцца, што цана на бульбу ўпадзе хоць напалову. Вычэкваюць і тыя, у каго другі хлеб не ўрадзіў.

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

У мінулую нядзелю на плошчы Леніна, ля прыступак гарвыканкаму, распачаўся восеньскі кірмаш. Гандаль будзе трываць мо зь месяц — у залежнасьці ад надвор'я. На кірмашы сёлета мала яблыкаў. Перамерз увесну ўвесь цьвет, таму рэдкі шчасьлівец можа парадавацца якой антонаўцы. На варэньні ды кампоты давядзецца закупляць польскія яблыкі. Не пашчасьціць і выпівохам: «чарніла» з хіміяй цяпер будзе яшчэ больш... Тыя, у каго яблыкі сёлета ўрадзілі, прадаюць іх дорага — па 2000 руб. за кілё.

Грыбамі ў Баранавічах гандлююць ня толькі на кірмашы. З канца жніўня каля харчовых крамаў іх прадавалі дзеці. Цяпер стаяць старыя людзі: унукі ў школе. У пакуначках і на газэтах ляжаць збольшага чырвонагаловікі й белыя. Аднак людзі баяцца купляць, асабліва пасьля таго, як у горадзе грыбамі атруцілася малая дзяўчынка. Акрамя грыбоў, «зь зямлі» прадаюць кукурузу, што таксама добра ўрадзіла сёлета. Яна карыстаецца попытам, хоць і папярэджвае санстанцыя ў газэтах, каб не куплялі варанай кукурузы і грыбоў з рук. Але плынь «кантрабанды» не драбнее. Ажно старшыні калгасаў скардзяцца на жыхароў Баранавіч, што зьдзяйсьняюць набегі на прыгарадныя кукурузныя палі. Да ўсяго, кукуруза там расьце кармавая...

Гэтак паўтараецца штовосень: размовы, што ўрадзіла, а што не; хто дзе знайшоў каня; хто якую сабраў талаку капаць бульбу; колькі мяхоў саджалі, а колькі выкапалі; куды падзець лішкі. У гэткіх клопатах і праходзіць жыцьцё большасьці беларусаў, якое толькі зрэдку разнастаяць палітычныя кампаніі. Бульба & К° пакуль бліжэйшая, цікавейшая і больш зразумелая.

Руслан Равяка, Баранавічы

Бульба для Масквы

Бульба ўрадзіла. Пакуль выкопваюць лепшую, ураджайнасьць сягае нерэальных для беларускіх калгасаў лічбаў — пад 170 цэнтнэраў з гектару! Прагнозная сярэдняя ўраджайнасьць мусіць скласьці каля 130 ц/га пры валавым зборы калгасаў і саўгасаў каля мільёна тонаў. Азіраючыся на статыстыку мінулых гадоў, можна сьцьвердзіць, што вынікі гэтыя не аж такія добрыя. У 2000 г. сельгаспрадпрыемствы выкапалі 1200 тыс. тон, а ўраджайнасьць склала 132 ц/га. Рэкордны ж 1996-ы прынёс калгасам 1700 тыс. тон пры ўраджайнасьці 152 ц/га! Агулам у 1996 г. было сабрана больш за 10 млн т бульбы, у 2000-м — 8700 тыс. т. Сёлета валавы збор добра калі дасягне 8 млн т.

З вуснаў кіраўніка дзяржавы прагучала чарговая заява ў стылі «Drang nach Osten». Будзем экспартаваць бульбу ў Маскву і расейскія рэгіёны. А тут яшчэ і ў Эўропе няўрод: бэльгійцам няма з чаго фрыткі рабіць — можа, і яны ў нас набываць будуць? Каму вось толькі даць адпаведнае заданьне? Калгасы ўжо даўно не прадукуюць значных аб'ёмаў: гэта ў 90-м яны давалі палову ад агульных аб'ёмаў вытворчасьці. А пачынаючы з 1993-га — усё менш і менш. Цяпер даюць толькі 10—15%. Усё іншае — людзкія соткі. Фактычна ў Беларусі не існуе буйнатаварнай вытворчасьці бульбы. Колькі б людзі ні вырошчвалі самі, экспартны патэнцыял ад гэтага не палепшыцца. Іншая рэч, што на экспарт наша звычайная бульба ня пойдзе: яна павінна быць памытай, мець доўгі тэрмін захоўваньня. Звычайна такая бульба вадзяністая і бяз смаку, але мае «таварны выгляд». Беларусы такую наўрад ці сталі б есьці. Але на сусьветным рынку трэба падпарадкоўвацца ягоным законам, інакш нічога нікому не прадасі. Бульба для вырабу замарожаных фрытак (такіх, як у «Макдональдзе») ці чыпсаў таксама трэба стандартная, таму Беларусь пакуль што сама гэтыя вырабы імпартуе. Адзінае выйсьце, якое бачыцца, — арганізацыя буйнатаварнай экспартаарыентаванай вытворчасьці бульбы ў спэцыяльных гаспадарках — лепш за ўсё фэрмэрскіх. Тады б можна было казаць аб прарыве на сусьветныя рынкі з сваёй бульбай.

Дамінік Міхайловіч

Грыбныя месцы Менску

Страўня «Камяніца».
Адміністратарка: У нас падаюць дранікі з грыбамі, аладкі зь сьвінінай і грыбамі, грыбны суп, суп-пюрэ з шампіньёнаў з грэнкамі, хатнія кілбаскі з бульбаю й грыбамі. Простыя й шляхетныя беларускія стравы коштам ад 2 да 10 тыс. руб.

Кавярня «Бульбяная». Кухарка Марыя: У мэню «Бульбяной» — грыбная крупеня, пражаніна ў гаршэчку, грыбы-какот. Пражаніна — гэта бульба, пражанае мяса з смажанымі грыбамі пад белай поліўкай. На дно кладзецца чарнасьліў і грыбы, зьверху — астатнія інгрэдыенты, падліва, — і запякаецца. Язык пракаўтняце.

«Ракаўскі бровар». Кухар: У нас усё смачнае. І што вам выбраць з грыбамі? Лісічкі зь сьмятанаю смажаныя — ці не занадта проста для вас? Але затое душэўна, рэкамэндую. Баклажаны зь лісічкамі — вельмі нічога, асабліва для аматараў баклажанаў. Смажаначка зь мяса й шампіньёнаў — усё даводзіцца да кандыцыі й падаецца з дранікамі — оооо, смак! І грыбы ў какоце — сухія баравікі адварваем, абсмажваем як сьлед усё з цыбулькай і запякаем пад сырам у какотнічках па 75 грамаў. Два какотнічкі зьядаеш — сыты й шчасьлівы. Кошты страваў — ад 9 да 15 тысячаў.

Сьвятлана Курс

19 верасьня пятніца

БТ
7.00, 9.0. 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
7.10 «Не ў капелюшы шчасьце». Мультфільм.
7.30, 15.35 «Дом пасярод навальніцы». Мэлядрама.
9.10, 17.10 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.50 «Прытулак муз». Відэафільм.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 18.10 Камэдыя «Саламяны капялюшык». 2-я сэрыя.
13.20 Трылер «Бяжы, Лола, бяжы!».
14.40 «Масква — Менск».
15.15 «Песенька радасьці». Мультфільм.
19.10 Баявік «Прынц Вэліент».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Школа зласлоўя.
23.15 Трылер «Прыстанак».

СТВ
6.20, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.45 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.10 «Лясныя хованкі». Дак. фільм.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10. 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: мэлядрама «Канец раману». ЗША, 1999.
10.10, 20.35 «Аўтапанарама».
10.25 «Тэатральныя гісторыі».
10.40 «Вялікі выбух». Дак. фільм. 2-я частка.
11.30 «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне». Тележанвэла.
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.50, 18.40 «Круты Ўокер».
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: маст. фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі», 5-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Марыхуана».
23.05 «Навіны СНД».
23.25 Кіно: драма «Мэры Рэйлі».

АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.00 «Горад жанчын». Тэлевізійнае шоў.
15.45, 22.05 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Новы дзень». «Дэвід Копэрфілд. Выкрытая ілюзія».
18.35 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.40 Камэдыя «Мужчына па выкліку».

РТР
7.45 Сэрыял «Каменская-2. Мужчынскія гульні». 4-я сэрыя.
8.50 Пакой сьмеху.
9.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Бабы, наперад!».

НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.05 Фактар страху.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 Нацыянальная бясьпека: гібель эскадры.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Інфэрна».
21.50 Супэрбокс: Анхель Манфрыдзі супраць Уілсана Радрыгеса.

Культура
15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.50 Ж.Б.Мальер. «Тарцюф». Тэлевэрсія спэктаклю.
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу». Аляксандар Салжаніцын.
17.55 Басы XXI стагодзьдзя.
18.35 «Бязь сьведкаў». Маст. фільм.
20.05 Блеф-клюб.
20.45 «Нататкі дыплямата». Дак. сэрыял. «Ізноў у Італіі».
21.15 «Лінія жыцьця».
22.05 «Алімпія. Шок аголенай натуры». Дак. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

Эўраспорт
9.30 Конны спорт. Кубак нацый. Паўтор.
10.30 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Мужчыны. Гішпанія. Паўтор.
11.30 Сьпідвэй. Кубак сьвету. Фінал. Данія. Паўтор.
12.30 Лёгкая атлетыка. Найлепшае 2003 году. Тэлечасопіс. Паўтор.
14.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 12-ы этап. Паўтор.
15.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. Гонка з разьдзельнага старту. Жывая трансьляцыя.
18.15 Тэніс. WTA. Шанхай.
19.15 Мота гран-пры. Рыё-дэ-Жанэйра. Жывая трансьляцыя.
22.15 «Самы моцны чалавек». Тэлечасопіс.
0.30 Ралі рэйд.
1.00 «Формула». Аўтачасопіс.
1.15 «Фэрары». Аўтачасопіс.
1.45 «Спартыўныя аўтамабілі». Аўтачасопіс.
2.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

20 верасьня субота

БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Трышчан ды Іжота». Мультсэрыял.
7.40 «Не зявай!».
8.05 Існасьць. Духоўная праграма.
8.40 «Усё нармальна, мама!».
9.20 Экран індыйскага кіно. Мэлядрама «Крымінальны раман».
11.30 Тэлевізійны Дом кіно.
12.15 «Турнір». Тэлегульня.
12.55 Сэрыял «Неўтаймоўны Дзідзі».
13.20 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
15.15 «Спартыўная дзяржава».
15.35 Мультфільм «Сьмелы Робін Гуд».
15.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Аркатрон» (Беларусь) — «Альпля» (Аўстрыя). Жывая трансьляцыя зь Менску.
17.30 «Маскі-шоў».
18.15 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
18.40 Прэмія «Оскар». Маст. фільм «Тэрмінатар-2. Судны дзень» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Мэлядрама «Складанасьці каханьня» (ЗША).

СТВ
7.30 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.45 Маст. фільм «Госьця з будучыні». 3-я сэрыя.
9.55, 19.55 «СТВ-спорт».
10.05 «Рэактыўны бокс».
10.20 Дак. фільм «Пад покрывам».
10.40 «Анфас».
10.55 «Разам».
11.25 «Партрэт у інтэр'еры».
11.40, 20.10 Кіно: камэдыя «Труфальдына з Бэргаму». 1-я сэрыя.
12.50 Кіно: камэдыя «Глядзі ва ўсе вочы!».
14.30 «Дружная сямейка».
15.40 «Клясыка гумару».
16.10 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
17.15 «Кветкі жыцьця». Мультфільм.
17.50 Кіно: камэдыя «Вялікія вакацыі».
19.30 «24 гадзіны».
21.30 Кіно: маст. фільм «Вяртаньне ў Блакітную лягуну».
23.15 «Навіны СНД».
23.35 «Арт-хаўз»: драма «Астэнічны сындром».

АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому». Міхаіл Таніч. Таганрог.
11.10 «Падарожжа натураліста».
11.40, 14.30 «Ералаш».
12.10 «Гісторыя з геаграфіяй». «Астэроід. Сьмяротны ўдар».
13.00 Прэм'ера. «Падарожнік».
13.20 «Каб памяталі...».
14.05 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.40 Маст. фільм «Канец апэрацыі «Рэзыдэнт».
17.00 «Ідалы».
17.30 «Жарт за жартам».
18.20 Канцэрт «Нашы ступені».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 Прэм'ера. «Розыгрыш».
23.20 «Залаты грамафон».
0.20 Трылер «Хакеры».

РТР
9.05 «Не сумуй!».
10.00 Сам сабе рэжысэр.
11.00 «Круты маршрут».
12.00 У пошуках прыгод.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Дзяўчына бяз адрасу».
15.00 Камэдыя «Непапраўны».
17.00 Пакой сьмеху.
18.05 «Другая палова». Супэр-шоў.
19.25 «Клюб «Тэатар+ТБ».
21.20 Міжнароднае спартовае шоў «Маскоўскі выклік».

НТВ
9.00 «Кулінарны паядынак».
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.15 «Дзікі сьвет».
12.00 Маст. фільм «Акцыя».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: клятва Гіпакрата». Частка1-я.
17.05 Найноўшая гісторыя: вайна ў шклянцы.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Камэдыя «Стрыптыз».
21.25 Маст. фільм «Час забіваць».
0.20 Начныя музы.

Культура
10.10 «Штрафны ўдар». Маст. фільм.
11.45 ГЭГ.
12.00 Дзіцячы сэанс. «Залатое кураня». Маст. фільм.
13.10 «Страшная гісторыя». Мультфільм.
13.20 «Навука: стратэгія прарыву». Дак. сэрыял. 1-я сэрыя.
13.50 «Партытуры не гараць». Ёган Штраўс.
14.15 Зорныя гады «Ленфільму».
14.55 «Вяртаньне Максіма». Маст. фільм.
16.35 «Музыка Бразыліі. Іншая самба». Дак. фільм.
17.35 «У вашым доме».
18.15 «Сфэры».
19.00 «Шафёр міжволі».
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.25 А.Стрындбэрг. «Скокі сьмерці». Фільм-спэктакль (Швэцыя).

Эўраспорт
9.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс. Паўтор.
10.30 Тэніс. WTA. Шанхай.
11.30 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Мужчыны. Гішпанія. Паўтор.
12.30 LG. Супэргоначны ўік-энд. Формула Рэно. Ашэр. Жывая трансьляцыя.
13.30 Пляжны валейбол. Турцыя. Спэцыяльны агляд.
14.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Нямеччына—Славакія. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Мота гран-пры. Рыё-дэ-Жанэйра. Жывая трансьляцыя.
21.00 Баявыя віды спорту. ТВА.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45, 1.45 Сумо. Басё. Паўтор.

21 верасьня нядзеля

БТ
7.35 «Дастань зорку!». Інфармацыйна-музычная праграма.
8.00 «Сузор'е надзей». Гала-канцэрт ляўрэатаў Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу юных талентаў. Частка 1-я.
8.25 «Добрай раніцы, Беларусь!»
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Раства Божай Маці.
9.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
9.45 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
9.50 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
10.45 Падарожжа дылетанта. «Ружаны. Золата Сапегаў».
11.10, 12.05 Маст. фільм «Каляс назаўсёды». Кінавэрсія рэжысэра Ф.Дзэфірэлі.
13.00 «Ваша лято».
13.40 Маст. фільм «Зорка Вэнэра».
15.05 Вэстэрн «Макасыны Маніту».
16.25, 18.20 «Між іншым...».
16.45 Маст. фільм «Скрыжаваньні».
18.30 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.10 Камэдыя «Поўны прывод».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
21.55 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.
23.40 Трылер «Сувязь».

СТВ
7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 Маст. фільм «Госьця з будучыні». 4-я сэрыя.
9.45 «СТВ-спорт».
10.00, 20.00 «Аўтапанарама».
10.20 Дак. фільм «Полацкая пэрліна».
10.40 «Менск і менчукі».
10.45 «Сьвецкая хроніка».
10.55 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.10 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.20 «Філярманічны тыдзень».
11.25 «Плянэта людзей».
11.40, 21.00 Кіно: камэдыя «Труфальдына з Бэргаму». 2-я сэрыя.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: вэстэрн «Чалавек з бульвару Капуцынаў».
15.10 «Дружная сямейка».
16.15 «Найлепшыя шоў сьвету».
17.15 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
18.10 «168 гадзін».
19.00 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
19.30 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.20 «Асабісты інтэрас».
22.20 Кіно: трылер «Кантракт зь незнаёмцам».
23.50 «Навіны СНД».

АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Служу Айчыне!
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.10 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 «Дачнікі».
12.10 Дог-шоў.
12.55 Сьмехапанарама.
13.25 «Клюб падарожнікаў».
14.05 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.30 Ток-шоў «Выбар».
15.15 «КВК-2003».
17.25 «Ералаш».
17.55 Жывая прырода. «Монстры».
18.50 Камэдыя «Джэнтэльмэны ўдачы».
20.30 Контуры.
21.15 Баявік «Чужы-4: Уваскрэшаньне».
23.10 Мастацкі фільм «Сьвяшчэнны дым».

РТР
9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Сьвяточны канцэрт.
15.10 Гульня «Форт Баярд».
16.50 Маст. фільм «Мядзьведжы пацалунак».
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Маст. фільм «Людзі ў чорным» (ЗША).
22.30 Маст. фільм «Зямля тыгра» (ЗША).

НТВ
9.05 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.15 «Апэльсынавы сок».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
11.15 Усё адразу!
12.00 Камэдыя «Фантамас супраць Скотланд-Ярду».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Іх норавы».
16.10 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: клятва Гіпакрата». Частка 2-я.
17.10 «Злачынства ў стылі «мадэрн». «Сьмерць у Вэнэцыі».
17.45 Маст. фільм «Сомэрсьбі».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.

Культура
11.30 Рыцары сьмеху.
12.00 «Вук». Мультфільм.
13.20 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.50 Ізноў кружэлка сьпявае.
14.15 «Астравы».
14.55 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». Дж.Вэрдзі. Опэра «Атэла».
17.40 «Медзьвяжудасьць». Мультфільм.
17.55 Сьмеханастальгія.
18.25 «Нашчадак белага барса». Маст. фільм.
20.45 «Больш чым каханьне».
21.30 «Культ кіно». «Ледзяныя птушкі». Маст. фільм.
23.25 Джазафрэнія.

Эўраспорт
10.00, 12.15, 13.45, 16.15 Супэргоначны ўік-энд. Ашэр. Жывая трансьляцыя.
11.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Югаславія—Расея. Турцыя.
12.45 Тэніс. WTA. Шанхай.
14.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Украіна—Польшча. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Супэргоначны ўік-энд. Ашэр.
17.15 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 15-ы этап. Жывая трансьляцыя.
18.30 Пляжны валейбол. Турцыя. Спэцыяльны агляд.
19.00 Пляжны валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Нідэрлянды—Італія. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00, 1.15 Супэргоначны ўік-энд. Спэцыяльны агляд. Ашэр.
22.00 Бокс. ТВА. Паўтор.
0.15 Аўтагонкі сэрыі «Наскар».

22 верасьня панядзелак

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.35 Падарожжа дылетанта. «Ружаны. Золата Сапегаў».
11.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
11.35 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 «Спартыўная дзяржава».
12.30 Камэдыя «Поўны прывод».
14.20 «Ваша лято».
15.10 Вэстэрн «Макасыны Маніту».
16.35 «Маскі-шоў».
17.05 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
18.05 Сэрыял «Што сказаў нябожчык?».
19.05 Зона Ікс.
19.15 Камэдыя «Налева ад ліфта».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 Камэдыя «Адаптацыя» (ЗША).
23.40 Час спорту.
0.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.

СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15 «168 гадзін».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.40 «Тэхналёгія».
8.20 Камэдыя «Марыхуана». ЗША.
10.10 «Асабісты інтэрас».
10.50 «Дыялёг з усім сьветам»: «Маляванае жалеза Ня». Дак. фільм.
11.25 «Дзікая прырода»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Клясыка гумару».
13.30, 16.00, 19.30, 22.20 «24 гадзіны».
13.55, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Маст. фільм «Восеньскі марафон».
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.55 «СТВ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 Маст. фільм «Жывая бомба».
22.50 «Навіны СНД».
23.10 «Сталічны футбол зь Сяргеем Кавальчуком».
23.35 Маст. фільм «Пацукі».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.50 Баявік «Чужы-4: Уваскрэшаньне».
11.35 Твінісы.
15.00 «Горад жанчын».
15.45 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Сканэр».
18.20 «Чалавек і закон».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
21.50 Сэрыял «Два лёсы».
23.10 Дэтэктыў «Забойства на Манастырскіх сажалках». 1-я сэрыя.

РТР

7.45 Маст. фільм «Людзі ў чорным».
9.40 У «Гарадку».
9.50, 23.15 Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
18.00 Сэрыял «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць». 1-я сэрыя.
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Крывавы адпачынак». 1-я сэрыя.
22.20 Загадкі Ёсіфа Броз Ціта.
23.30 Народны артыст.

Культура

17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.50 Музычны часопіс.
18.20 «Сувязны зямлі і неба».
18.45 «Тайны расейскай зброі». «Караблі Армагедону». Частка 1-я.
19.15 Маст. фільм «З каханымі не расставайцеся».
20.25 Нон-стоп — паездка зь Мішэлем Пэтручыяні.
21.25 «Тым часам».
22.10 «Як стварыць чалавека». Дак. сэрыял. 1-я сэрыя.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Злачынства ў стылі «мадэрн»: «Сьмерць у Вэнэцыі».
10.00 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-3».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 «Увага: вышук!».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў. Настройшчык».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач». 9-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
22.00 Сэрыял «Клан Сапрана».

Эўраспорт

9.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
10.00 Мота гран-пры. Рыё-дэ-Жанэйра. Паўтор.
12.00 Лёгкая атлетыка. Найлепшае 2003 году. Тэлечасопіс. Паўтор.
13.30 Ралі рэйд. Паўтор.
14.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Польшча—Баўгарыя. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Валейбол. Турцыя. Спэцыяльны агляд.
16.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Югаславія—Нямеччына. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
18.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Польшча—Баўгарыя. Турцыя. Паўтор.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Расея—Турцыя. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.30 К-1. Сусьветнае гран-пры. Паўтор.
23.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
1.15 Мота гран-пры. Рыё-дэ-Жанэйра. Спэцыяльны агляд.

23 верасьня аўторак

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45 Мая краіна.
9.05 Камэдыя «Адаптацыя» (ЗША).
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?». Сэрыял.
12.10 Зона Ікс.
12.25 Камэдыя «Налева ад ліфта».
14.05, 16.45, 23.20 Мая краіна.
14.15 «Усё нармальна, мама!».
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Караліна».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Судзьдзя Дрэд» (ЗША).
23.35 Кліп-абойма.
23.50 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Відэаагляд туру.

СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15. 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.10, 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Маст. фільм «Жывая бомба».
10.05 «Сталічны футбол зь Сяргеем Кавальчуком».
10.30 «Тайна чорных лятальных апаратаў». Дак. фільм.
10.55 «Пакуль гарыць сьвечка...».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Відавочца».
13.55, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Маст. фільм «Дараваньне».
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.50 Драма «Зьвярыная зона».
23.05 «Навіны СНД».
23.25 Маст. фільм «Шалёная баба».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.15 «Нашы навіны».
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.10 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
15.00 «Горад жанчын».
15.45 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Расейская Італія».
18.40 «Саці».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Здольны вучань».
23.30 «Ня толькі пра футбол».
23.50 Дэтэктыў «Забойства на Манастырскіх сажалках». 2-я сэрыя.
0.45 «На футболе».

РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць».
8.50 «Не сумуй!».
9.50, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
18.00 Сэрыял «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Крывавы адпачынак». 2-я сэрыя.
22.20 Раскрыць і даказаць.
23.30 Народны артыст.

Культура

15.05 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.45, 22.10 «Як стварыць чалавека». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя.
16.45 «Камінтэрн». Дак. сэрыял. Фільм 1-ы. «Даеш сусьветную рэвалюцыю».
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.55 «Сьвята дасканалай красы».
18.35 «Тайны расейскай зброі». «Караблі Армагедону». Частка 2-я.
19.00 «Прыгоды Драбінак і Макароніны». Мультфільм.
19.15 Маст. фільм «Прызнаньне ў каханьні».
21.25 Ток-шоў «Аркестравая яма».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 Тэрыторыя выжываньня.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Прэм'ера. Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў. Стрэл у сьпіну».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач». 10-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
22.00 Сэрыял «Клан Сапрана».

Эўраспорт

9.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
11.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Польшча—Баўгарыя. Турцыя. Паўтор.
12.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Італія—Украіна. Турцыя.
14.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
15.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 16-ы этап. Жывая трансьляцыя.
18.45 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Жывая трансьляцыя.
21.30 Бокс. Паўтор.
22.00 Бокс. Цяжкавагавікі. Рэно.
0.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс.
1.15 Трыял. Гішпанія.
1.45 Водаматорны спорт. Італія.

24 верасьня серада

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 Маст. фільм «Судзьдзя Дрэд» (ЗША).
10.45 Мая краіна.
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?». Сэрыял.
12.10 Камэдыя «Караліна».
14.05 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Абрабаваньне па-французску».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Бульварны раман».
23.30 Акадэмія зласлоўя.
23.40 Кліп-абойма.
23.55 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Відэаагляд.

СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Маст. фільм «Зьвярыная зона».
10.00 «Запрашаем паскардзіцца».
10.10, 20.25 «Аўтапанарама».
10.25 «Канал гісторыі»: «Росвэл: разгадка тайны». Дак. фільм.
11.10 «Закон і крымінал».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Такая прафэсія».
13.55, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Дэтэктыў «Гаспадар тайгі».
18.05 Дак. фільм «Эўфрасіньня Полацкая».
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 Драма «Вочы анёла».
23.00 «Сузор'е «Дынама». Дак. фільм.
23.30 «Навіны СНД».
23.45 Маст. фільм «Тры маленькія словы». ЗША, 1950.

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50. 22.10 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 «Ня толькі пра футбол».
11.05 Дыснэй-клюб: «Кім Пяць-з-плюсам».
15.00 «Горад жанчын».
15.45 «Фабрыка зорак- 3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Новы дзень». «Невядомая плянэта».
18.40 «Няскончаны раман. Лідзія Федасеева-Шукшына». Дак. фільм.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Дачны сэзон».
23.30 Дэтэктыў «Забойства на Манастырскіх сажалках». 3-я сэрыя.

РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць». 2-я сэрыя.
8.50 Сам сабе рэжысэр.
9.50, 22.20 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
18.00 Сэрыял «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Сэкта». 1-я сэрыя.
22.35 Народны артыст.
22.45 Юбілейная вечарына Расула Гамзатава.

Культура

15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.45 «Як стварыць чалавека». Дак. сэрыял. 3-я сэрыя.
16.45 «Камінтэрн». Дак. сэрыял. «Штурм не адбыўся».
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.55 Канцэрт аркестраў народных інструмэнтаў.
18.35 «Тайны расейскай зброі». «Таварыш Нобіле».
19.00 «Прыгоды Драбінак і Макароніны». Мультфільм.
19.15 Маст. фільм «Раскажы мне пра сябе». Маст. фільм.
20.45 «Дзень нараджэньня». Дак. фільм.
21.15 Ток-шоу «Школа зласлоўя».
22.10 «Як стварыць чалавека». Дак. сэрыял. 3-я сэрыя.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Расьліннае жыцьцё».
10.05 Кулінарны паядынак.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: Бацькі і дзеці». Частка 1-я.
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач». 11-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
22.00 Сэрыял «Клан Сапрана».

Эўраспорт

9.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
10.30 Футбол. Швайцарыя.
11.00 Футбол. Унівэрсыяда. Карэя.
12.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
13.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Югаславія—Нямеччына. Турцыя. Паўтор.
14.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 16-ы этап. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 17-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Польшча—Італія. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.15 Конны спорт. Кубак нацый. Супэр-ліга. Барсэлёна.
22.15 Конны спорт. Мастэрз.
23.15 Гольф.
23.45 Ветразевы спорт.
0.30 Футбол. Кубак УЭФА. Спэцыяльны агляд.

25 верасьня чацьвер

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.05, 16.45, 23.30 Мая краіна.
9.05 Маст. фільм «Бульварны раман».
11.05, 18.05 «Што сказаў нябожчык?». Сэрыял.
12.10 Камэдыя «Абрабаваньне па-французску».
14.15 Чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Відэаагляд.
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Ас з асаў».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 Маст. фільм «Супраць плыні».
23.40 Кліп-абойма.
23.55 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Відэаагляд.

СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Тэма дня».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Драма «Вочы анёла».
10.10 «Партрэт у інтэр'еры».
10.30 «Сузор'е «Дынама». Дак. фільм.
11.05, 20.25 «Фільм, фільм, фільм».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Дзіўныя жывёлы». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Усё для цябе».
13.50, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Дэтэктыў «Зьнікненьне сьведкі».
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Плянэта людзей».
20.10 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 Маст. фільм «Снайпэр у горадзе».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
23.45 «Хіт-момант. Вынікі месяца».
0.00 Маст. фільм «Антыцела».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.10 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
15.00 «Горад жанчын».
15.45 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Тэатральны раман». Дак. фільм.
18.40 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Забойная сіла: Зьмякчальныя акалічнасьці».
23.30 Дэтэктыў «Забойства на Манастырскіх сажалках». 4-я сэрыя, заключная.

РТР

7.45, 19.55 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць».
8.50 Пакой сьмеху.
9.50, 22.20 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
18.00 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэньне». «Сэкта». 2-я сэрыя.
22.35 Народны артыст.

Культура

15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.45, 22.10 «Як стварыць чалавека». Дак. сэрыял. 4-я сэрыя, заключная.
16.45 «Камінтэрн». Дак. сэрыял. «Сталін з намі!».
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.55 Білет у Вялікі...
18.35 «Тайны расейскай зброі». «Закрыты праект».
19.00 «Прыгоды Драбінак і Макароніны». Мультфільм.
19.15 Маст. фільм «Хваляваньне пачуцьцяў».
20.35 «Якая музыка была...»
21.15 «Культурная рэвалюцыя».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Жаночы погляд».
10.00 Кватэрнае пытаньне.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Супэршпіёнкі».
17.25 «Прафэсія — рэпартэр».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: Бацькі і дзеці». Частка 2-я.
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач». 12-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.55 «Да бар'ера!».

Эўраспорт

9.30 Конны спорт. Кубак нацый. Супэр Ліга. Барсэлёна. Паўтор.
10.30 Тэніс. WTA. Ляйпцыг.
11.30 Футбол. Кубак УЭФА. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
13.30 Пляжны валейбол. ЗША.
14.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 18-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Чэхія—Польшча. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Жывая трансьляцыя.
22.30 Бокс. Сардынія.
1.00 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 18-ы этап. Паўтор.

26 верасьня пятніца

БТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.05, 23.45 Мая краіна.
9.05 Маст. фільм «Супраць плыні».
11.05 «Што сказаў нябожчык?». Сэрыял.
12.10 Камэдыя «Ас з асаў».
14.15 Чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Відэаагляд.
15.10 «Маскі-шоў».
15.30 Сэрыял «Пярэварацень у школьным гарадку».
16.05 «5х5».
17.05 «Масква — Менск».
17.15 «Хіты 80-х». Канцэрт вакальна-інструмэнтальных ансамбляў «Арэра», «Синяя птица», «Поющие сердца», «Самоцветы».
19.05 Камэдыя «Самалет ляціць у Расею».
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.40 «Спэцыяльны рэпартаж». «Аўгустоўскі канал. Паміж Віслай і Нёманам».
21.50 Маст. фільм «Уцякач».
23.55 Маст. фільм «Вуліцы асалоды».

СТВ

6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 23.00 «Тэхналёгія».
8.20 Маст. фільм «Снайпэр у горадзе».
10.05, 14.45 «Хіт-момант. Вынікі месяца».
10.20, 20.35 «Аўтапанарама».
10.35 «Тэатральныя гісторыі».
10.50 «Тайна асуджаных самалётаў». Дак. фільм.
11.25 «Дзікая плянэта»: «Вялікі парад жывёл». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Сусьветныя розыгрышы».
13.50, 18.35 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
16.20 Драма «Расейскія бабы».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Камэдыя «Найлепшы сябар».
23.10 «Навіны СНД».
23.25 «Хіт-момант. Прэм'ер-выпуск».
23.50 Баявік «Тайна затанулага самалёта».

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Сэрыял «Два лёсы».
10.45 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.00 «Горад жанчын».
15.45, 22.10 «Фабрыка зорак-3».
16.10 Сэрыял «Бераг мары». 20-я сэрыя.
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.15 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.05 «Поле цудаў».
23.45 IX урачыстая цырымонія ўручэньня нацыянальнай тэлевізійнай прэміі «ТЭФІ-2003».

РТР

7.45 Сэрыял «Каменская-2. За ўсё трэба плаціць».
8.50 Аншляг.
9.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.05 «Другая палова».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Народны артыст.
20.50 «Кубак гумару». У перапынку: Вынікі галасаваньня «Народны артыст — Ваш выбар!»

Культура

15.00 «Плён асьветы». «Гутаркі пра расейскую культуру».
15.45 «Сёньня прэм'ера». Дак. фільм.
16.45 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
17.30 Навіны культуры.
17.45 «Да Франкфурцкага кніжнага кірмашу».
17.55 «Краканош». Мультфільм.
18.10 «Алаў». Дак. фільм.
19.00 «Бег». Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.05 Фактар страху.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Іх норавы».
17.25 «Нацыянальнае бясьпека: стэпавае права шахматнай рэспублікі».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Маст. фільм «Паліцэйскі».
22.25 Супэрбокс: Дэрык Гейнэр супраць Оскара Леона.

Эўраспорт

9.30 Конны спорт. Мастэрз. Паўтор.
10.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
11.00 Пляжны валейбол. ЗША. Паўтор.
11.30 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя—Германія. Турцыя.
13.00 Тэніс. АТР. Чвэрцьфінал. Палерма. Жывая трансьляцыя.
14.30 Футбол. Кубак УЭФА.
15.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 18-ы этап. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 19-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Пляжны валейбол. ЗША. Паўтор.
19.30 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Жывая трансьляцыя.
21.00 «Формула». Аўтачасопіс.
21.30 «Супэргоначны ўік-энд». Аўтачасопіс.
22.45 «Самы дужы чалавек». Сусьветны рэкорд.
0.00 «Сэрыі». Аўтачасопіс.
0.30 Аўтагонкі. Сьпілбэрг.
1.00 Экстрэмальныя віды спорту.

27 верасьня субота

БТ

7.35 «Спэцыяльны рэпартаж». «Аўгустоўскі канал. Паміж Віслай і Нёманам».
7.45, 18.30 Мая краіна.
8.00 «Існасьць». Духоўная праграма.
8.25 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Ўзьвіжаньня жыватворнага крыжа гасподняга.
8.35 «36,6».
9.00, 12.00, 15.00, 21.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
10.00 «Усё нармальна, мама!».
10.45 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
11.10 Мэлядрама «Ясенія».
13.30 «Кропка». Музычна-забаўляльная праграма для моладзі.
14.10 Дак. сэрыял «На прыродзе з Стэфанам Пэйранам».
15.05 Футбол. Адборачны турнір чэмпіянату Эўропы-2004 сярод юначых каманд. Відэаагляд.
15.50 Маст. фільм «Сталкер».
18.45 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
19.25 Камэдыя «Старыя-разбойнікі».
21.15 «Вакол плянэты».
21.45 Маст. фільм «Банды Нью-Йорку».
0.25 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Відэаагляд.

СТВ

7.30 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.55 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.20 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.45 Маст. фільм «Госьця з будучыні». 5-я сэрыя.
9.55, 19.55 «СТВ-спорт».
10.05 «Рэактыўны бокс».
10.20 Дак. фільм «Жывыя сьведкі ледавікоў».
11.00 «Анфас».
11.15 «Разам».
11.45 «Партрэт у інтэр'еры».
12.00, 0.30 «Срэбранае вясельле». Тэлесэрыял. 1-я сэрыя.
13.05 Камэдыя «За двума зайцамі».
14.50 «Дружная сямейка».
16.00 «Клясыка гумару».
17.05 «Канал гісторыі»: «Работы, пра якія можна толькі марыць». Дак. фільм.
18.50 Камэдыя «Гульня ў чатыры рукі».
19.30 «24 гадзіны».
20.10 Мэлядрама «Восень у Нью-Ёрку».
22.05 «Навіны СНД».
22.20 «Арт-хаўз»: «Чэхаўскія матывы».

АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому».
11.10 «Падарожжы натураліста».
11.40 «Ералаш».
12.10 «Гісторыя з геаграфіяй». «Цуды сьвету».
13.05 Прэм'ера. «Пярэстая стужка».
14.00 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.25 «Ералаш».
14.40 «Вялікія бацькі».
15.10 Маст. фільм «Іншаплянэцянін».
17.00 «Каханьне Чапая». Дак. фільм.
17.55 Камэдыя «Ўсе ў захапленьні ад Мэры».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 «Розыгрыш».
23.20 «Залаты грамафон».
0.20 Баявік «Рабакоп».

РТР

9.20 «Не сумуй!».
10.20 Сам сабе рэжысэр.
11.15 «Круты маршрут».
12.15 Клюб сэнатараў.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Да Чорнага мора».
14.45 «ХА». Маленькія камэдыі.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Растоў» (Растоў-на-Доне) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя з Растова-на-Доне.
17.00 «Кубак гумару».
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.20 Аншляг.
21.15 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Сонная лагчына».

Культура

11.45 ГЭГ.
12.00 «Ішоў сабака па раялі». Маст. фільм.
13.05 «Салдацкі каптан». Мультфільм.
13.20 «Навука: стратэгія прарыву». «Адукацыя».
13.50 «Партытуры не гараць».
14.15 «Зьяўленьне Майстра».
14.55 «Гісторыя каня». Тэлевэрсія спэктаклю.
17.05 «Загадкі Н.Ф.І. і іншыя вусныя аповеды Іраклія Андронікава». Дак. фільм.
18.10 «Адкрыцьцё Міжнароднага дому музыкі». Першы выступ Нацыянальнага філярманічнага аркестру Расеі.
20.30 Сьмеханастальгія.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.45 Маст. фільм «Ноч у Варэне».

НТВ

9.00 Кулінарны паядынак.
9.55 Кватэрнае пытаньне.
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 «Дзікі сьвет».
12.00 Дэтэктыў «Пярсьцёнак з Амстэрдаму».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Сэрыял «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: гульня».
17.05 «Найноўшая гісторыя: вайна ў шклянцы». 2-я сэрыя.
18.00 «Асабісты ўнёсак».
19.00 Баявік «Варашылаўскі стралок».
21.10 Маст. фільм «Аднойчы на Дзікім Захадзе».
0.25 Начныя музы.

Эўраспорт

9.30 Футбол. Кубак УЭФА. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
11.30 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Будапэшт. Жывая трансьляцыя.
13.30 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Паўтор.
14.00 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
15.30 Футбол. Кубак УЭФА. Паўтор.
16.30 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. Гонка з асобным стартам. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 «Алімпійскія гульні». Часопіс. Паўтор.
21.30 Бокс. Чэмпіянат Эўропы. Цяжкавагавікі. Паўтор.
23.15 Экстрэмальныя віды спорту.
0.00 Аўтагонкі. Гоначная сэрыя «Амэрыкан Леман». Маямі. Жывая трансьляцыя.
2.15 Тэніс. Палерма.

28 верасьня нядзеля

БТ

7.35 «Дастань зорку!».
8.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
8.35 Арсэнал.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2».
9.55 Атрымай новыя мільёны з «Gallina Blanca».
10.00 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
10.55 «Падарожжа дылетанта». «Глыбокае. Мэцэнат Я.Корсак».
11.20 Маст. фільм «Апошні з магікан».
13.15 «Ваша лято».
13.55 Мая краіна.
14.10 Дак. сэрыял «На прыродзе з Стэфанам Пэйранам».
15.05 КВК. 1/3 фіналу Эўралігі.
16.40 «На скрыжаваньнях Эўропы».
17.20 «Маскі-шоў».
17.40 Камэдыя «Пацучыныя гонкі».
19.25 Камэдыя «Формула каханьня».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.00 Чэмпіянат сьвету па мастацкай гімнастыцы. Відэаагляд.
22.40 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Матч туру.

СТВ

7.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
7.50 «Супэрпарася». Мультсэрыял.
8.15 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
8.40 «Каралеўства крывых люстэрак». Маст. фільм.
9.55 «СТВ-спорт».
10.10, 20.20 «Аўтапанарама».
10.35 «Менск і менчукі».
10.40 «Сьвецкая хроніка».
10.50 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.15 «Філярманічны тыдзень».
11.20 «Плянэта людзей».
11.35, 0.00 «Срэбранае вясельле». Тэлесэрыял.
12.25 «Без макіяжу».
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі».
15.20 «Дружная сямейка».
16.30, 17.25 «Галоўныя ролі». Тэлесэрыял.
18.25 «168 гадзін».
19.15 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
19.45 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.40 «Асабісты інтэрас».
21.20 «Турпаход».
21.30 «24 гадзіны».
21.50 Драма «Чалавек, які плакаў».
23.45 «Навіны СНД».

АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Вяртаньне «Караля-Льва».
9.10 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 «Дачнікі».
12.10 Дог-шоў.
12.50 Сьмеханапарама.
13.15 «Клюб падарожнікаў».
13.50 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.15 Ток-шоў «Выбар».
14.55 Камэдыя «Жывіце ў радасьці».
16.10 Маст. фільм «Амэрыканская дачка».
17.50 «Прагулкі зь пячорным чалавекам» у цыкле «Жывая прырода».
18.45 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга.
20.30 Контуры.
21.15 Супэрбаявік «Армагедон».
23.50 Праграма «Вялікія гонкі».

РТР

9.05 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.30 Вакол сьвету.
11.25 Дыялёгі пра жывёл.
12.15 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.10 Кінагісторыі Глеба Скараходава.
13.20 Маст. фільм «Дзяўчаты».
15.15 «Форт Баярд».
16.55 Леў Лешчанка. «Найлепшыя песьні».
18.50 «У гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Маст. фільм «Анаконда» (ЗША). 1997.
22.15 Маст. фільм «Апрэль».
0.15 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры ЗША. Трансьляцыя з Індыянапалісу.

Культура

11.15 «Рыцары сьмеху».
11.40 Прагулкі па Брадвэі.
12.05 «Прыгоды Бураціна». Мультфільм.
13.15 «Акадэмія палійцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.45 Ізноў кружэлка сьпявае.
14.15 Зорныя гады «Ленфільму».
14.55 «У сьвеце танцу». «Тры балеты Нача Дуата». Фільм-балет.
16.20 «Астравы».
17.00 Дак. фільм «Першы раз на эстрадзе».
18.05 «Як важна быць сур'ёзным». Маст. фільм.
19.40 «Больш чым каханьне.
20.25 «Культ кіно». «Хуткі бягун». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

НТВ

9.05 «Расьліннае жыцьцё».
9.45 Вайсковая справа.
10.15 «Апэльсынавы сок».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Усё адразу!
12.05 Маст. фільм «З табой і безь цябе...».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.25 «Іх норавы».
16.15 Сэрыял «Агент нацыянальнай бясьпекі-3: падышах».
17.25 «Злачынства ў стылі «мадэрн»: «Лідваляда».
18.00 Маст. фільм «Стоеная пагроза».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фактар страху.
22.25 Баявік «Разбойнік».

Эўраспорт

9.30 Маратон. Бэрлін. Жывая трансьляцыя.
12.00 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат сьвету. Будапэшт. Жывая трансьляцыя.
13.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Імола. Жывая трансьляцыя.
15.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Турцыя.
16.00 Вэляспорт. Тур Гішпаніі. 21-ы этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Валейбол. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Фінал. Турцыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Аўтагонкі сэрыі «КАРТ». Маямі. Жывая трансьляцыя.
22.00 Аўтагонкі сэрыі «Наскар». Дуўр.
23.00 Аўтагонкі сэрыі «Індыкар». Фантана.
0.15 Тэніс. WTA. Ляйпцыг. Фінал.
1.15 Тэніс. Палерма. Фінал.
2.15 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Імола.

Беларускі Калегіюм

Прапануе дадатковае навучаньне па спэцыялізацыях: **філязофія/літаратура; журналістыка; найноўшая гісторыя.**

Запрашаюцца студэнты старшых курсаў гуманітарных спэцыяльнасьцяў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У выключных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцам БК можа быць той, хто пастаянна альбо на час навучаньня пражывае ў Менску.

Навучаньне бясплатнае. Сэртыфікат БК не замяняе дыплёму аб вышэйшай адукацыі. Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка 2003 г. Запіс на сумоўе — да 22 верасьня. Абавязковай умовай запрашэньня на сумоўе зьяўляецца падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў (ня меней за 5000 знакаў). Для сумоўя па спэцыялізацыі «найноўшая гісторыя» тэксты неабавязковыя. Даведкі праз т.: 220-63-36 (з 14.00 да 18.00 апроч суботы і нядзелі).

УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Праваабаронца, бараніся сам

Сьледам за «Прававой дапамогай насельніцтву» перад пагрозай закрыцьця апынуўся праваабронча цэнтар «Вясна». Дату суду над «Вясной» Вярхоўны Суд вызначыць 23 верасьня. Кіраўнік арганізацыі Алесь Бяляцкі лічыць, што іх «замовілі».



PHOTO.BYMEDIA.NET

Алесь Бяляцкі гатовы сысьці ў падпольле

Дамоклаў меч закрыцьця вісіць ня толькі над «Вясной». Тры папярэджаньні ад Мінюсту мае Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў, праверка з падатковай інспэкцыі працуе цяпер у Хельсынскім камітэце.

Пазоў аб ліквідацыі «Вясны» быў накіраваны ў Вярхоўны Суд 2 верасьня. У дакумэнце за подпісам міністра юстыцыі В.Галаванава гаворыцца, што «Вясна» парушыла шэраг заканадаўчых палажэньняў. Нібыта праваабаронцы сфальсыфікавалі подпісы ў рэгістрацыйных дакумэнтах, не зарэгістравалі менскай філіі, ня маюць дастатковае колькасьці сяброў, парушалі закон падчас назіраньня на выбарах 2001 г. Самае велічнае абвінавачаньне — адвакаты «Вясны» баранілі ў судах простых грамадзянаў, а не сяброў сваёй арганізацыі.

Бараніцца «Вясна» зьбіраецца ня толькі ў судовай залі. Бяляцкі плянуе вулічныя акцыі ля будынку суду.

«Праваабарончыя арганізацыі — носьбіты ідэалаў грамадзянскай супольнасьці. Тое, што дзяржава змагаецца з праваабронцамі, гаворыць не на яе карысьць», — адзначыла кіраўнічка БХК Тацяна Процька. Крытычна ацаніла сытуацыю і кі раўнічка Цэнтру па правах чалавека Вера Страмкоўская: «У апошнія гады ўлады не рэгістравалі новых праваабарончых арганізацыяў. Наяўныя арганізацыі займалі розныя нішы, і страта «Вясны» будзе згубнай для грамадзянскай супольнасьці. На знойдзеныя ў дзейнасьці праваабарончых арганізацыяў дробныя парушэньні можна было б рэагаваць больш мякка».

Ілюзіяў праваабаронцы ня маюць. «Закрыцьцё арганізацыяў будзе працягвацца. Гэта — замова, якую атрымаў Мінюст ад выканаўчых уладаў: расправіцца з намі напярэдадні парлямэнцкіх выбараў і магчымага рэфэрэндуму», — кажа А.Бяляцкі. Вясноўцы будуць і надалей бараніць людзей у судах, сачыць за сытуацыяй з правамі чалавека, выдаваць бюлетэнь і падтрымліваць сайт. Цяжэй будзе з афіцыйнымі зваротамі да ўлады. Давядзецца мяняць і форму назіраньня падчас выбараў ды галасаваньняў: вылучыць назіральнікаў ад зачыненай «Вясны» будзе немагчыма.

З закрыцьцём арганізацыі афіцыйна спыняць сваю дзейнасьць і сем яе філіяў. (Яшчэ ў дзесяці гарадах дзейнічаюць сябры арганізацыі, але зарэгістраваных філіяў няма.) Агулам «Вясна» мае блізу 150 сяброў. Гэта больш, чым у «Цэнтры па правах чалавека» (25 чалавек, пераважна валанцёраў), але менш, чым у БХК (больш за 500, аднак у штаце толькі 40).

Аркадзь Шанскі

«Малады фронт-2»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сяргей Мудрачэнка

21 верасьня Партыя БНФ зьбірае сход моладзі. Незарэгістраваны «Малады фронт» на яго не запрошаны, толькі «партыйныя» яго сябры. Сход можа пакласьці пачатак новай моладзевай арганізацыі.

Кіраўнік аргкамітэту сходу Сяргей Мудрачэнка не адмаўляе, што адно з пытаньняў павесткі дня — адносіны з «Маладым фронтам»: «Ці створыцца новая арганізацыя? Такія меркаваньні гучалі. Іх асабліва актыўна падтрымліваюць сталічныя сябры БНФ. У Менску ёсьць праблемы ў стасунках з «МФ». У рэгіёнах такіх праблемаў няма».

Лідэр маладафронтаўцаў **Павал Севярынец** скептычна ставіцца да ініцыятывы «старога Фронту»: «Ужо пяць разоў «старэйшыя таварышы» спрабавалі стварыць сваю моладзевую фронтаўскую арганізацыю. Але ў іх нічога не ўдавалася».

СЁ

Гарадзкая ластаўка — птушка-2004

Налета «Птушкай году» ў краіне будзе гарадзкая ластаўка *(Delichon urbica)*. Гэтак пастанавілі сябры грамадзкай арганізацыі «Ахова птушак Беларусі». У мінулыя гады гэтую пачэсную пасаду займалі белы бусел, белая пліска, авяльга і верабей.

З 81-82 відаў, якія выдзяляюць у асобнае сямейства Ластаўкавыя, у Беларусі распаўсюджаныя тры: ластаўка-зямлянка, вясковая і гарадзкая ластаўкі. Гарадзкія ластаўкі будуюць свае гнёзды на мураваных, цагляных або мэталічных паверхнях, на скальных абрывах. Зьявіліся яны ў нас адносна нядаўна, калі тут пачалі ўзводзіць мураваныя або цагляныя будынкі. Звычайны для Беларусі від, колькасьць якога на сярэдзіну 1990-х ацэньвалася ў 100—150 тыс. параў.

Гэтыя невялікія птушкі сваю ядуць дробную жамяру. Таму вымушаныя адлятаць у вырай.

Дзьмітры Вінчэўскі

ХРОНІКА ЎЦІСКУ

11 верасьня суд Цэнтральнага раёну Менску вынес папярэджаньне сябру Беларускай партыі свабоды Васілю Парфянкову за ўдзел у пікетаваньні расейскага пасольства. Гомельская міліцыя 12 верасьня спрабавала сарваць канфэрэнцыю «Моладзь і журналістыка»: тры ахоўнікі парадку на чале з капітанам Юдчыцам патрабавалі сьпіс удзельнікаў мерапрыемства, бо, маўляў, ёсьць зьвесткі, што тут рыхтуецца тэрарыстычная акцыя. У той самы дзень прафсаюзны актывіст заводу аўтаагрэгатаў **Ян Роман** падаў скаргу ў пракуратуру: напярэдадні ахова заводу і міліцыянты яго незаконна абшукалі, але не складалі пратаколу. 15 верасьня ў Фрунзэнскім судзе Менску аднавіўся разгляд адміністрацыйнай справы **Аксаны Новікавай**: 8 верасьня яна зладзіла несанкцыяваны пікет каля Менскага гарадзкога суду, пратэстуючы супраць закрыцьця праваабарончай арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву». Працяг працэсу адкладзены да 6 кастрычніка. Падчас Ланцуга неабыякавых людзей 16 верасьня ў Менску былі затрыманыя актывісты АГП **Андрэй Козел** і **Андрэй Абалевіч**: на іх склалі пратаколы за распаўсюд незарэгістраваных друкаваных матэрыялаў.

Сьледам за рэчыцкай друкарняй сьветлагорскую недзяржаўную газэту «Регион-Вести» адмовіліся друкаваць у Бабруйску, Жлобіне й Мазыры (а папярэдне давалі згоду). Друкарні адмовіліся пасьля рэзкіх газэтных публікацыяў у адрас кіраўніцтва вобласьці й раёну.

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

«Газпром» і «АЭС Расеі» каапэруюцца ў Беларусі

«Газпром» і «АЭС Расеі» дамовіліся пра супольную працу ў Беларусі. Гаворка пра перапрацоўку газу на беларускіх электрастанцыях, у прыватнасьці ў Белаазерску, з наступным экспартам энэргіі ў Польшчу. Інвэстыцыі ў Бярозаўскую ГРЭС маюць акупіцца за год працы. Паводле ацэнак «АЭС Расеі», цана на энэргію ў самой Беларусі налета будзе «прывязаная» да цаны на рынку энэргіі ў Расеі.

«Бархім» — наш «Арыэль»

У верасьні баранавіцкае УП «Бархім» пачынае вытворчасьць вадкіх мыйных сродкаў для пральных машын-аўтаматаў. Ад 5 да 10% прадукцыі «Бархіму» экспартуецца ў Расею і Літву. Рэшта прадаецца на ўнутраным рынку.

Радыё «Берасьце» выйшла ў FM

16 верасьня радыё «Берасьце» адкрыла новы сэзон на частаце 104,8 FM. Раней яно вяшчала на ультракароткіх хвалях. Радыё «Берасьце» будзе ў эфіры 18 гадзін (проці ранейшых 15). У пэрспэктыве плянуецца дасягнуць кругласуткавага вяшчаньня. Галоўны рэдактар станцыі — Дзяніс Дакучыц.

Стаўка рэфінансаваньня зноў зьніжаная

Яшчэ на 1% — да 29% гадавых — зьніжаная базавая стаўка рэфінансаваньня Нацбанку. На пачатку году яна складала 38% гадавых. Прычына зьніжэньня — сьцішэньне тэмпаў інфляцыі.

Ірак павялічвае экспарт нафты

Здабыча нафты ў Іраку дасягнула 1,5 млн барэляў у дзень. Цэны на яе зьмяншаюцца. Барэль нафты ў Лёндане цяпер каштуе 26,5 даляра, у Нью-Ёрку — 28,5. Гэта найніжэйшы паказчык за апошнія чатыры месяцы. Цэны апусьціліся б яшчэ на 2—3 даляры, каб не штодзённыя атакі на амэрыканскіх жаўнераў.

GSM для КНДР

Паўночная Карэя, самая закрытая краіна сьвету, укараняе сотавую тэлефанію. На тэрыторыі краіны збудаваныя сорак перадатчыкаў, што працуюць у стандарце GSM. Пхеньян спачатку думаў пра паўднёва-карэйскую сыстэму CDMA, аднак амэрыканцы не згадзіліся на гэта зь меркаваньняў бясьпекі. У Паўночнай Карэі тэлефон — гэта прывілей эліты; трэба думаць, тое самае будзе і з мабільнікамі. Суседняя Паўднёвая Карэя займае перадавыя пазыцыі ў сотавай сувязі. З 48 мільёнаў насельніцтва 36 маюць мабільнікі, а 13,5 млн эксплюатуюць тэлефоны з найноўшымі каляровымі дысплеямі.

«Эўрафайтэр» над Эўразонай

Найноўшы шматзадачны самалёт «Eurofighter Typhoon», які ў жніўні атрымалі нямецкія ВПС, меў багата тэхнічных недахопаў. Праблемы былі з узбраеньнем самалёта. Вытворцы лічаць, што гэта — нармальная сытуацыя для новай прадукцыі. Праблемы ўжо ліквідаваныя. Немцы зьбіраюцца купіць для свайго войска 180 «Эўрафайтэраў», за 18 млрд эўра. На тым тыдні першая партыя самалётаў трапіла таксама ў Гішпанію, неўзабаве павінны пачацца пастаўкі ў Вялікую Брытанію ды Італію. У суме гэтыя чатыры дзяржавы павінны купіць 620 машынаў. Аўстрыя набудзе чатыры самалёты, ідуць перамовы і з Грэцыяй.

СП; БелаПАН

Кліп на «Крамбамбулю»

WEST RECORDS

На тыдні скончыцца праца над кліпам на песьню «Госьці» з праекту «Крамбамбуля. Каралі раёну». Відэа абяцае быць такім самым вясёлым, як і песьня. Рэжысэры роліку — Аляксей Хацкевіч і Мацьвей Сабураў, вядомыя з кліпаў «Ляпіса Трубяцкога» (апошняя праца — «Ластаўкі») і Сашы зь Сірожам.

Акром выканаўцаў — Лявона Вольскага і Сяргея Міхалка — у кадры можна будзе пабачыць вядомых спартоўцаў, якія і граюць, уласна, ролю «гасьцей зь іншаземных абласьцей». У здымках узялі ўдзел футбалісты Генадзь Туміловіч, Аляксандар Глеб і Аляксандар Хацкевіч, плыўчыха Аляксандра Герасіменя і вэлясыпэдыстка Натальля Цылінская. Спартоўцы пагадзіліся здымацца бясплатна.

Кліп будзе напалову анімацыйны (кшталту «Аў» «Ляпісаў»): удзельнікаў здымкаў шматкроць фатаграфавалі, каб потым сумясьціць іхнія фэйсы з намаляванымі целамі. «Гэта будзе гэткі лубачны постмадэрнізм», — кажа Лявон Вольскі. На тэлеэкранах «Гасьцей» можна будзе пабачыць у пачатку кастрычніка.

Сяргей Будкін

Моцны палітык з сумленным сэрцам

Швэцыя разьвіталася з сваім любімым палітыкам, зоркай, якая прадстаўляла і адстойвала прынцыпы швэдзкай дэмакратыі ў сьвеце. Міністарку замежных справаў Швэцыі Ганну Лінд 10 верасьня забіў нажом невядомы. Адбылося гэта сярод белага дня ў вялізным цэнтральным унівэрмазе «NK», дзе заўсёды сьвет народу й яшчэ больш — ахоўнай электронікі. Увечары 10-га навіны паведамлялі, што Ганна мусіць ачуняць. Але пасьля дванаццаці гадзінаў барацьбы хірургі Каралеўскага шпіталю здаліся. Прабітая пячонка крывавіла, не працавалі лёгкія...

Пра сьмерць Ганны я здагадаўся наступнай раніцай аб 11-й, калі, ня ведаючы апошніх навінаў, заўважыў, што швэды прыспусьцілі нацыянальныя сьцягі на бальконах.

У апошні дзень жыцьця Ганна разам зь сяброўкай рабіла закупы — вядома, без ахоўніка, бо была на прыватным шпацыры.

У Швэцыі зь яе спакойным жыцьцём міністры гуляюць без аховы. У Ганны Лінд не было ворагаў. Прыватнае жыцьцё яе не трапляла пад увагу газэтаў і тэлебачаньня. Нарадзілася яна 19 чэрвеня 1957-га каля Стакгольму ў мястэчку Энскедэ, усё жыцьцё пражыла ў Стакгольмскім рэгіёне. Разам з мужам і двума хлопчыкамі 9 і 11 гадоў Ганна жыла ў мястэчку Нюшопінг за 100 км ад сталіцы. Суседзі любілі і паважалі яе, бо бачылі, як Ганна разам зь дзеткамі і торбамі выстойвае разам з усімі ў чарзе ля супэрмаркету. Штодня Ганна езьдзіла на працу ў Стакгольм на электрычцы разам з працоўным людам і без ахоўніка. Гэтым нікога ў Швэцыі ня зьдзівіш, бо ёсьць гэта нармальным, дакладней — было.

Забойства выклікала шок у Швэцыі. На мітынгу ў памяць Ганны Лінд, які сабраў 12 верасьня 50-тысячны натоўп, лідэр краіны Ёран Пэрсан не хаваў сьлёз і прасіў прабачэньня ў сям'і. Ганну любілі ўсе. Тады хто і за што забіў яе? Швэды наракаюць на сакрэтную службу Швэцыі «Сэпо». Ганна Лінд была галоўным маторам далучэньня Швэцыі да эўраабшару. У прыватных гутарках швэды кажуць, што Ганну мог забіць псыхічна хворы чалавек, які мае кансэрватыўныя погляды, у тым ліку выступае супраць эўра.

Выступаючы 3 чэрвеня 2003 г. на беларускім мітынгу на цэнтральнай плошчы Стакгольму Сэргельстор'е, за два крокі ад злавеснай крамы «NK», Ганна Лінд сказала: «Чаму мы, швэды, зьвяртаем увагу на беларусаў? Чаму Швэцыю сёньня непакоіць лёс Беларусі? Таму што Беларусь — наша суседка ў Балтыйскім рэгіёне; нарэшце, таму, што мы, швэды, і беларусы, маем супольную гісторыю, пачынаючы з часоў вікінгаў».

Беларусам будзе цікава даведацца, што значыць рэфэрэндум у дэмакратычнай краіне. Гэта значыць, што кожны дзень ідуць дэбаты-спрэчкі паміж прыхільнікамі і праціўнікамі эўра. Гэта значыць, што кожны дзень і адным, і другім даюць гадзіну на агітацыю ў «прайм-тайм». Нават сябры кіраўнічай сацыял-дэмакратычнай партыі маюць супрацьлеглыя погляды і не хаваюць гэтага. Гэта значыць, што калі ў нядзелю 14 верасьня ў 20.00 зачыніліся скрынкі для галасаваньня, дык усяго праз паўтары гадзіны на экране высьвяцілі вынікі па 90% выбарчых участкаў і краіна даведалася вынік. Пры гэтым падлік галасоў вёўся ўручную.

> Штодня Ганна Лінд езьдзіла на працу ў Стакгольм на электрычцы разам з працоўным людам і без ахоўніка.

У Стакгольме яшчэ стаяць вялізарныя рэклямныя шчыты з Ганнай і ейнымі словамі ў падтрымку эўра. Але эўра прайграла: 56,2% удзельнікаў рэфэрэндуму сказалі «не», 41,8 — «так». Ля шчытоў з Ганнай Лінд па ўсёй краіне ляжаць кветкі...

Ёсьць нейкая містыка ў тым, што злачынца засьпеў Ганну Лінд літаральна за 800 мэтраў ад месца, дзе ў 1986-м на выхадзе з кінатэатру быў забіты прэм'ер-міністар Улаф Пальмэ. Тады забойцы не знайшлі, а да наступнага прэм'ера прыставілі абавязковага драбанта (целаахоўніка). Ад сёньня асобнага вартаўніка мусіць мець ужо кожны міністар. З Улафам Пальмэ Ганна Лінд сябравала. Яны належалі да адной сацыял-дэмакратычнай партыі, разам выступалі на мітынгах супраць савецкай агрэсіі ў Аўганістане.

Палітычная кар'ера Ганны пачалася ў 1969 г. 12-гадовай дзяўчынкай яна сталася актывісткай маладых сацыял-дэмакратаў. У 1982-м, у 25 гадоў, была абраная сябрам швэдзкага сойму, тады ж абараніла кандыдацкую дысэртацыю па праве ва ўнівэрсытэце Ўпсалы. З 1994 г. Ганна — міністарка экалёгіі, з 1998-га — замежных справаў. Яна карысталася вялізнай павагай сярод сваіх калегаў у сьвеце. Пра гэта добра сказаў колішні палітуцякач у Швэцыю ад рэжыму «чорных палкоўнікаў», а сёньня міністар замежных справаў Грэцыі Георгіяс Папандрэў. Сумленьне не дазваляла Ганьне Лінд маўчаць пра грубыя парушэньні правоў чалавека. Пра гэта, не зважаючы на пагоны, яна казала і ў Маскве — крытыкуючы палітыку ў Чачэніі, і ў Вашынгтоне — пратэстуючы супраць умоваў утрыманьня вязьняў на амэрыканскай кубінскай базе «Гуантанама».

Пасьля страты Васіля Быкава гэта наступная вялікая страта для беларусаў. Забілі ўплывовага швэдзкага палітыка, які быў шчырым сябрам Беларусі. Ганна Лінд пасьлядоўна выступала за дэмакратызацыю жыцьця ў нашай краіне. Абараняла журналістаў гарадзенскай «Пагоні», уздымала беларускае пытаньне на розных эўрафорумах. 3 ліпеня 2003 г. яна сабрала прэс-канфэрэнцыю з нагоды адкрыцьця Швэцыяй у кастрычніку 2003 г. амбасады ў Менску на чале з сталым амбасадарам (раней у Беларусі быў толькі ганаровы кансулят). Было шмат пытаньняў ад журналістаў. Ганна казала, што лічыць Беларусь гістарычнай часткай эўрапейскай прасторы, тлумачыла, што новае дыпрадстаўніцтва мае перадусім спрыяць дэмакратызацыі краіны на шляху да Эўропы.

Памяць пра Ганну Лінд дае беларусам упэўненасьць: мы не адзінокія, вакол нас — сябры з адкрытага сьвету, а ня ворагі.

Андрэй Катлярчук, Стакгольм

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларусак у бардэлях найбольш

Тэма нелегальнай прастытуцыі зноў актуальная ў Нямеччыне. Цікавасьць аднавілася пасьля таго, як вядомы тэлевядоўца Мішэль Фрыдман быў засьпеты ў бэрлінскім гатэлі зь нелегальнай прастытуткай-украінкай.

З 200 тысяч замежных нелегальных прастытутак, якія працуюць у Нямеччыне, беларусак найбольш — 14,2%, украінак — 13%, літовак — 12,1%, полек — 8,5%, расеек — 7,4%. Нездарма апэрацыя па ліквідацыі нелегальных бардэляў звалася «Belarus». Адбылася яна ў красавіку 2001-га, але зямельны суд у Гале дагэтуль не закрыў справу аднаго з галоўных гандляроў людзьмі. Разглядаюць яе завочна, бо злавіць злачынца так і не ўдалося. Родам ён зь Беларусі.

Паводле ацэнак Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, на Захад штогод вывозяць і прымушаюць займацца нелегальнай прастытуцыяй 500 тыс. усходнеэўрапейскіх жанчынаў. І штогод яны прыносяць сваім гаспадарам 13 млрд даляраў. Гэткі самы гадавы прыбытак мае канцэрн «Адыдас».

Перапраўка адной жанчыны зь Менску да Бэрліна каштуе гандлярам 500 эўра (разам з хабарам). Гэтую суму прастытутка можа адпрацаваць за два вечары (пры тарыфе 30 эўра за аральны сэкс і 60 за звычайны). Сярэдні прыбытак путаны, паводле зьвестак Эўраполу, — 350 эўра за працоўны дзень. Але «на рукі» ёй сутэнэр выдае ня больш за 15% ад сумы. А можа і аплявухай разьлічыцца. Звычайна жанчынам кажуць, што іх вываз у Нямеччыну каштаваў дзесяць тысячаў эўра, якія яны мусяць адпрацаваць.

ВД

Квасьнеўскага перамагла жонка

Палякі гатовыя абраць прэзыдэнтам Іялянту Квасьнеўскую. Падчас адпаведнага апытаньня першая лэдзі Польшчы набрала галасоў у чатыры разы больш за свайго мужа, што апынуўся на другім месцы. Сярод прыхільнікаў Іялянты ёсьць каталікі і некаталікі, правыя і левыя, старэйшыя і маладзейшыя палякі. Аляксандар Квасьнеўскі сказаў, што «будзе шанаваць рашэньне жонкі, калі яна вырашыць балятавацца». Але ён зь цяжкасьцю ўяўляе сябе на месцы «першай лэдзі». Папулярнасьць Квасьнеўскага ўжо восем гадоў запар трымаецца на ўзроўні 72—74%. Ягоная другая кадэнцыя скончаецца ў 2005 г.

WWW_WHITEHOUSE_GOV

Эўраскрынкі

Польскія паштовыя скрынкі зробяцца непрыдатнымі пасьля далучэньня краіны да Эўразьвязу. Цяпер адчыніць скрынку могуць два чалавекі: паштальён Польскае пошты і сам адрасат. Аднак пасьля ўваходу ў ЭЗ на рынак краіны прыйдуць і іншыя паштовыя фірмы. Да таго ж, цяпер паштальён можа бачыць зьмест скрынкі, а гэта не адпавядае нормам Зьвязу. Палякі рыхтуюцца ставіць скрынкі іншага ўзору: каб туды карэспандэнцыю мог укінуць любы, а дастаць — толькі адрасат. Гэтыя зьмены падабаюцца палякам з усіх бакоў, акрамя аднаго — новыя скрынкі трэба будзе купляць за свае грошы.

Колькі зарабляюць палякі

Польскі ўрад пастанавіў, што памер мінімальнага заробку ў краіне налета будзе складаць 824 злотыя (каля 430 тыс. рублёў). Гэта на 3% больш, чым сёлета. Прагназаваны паказчык інфляцыі ў польскай эканоміцы ў 2004 г. — 2%. Гэта значыць, што рост заробкаў у палякаў апярэджвае інфляцыю.

Сярэдні заробак сёлета ў Польшчы складае амаль 600 даляраў.

Аляксей Дзікавіцкі, Варшава

Швэдам няблага і з кронай

Адмова швэдаў ад эўра падчас рэфэрэндуму не адаб'ецца на дабрабыце Швэцыі. Увядзеньне валюты ЭЗ дало б невялікія эканамічныя выгады. Швэцыя можа трымацца сваёй кроны так доўга, як Вялікая Брытанія — фунта. Але заставацца наагул па-за зонай эўра швэды не плянуюць. Адно што тэрмін далучэньня пакуль не акрэсьлены. Сёньня швэдзкая эканоміка мацнейшая за эўрапейскую. Эканамічны рост у два разы большы, чым у ЭЗ (1,3%), беспрацоўе напалову ніжэйшае. З сваімі грашыма тэмпы эканамічнага росту будуць больш дынамічныя, чым з эўра. Швэды лічаць, што бяз эўра будуць жыць ня горай, чым жылі дагэтуль.

Рэстаўрацыя «Давіда»

«Давіда» Мікеляджэла памыюць дыстыляванай вадой, каб на пяцісотгадовы юбілей (верасень 2004 г.) ён выглядаў як мае быць. Дагэтуль Давіда чысьцілі толькі раз — у 1843 г. Тады для гэтага скарысталі добрую порцыю салянай кіслаты, якая змыла накладзены раней ахоўны слой. Цяпер апроч сьлядоў тае «рэстаўрацыі» на паверхні скульптуры можна адшукаць сьведчаньні амаль 370-гадовага знаходжаньня пад адкрытым небам (1504—1873), слаі воску і вокісі.

Мыць Давіда зьбіраюцца, прыкладаючы яму «кампрэсы» з дыстыляванай вадой. Многія рэстаўратары пратэстуюць: баяцца, каб такі спосаб не нашкодзіў скульптуры, і прапануюць чысьціць яе пэндзьлікамі й замшай.

Адно дзіця за 17 гадоў

Нараджэньне аднаго дзіцяці можа азначаць дэмаграфічны бум. Эмілі Роўз, якая нарадзілася на востраве Піткерн на поўдні Ціхага акіяну, — першае за 17 гадоў дзіця тут. Усяго на востраве 47 жыхароў. Пік населенасьці прыпаў на 30-я (233 чалавекі). Новая жыхарка — нашчадак у дзявятым калене ангельскага марака Флетчэра Хрысьціяна. Ён увайшоў у гісторыю як завадатар гучнага бунту 1789 г. на брытанскім судне «Баўнці». У 1790 г. бунтоўная каманда дасягнула ненаселенага тады вострава, які ляжаў на сярэдзіне шляху з Новай Зэляндыі ў Пэру, і пасялілася там. Піткерн мае 1,6 км у шырыню і 3,2 км у даўжыню.

Наш адказ Шарону

Выхадцы зь Беларусі ў Ізраілі працягваюць ціснуць на ўрад, які старанна разбурае адносіны паміж краінамі. На стол прэм'ер-міністру Арыэлю Шарону лёг ліст з просьбай вярнуць пасольства Ізраілю ў Менск. Бо цяпер ізраільцяне, што наведваюць Беларусь, «пазбаўленыя абароны сваёй дзяржавы ад уладаў дыктатуры». Сабралі ўжо некалькі соцень подпісаў. У асяродзьдзі ізраільскіх беларусаў чуюцца заклікі галасаваць супраць Шарона і ягонай партыі «Лікуд» на чарговых выбарах. Тым часам МЗС Беларусі з 1 верасьня перастала аказваць консульскія паслугі на тэрыторыі Ізраілю. Пасольства Беларусі ў Тэль-Авіве, якое ўзначальвае былы шэф КДБ Генадзь Лавіцкі, згортвае сваю дзейнасьць.

Франц Субель, ВР

Масавасьць

Днямі пачуў у перадачы радыё «Свабода» тэлефанаваньне аднаго грамадзяніна РБ (лепей — «граждана»), які даводзіў, быццам існаваньне апазыцыі — «неабгрунтаваная зьява» і «ніякага расколу грамадзтва ў нас няма», бо «на апазыцыйныя акцыі ходзіць зусім мала людзей». Заежджаная тэма афіцыйных мэдыяў, дый сам Кіраўнік неаднаразова зьвяртаецца да сюжэту пра «кучку», «400 чалавек».

Масавасьць... Я памятаю 7 лістапада недзе ў 84-м. Калёна працоўных цячэ праезнаю часткаю да галоўнае плошчы гораду, гукаўзмацняльнікі пасьля нейкага віншаваньня-вітаньня-закліку прамаўляюць «Ура!». «Ура-а!» — адгукаецца натоўп... Мы з бацькам ішлі па ходніку, у мяне былі два дзіцячыя чырвоныя сьцяжкі, і мне хацелася далучыцца да калёны на праезнай частцы. Пасьля вяртаньня дахаты, памятаю, жаліўся маці, што мы з бацькам ішлі («як лохі» — сказаў бы я цяперашнім слэнгам) не зь людзьмі. «І тата не крычаў «Ура!»...»

Масавасьць... Ужо пры гэтай уладзе ў нашым горадзе «чырвоны мэр» ладзіў дэманстрацыі, увесну й увосень. З абавязковым удзелам прадстаўнікоў усіх працоўных калектываў... (У 96-м газэта «Свабода» пісала, што сярод іншых быў заўважаны транспарант «Слава Богу!».) 7 лістапада 1997 г. ніхто не прымушаў мяне прыходзіць на дэманстрацыю. Проста «па прыколе» нашая адзінаццатая кляса сабралася на плошчы «правадыра». Кульнулі «па пяцьдзясят кропляў» у двары пры плошчы. Падышоўшы да месца дысьлякацыі вучнёўскіх і настаўніцкіх калектываў, убачылі, што на «сьвята» прыйшлі ад нашае 23-е школы толькі мы адны. Ні дырэктаркі, ні завучкі, ні кіраўнічкі створанага ўжо БПСМу... Я ня ўбачыў нічога амаральнага ў сваіх паводзінах, калі ў падабенстве калёны прайшоў перад помнікам і трыбунай, на якой стаяла «адміністрацыя», — зваротны зьдзек зь яе прымяніў, відаць, не адзін я ў той дзень.

Масавасьць... 15 сакавіка 2000 г. настрой у мяне быў зьменлівы. Бо яшчэ пару тыдняў таму мой сябра Павал уцёк у Чэхію праз пераслед за «актыўны ўдзел» у Маршы №1. (У тым Маршы я ня ўдзельнічаў, бо ў Менску ня быў — меў акадэмічны адпачынак. Хоць за дзень да Маршу ў сталіцу завітаў, зайшоў да Паўла ў інтэрнат, але яго не было. «На тваё шчасьце», — потым сказаў ён мне.) Ну дык ісьці ў вольнай калёне менскімі праспэктамі куды больш прыемна, ніж бабруйскімі. Мы крычалі «Жыве!». Наіўныя першакурсьнікі. Тады было 25 тысячаў, казалі...

Масавасьць... «Гражданы РБ» (хацелася б пазьбегнуць ярлыкоў, але ўсё тая стэрэатыпізацыя...) зьмяншаюцца колькасна, набываючы іншую сацыяльную сьвядомасьць. Цяпер яны — «кінутыя» (у слэнгавым сэнсе).

Пачуў у дызэлі размову. Пэнсіянэры вяртаюцца зь леціішчаў. Выпадковыя спадарожнікі. Стары — былы будаўнік. Кабета, на выгляд, працавала на месцы рангам вышэй.

— Ну Вы ж самі — пэнсіянэр, як гэта Вы — супраць Яго?!

А стары высоўвае сваю «гіпотэзу», што вінаватыя, на чале з прэзыдэнтам, усе бюджэтнікі, бо нічога не вырабляюць...

Кастрычніцкі пераварот ажыцьцявілі ня масы, але ён справакаваў іх стыхію. Адзін чалавек сказаў мне, што трэба, «каб пралетары дайшлі хаця б да цырку (будынку), і тады — будуць перамены». Дадзенае заключэньне зьяўляецца ня чым іншым, як вынікам масавае адукацыі. Хоць чалавека гэтага я паважаю і знаходжу карысным на займанай пасадзе. Бо ня бачу годнае замены.

I like living in a totalitarian system? Сам я ў ангельскай ня вельмі, каб хто склаў песьню з такім назовам...

Сяргей Вушакоў, Бабруйск

Дзень нашых сымбаляў

«На сэсіі Вярхоўнага Савету БССР 19 верасьня 1991 г. зацьверджана назва «Рэспубліка Беларусь», а ў скарочаных і састаўных назвах — «Беларусь». У якасьці дзяржаўнага гербу зацьверджаны старажытны беларускі герб «Пагоня», а ў якасьці дзяржаўнага сьцягу — бел-чырвона-белы сьцяг», — так адзначаны гэты дзень у «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі».

Што вывучаюць дзеці ў школах пра гэта? Паглядзім падручнікі.

У дапаможніку У.Сідарцова, В.Фаміна, С.Панова для 9-й клясы агульнаадукацыйнай школы (Менск, 1999) напісана, што была зацьверджана ў гэты дзень дзяржаўная сымболіка, але не сказана якая. На гэтай старонцы змешчана і чорна-белая копія «Пагоні». У сынхранічнай табліцы «Асноўныя падзеі беларускай і сусьветнай гісторыі» (1917—96) пра 19 верасьня нічога не сказана. У храналягічнай табліцы пад гэтым днём падаецца «Закон аб новай назьве нашай дзяржавы — Рэспубліка Беларусь». На ўнутраных вокладках дапаможніка ёсьць згадкі пра 25 сакавіка 1918 г., 1 студзеня 1919 г. і верасень 1991 г.

А зараз пра паралелі на ўнутраных вокладках, так званыя паліндромы, якія падаліся мне цікавымі: першая падзея ў дапаможніку — пераход улады да бальшавікоў, апошняя — выбраньне прэзыдэнта; другая падзея — першы Ўсебеларускі сход, перадапошняя — Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г.; чацьвертая сьпераду — абвяшчэньне незалежнасьці БНР, чацьвертая ад канца — новая назва краіны — Рэспубліка Беларусь; пятая сьпераду — абвяшчэньне БССР, пятая ад канца — Дэкларацыя аб абвяшчэньні сувэрэнітэту БССР; шостая сьпераду — стварэньне Літбелу, шостая ад канца — Чарнобыльская катастрофа; сёмая сьпераду — другое абвяшчэньне БССР, сёмая ад канца — курс на перабудову..., у цэнтры — пачатак індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі.

У дапаможніку тых самых аўтараў для 11-й клясы (Менск, 2001) напісана, што 19 верасьня Вярхоўны Савет зацьвердзіў «Пагоню» і «*фляг* з трыма гарызантальнымі бел-чырвона-белымі палосамі. Аднак многія жыхары Беларусі выказвалі нязгоду з такой сымболікай з прычыны таго, што яна ўжывалася беларускімі калябарантамі».

Бедныя дзеці! Яны часта скардзяцца на дрэнныя падручнікі і маюць рацыю. Прапаную лічыць 19 верасьня Днём нацыянальных сымбаляў Беларусі ды сьвяткаваць яго зь сем'ямі і сябрамі.

Са сьвятам!

Жыве Беларусь!

Міхась Лебедзь, Менск

Мой Арлоў

У кожнага быў такі момант, калі запыленыя двухсотгадовым сном рэцэптары беларускасьці абуджаюцца. Так было і са мной у яшчэ недалёкім 1999-м. Штуршком да Беларушчыны стала хатняе заданьне па літаратуры — апавяданьне Ўладзімера Арлова «Місія папскага нунцыя».

Папярэдняя сустрэча з гэтым пісьменьнікам была ня надта прыемная. Гады за два да таго ты не прачытаў арлоўскага «Часу чумы», які падаўся табе сумнай тарабаршчынай, за што і атрымаў заслужаную «двойку». Гэтым разам ты зноў бы ня браўся за твор празаіка, каб не вырашальная адзнака. «Місія» не далася адразу, даводзілася час ад часу перачытваць незразумелыя сказы, лезьці ў слоўнікі. (Па сёньня ты перакананы, што даваць Арлова на вывучэньне ў школе трэба не раней за 10—11 клясы). Ты быў адзіны з сваёй шостай клясы, хто адолеў «Місію». Вучылка вывела ў журнале запаветную «пяцёрку», а тваё жыцьцё пасьля гэтага твору паціху стала мяняцца. Цябе захапіла постаць Лышчынскага, ты перагартаў шмат кніг, шукаючы інфармацыю пра гэтага бязбожніка. А разам з гэтым ты адкрываў сьвет беларускай мінуўшчыны. Перад табой мільгалі вобразы Гусоўскага, Батуры, Каліноўскага, Грынявіцкага. Пасьля яны паўсталі героямі першай набытай табой сьвядома кніжкі «Сны імпэратара». Кніга была прачытана на адным дыханьні.

Першы нумар «НН», які ты набыў, зьмяшчаў эсэ Арлова «Сьціплыя ўрачыстасьці ў сталіцы». Ты марыў пра спатканьне ў тваёй школе. Сустрэча ў апошні момант была забароненая. А перад тым на канцэрце Сокалава-Воюша ты насьмеліўся падысьці да празаіка, каб паціснуць яго руку, і нават не прадставіўся Арлову. Табе было дастаткова поціску чалавека, што прывёў цябе ў сьвет Беларушчыны. Урэшце ты ўсё ж зладзіў сустрэчу зь пісьменьнікам, але ўжо ня ў школе, а ў каледжы. І калі нехта кажа пра свайго Леніна, Купалу, Коласа, Глёбуса, ты маеш права сказаць: «Мой Арлоў». А сёньня, калі клясык сьвяткуе 50-годзьдзе, табе застаецца толькі далучыцца да віншаваньняў, а ад сябе дадаць: «Дзякуй, Уладзімеру!»

Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўшчына)

Ліцэісты вучацца

Працяг са старонкі 1.

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Заняткі-кансультацыі адбываюцца ў розных памяшканьнях. Хтосьці з выкладчыкаў прымае навучэнцаў у сваёй кватэры (з пачастункам у выглядзе печыва, гарбаты ды напояў «Вяйнянская крыніца»), іншыя — у сядзібах Таварыства беларускай мовы, Партыі БНФ і нават у Чырвоным касьцёле. Саюз пісьменьнікаў арганізаваў у Доме літаратара «курсы для маладых літаратараў» зь ліку ліцэістаў.

Трапіць на заняткі Беларускага ліцэю аўтару гэтых радкоў было нескладана: прыйшоў за некалькі хвілінаў да пачатку ды папрасіўся, каб пусьцілі паглядзець. Балазе зь ліцэістамі, іх бацькамі ды настаўнікамі за тры летнія месяцы пазнаёміўся вельмі добра. Ліцэісты на заняткі не пазьніліся: за месяцы барацьбы пасталелі, таму самі трымаюцца дысцыпліны.

Заняткі ў ліцэі па форме ня розьняцца ад звычайных: тыя ж лекцыі, канспэкты, адказы… Розьніца ад знаёмай усім савецкай і постсавецкай школы — у ліцэйскім духу, які пануе на занятках. Ні ў адной звычайнай школе не пачуеш, каб настаўнік зьвяртаўся да клясы: «Спадарства, прашу хвіліны ўвагі!» Для ліцэю гэта звычайная рэч.

Нормай ёсьць і творчы характар заняткаў. Так, на гісторыі Беларусі, куды я трапіў, трэцякурсьнікі за пяць хвілінаў склалі паўтара дзясятка пэрыядызацыяў нашай гісторыі. Падыходы былі самыя розныя — ад досыць традыцыйных (па дзяржаўнай прыналежнасьці — ад Полацкага княства да Рэспублікі Беларусі) да самых экзатычных: адна ліцэістка прапанавала чатыры пэрыяды (мінуўшчына, сучаснасьць, будучыня і канец сьвету), а яшчэ двое ледзь уклаліся ў дваццаць пэрыядаў (арыентаваліся на знакавых гістарычных асобаў)…

Не ва ўсіх памяшканьнях ёсьць клясная дошка і зручныя для канспэктаваньня сталы. Настаўніца гісторыі Натальля Лойка зазначае: «У ліцэі ў мяне быў абсталяваны кабінэт, усе матэрыялы пад рукой. У сёньняшніх умовах даводзіцца многае тлумачыць толькі на словах». Яшчэ адна праблема — нястача падручнікаў: два малодшыя курсы (8-я і 9-я клясы) забясьпечаныя навучальнымі дапаможнікамі цалкам, а старшым не ўдалося дастаць некаторых кніг: у школьным камплекце бракуе падручнікаў па хіміі, фізыцы, біялёгіі, гісторыі Беларусі. Настаўнікі й бацькі шукаюць неабходныя выданьні сярод сьпісаных у іншых школах, у правінцыйных кнігарнях.

Бацькоў хвалюе і занадта доўгі навучальны дзень: здараецца, кансультацыі ў ліцэістаў сканчаюцца ў 17—18 гадзінаў. Аднак самі навучэнцы не асабліва бядуюць. Трэцякурсьніца Барбара Папова тлумачыць: «У нас бываюць вялікія перапынкі паміж заняткамі — тады можна падрыхтаваць хатнія заданьні. Да таго ж, мы пастаянна пераходзім з аднаго памяшканьня ў другое і пасьпяваем адпачыць паміж заняткамі».

Такога сталаваньня, як у стацыянарнай школе, у ліцэі пакуль арганізаваць не ўдалося — выдаткі «падпольнага навучаньня». Вось і даводзіцца ліцэістам браць з дому «ссабойкі» ды частавацца кавай з булачкамі ў кафэтэрыях.

Ліцэісты не адмаўляюцца й ад вулічных акцыяў. 12 верасьня яны зноў выйшлі да Дому моды на Нямізе з плякатамі «Мы вучымся на вуліцы», «Я люблю ліцэй» і г.д. Міліцыя да навучэнцаў не чапілася, хоць без правакацыяў не абышлося: двое «п'яных» спрабавалі вырваць плякат, але, атрымаўшы адпор, сышлі. І нават не хісталіся.

Аркадзь Шанскі

ВОДГУК

Словы на любоў

Сярод карнавалу тэкстаў на вострую сэксуальную праблематыку («НН» ад 5 верасьня) найбольш зьбянтэжыў артыкул «Сэкс у мове». Выразы «займацца каханьнем» ці «займацца сэксам» у беларускім кантэксьце выглядаюць гэткім жа дзікунствам, як «стаячая машына» ці «нараджаючыся капіталізм». За апошнія 15 гадоў у беларускую гісторыю было вернута мноства імёнаў. Аднак ніхто не вярнуў да жыцьця плоймы старабеларускіх словаў і зваротаў. Злучацца на любоў, любы чыніць (тварыць), мець ложа, узяць да ўлоньня — годныя заменьнікі чужынскіх падпарканных «займалак».

У пэрспэктыве няхепска было б наагул пазбыцца лексэмы «сэкс» ды вытворных ад яе. Вацлаў Ластоўскі прапаноўваў два адпаведнікі да слова «пол» — «плоць» і «плосьць». Другі варыянт мог бы заступіць «sex». Прыметнік — «плосьцевы» («плосьцевы чын» — полавы акт, але «юравабная (юразваблівая) жанка» — сэксуальная жанчына). У таго ж Ластоўскага сустракаем і панятак «клосьціцца» для азначэньня «гэтага дзеяньня». Паводле сваёй экспрэсіўнасьці слова ані не саступае расейскаму «трахаться».

Што да лексычнага абазначэньня полавых органаў, то тут павінна быць разнастайнасьць. Чым даўжэйшыя сынанімічныя шэрагі (пятля, кунька, дзіра, дула, шчоўка, шчалёдка; стамбур, стаўбур, сюрык, баўцель, баўтарэз, агуростак), тым лепей. Аднак трэба вызначыць адну пару словаў у дадатак да «похвы» і «чэлеса». Гэтае месца маглі б заняць лексэмы «потка» (зафіксавана Насовічам) і «пецік» (зафіксавана Дабравольскім; мажлівыя варыянты «пет», «пец»).

Сяргей Балахонаў, Гомель

Рана сьпісваць Пазьняка

Надзвычай цікавы і патрэбны матэрыял «Хто пасьля яго?» быў зьмешчаны ў «НН» №31. Бо ўжо сапраўды настаў час задумацца, што будзе ў краіне пасьля сыходу Лукашэнкі. Да людзей, згаданых у «НН», я дадаў бы яшчэ Сямёна Домаша, які атрымаў значную падтрымку на апошніх выбарах. І нічога страшнага, што Домаш сышоў у бізнэс. Беларусы любяць людзей, якія робяць свой лёс сваімі рукамі, асабліва тады, калі яны дабіваюцца посьпеху. І часовы сыход у цень для Домаша — да лепшага.

Добра, што аўтар улучыў у сьпіс Зянона Пазьняка, чалавека, якога многія ўжо пасьпяшаліся адправіць на палітычную пэнсію. Цяпер Зянон ня мае шанцаў стаць прэзыдэнтам, але, як ні круці, ён адзін з найбольш папулярных палітыкаў Беларусі. За Зянонам па-ранейшаму стаіць рэальная сіла. Можа быць, не такая шматлікая, як на пачатку 90-х, але дзясяткі тысячаў чалавек прагаласуюць так, як скажа Пазьняк. І якраз гэтых галасоў можа не хапіць для агульнай перамогі.

Адась Галубовіч, Барысаў

Уладзімер Някляеў

апавяданьне

Меў Марык бомбу


КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Ён знайшоў яе ў той год, як пайшоў у школу. Плёхаўся ў копанцы, балюча наступіў на нешта, падумаў, што камень, а паднырнуў — бомба! Такая, як яйка з абодвума тупымі канцамі, але рубчастая, цяжкая, чорная-чорная. З аднаго канца нібыта пёрка прылепленае, сарві яго — і кідай бомбу куды хочаш, усё ўшчэнт разьнясе.

— Што ты будзеш рабіць зь ёй? — спалохана спытала Рыма, якой Марык паказаў бомбу ў іхняй схованцы, абваленым бліндажы за вёскай. Адсюль пачыналіся арэшнікавыя пагоркі, за імі зубчастым, зламаным небасхілам сінеў лес, а што было за лесам — ні Марык, ні Рыма ня ведалі. Казалі, што горад.

— Узарву, — сказаў Марык зацята, як пра штосьці канчаткова вырашанае. — Пачнецца зіма, стануць паліць у школе, кіну ў грубку — і ўсё ўшчэнт.

Яму ня глянулася школа зь першага дня, а з дня другога ён ужо ненавідзеў яе, заганяў сябе ў кляс сілком, б'ючы кірзавым, пашытым з вынашаных ботаў ранцам самому сабе пад калені. Яго трэсла ад настаўніцы Зінаіды Раманаўны, рыжай, з жоўтымі зубамі, якая тыцкала пальцам у буквар і працяжна, як плачуць, даводзіла: «Гэта літара *А*, зь яе пачынаецца слова *аловак*, а дзе яшчэ ў гэтым слове літара *А*... вось яшчэ літара *а*, толькі не вялікая, а маленькая, літары бываюць вялікія і маленькія, як і людзі, ты зразумеў, Марык... вось тваё імя напішам на дошцы, дзе ў ім літара *а*... хіба няма ў ім літары *а*?.. няма, дык закрэсьлім, тады ты Мрык нейкі, а ня Марык... і ў цябе *ловак* нейкі, а не аловак, калі адкінуць *а*, першую літару, бачыш, як многа кожная літара значыць...»

«Карова ты рыжая, — глядзеў на Зінаіду Раманаўну Марык, — пачакай, няхай толькі грубку запаляць».

Зінаіда Раманаўна нібыта ўгадвала ягоныя думкі і казала: «Ідзі ў кут. І ня рухайся ў куце, стой так, як цябе ў кут паставілі».

Можа, Зінаіда Раманаўна была і не з найгоршых цётак, проста цётка-настаўніца, толькі яна мела ўладу над Марыкам такую, якая рабіла яго роўным і аднолькавым з Рымай і ўсімі дваццацьцю чатырма першакласьнікамі. У іх гурце Марык дзяліўся як адзін на дваццаць чатыры, і гэтаксама дзялілася ягонае імя, і нават маленькая літара *а* ў ягоным імені таксама дзялілася на дваццаць чатыры. З гэтага гурту, што называўся клясам, нельга было вылучыцца інакш, як падымаючы руку ў адказ на пытаньні Зінаіды Раманаўны. А яна яшчэ глядзела па шэрагах, узважвала, вылучыць цябе ці не, і амаль ніколі не вылучала, не давала такой мажлівасьці, калі бачыла, што якраз цяпер ты ведаеш нешта, каб вылучыцца. Затое ніводнага разу не прапускаўся выпадак прынізіць цябе, бездапаможнага ў няведаньні, нямога, як рыбіна. «Наступным разам бацьку прывядзеш, пара ўжо зь ім пагаварыць пра цябе, пара». Хоць з бацькам штодня на вуліцы бачылася — і нічога яму не казала.

На зіму запалілі ў школе, але бомбу ў грубку Марык не падкінуў.

Пасьля інстытуту ён ажаніўся з Рымай, хоць яна раздражняла яго, балбатлівая, заўсёды зьдзіўленая і з таго, што дождж ідзе, і з таго, што сьнег. У жыцьцёвай мітусьні не было на яе ніякага спыну, тут яна прыхоплівала ўсё, што магла прыхапіць, каб мець асалоду пра ўсё сказаць — *маё*: мая хата, мой дыван, мой Марык. Гэтае *мой Марык* да яго нават нечым накшталт мянушкі прыляпілася, як тое пёрка да бомбы. Сяброўкі Рыміны, калі па тэлефоне званілі, пыталіся: «Алё, гэта хто, *Моймарык*?»

Аднойчы ён адчуў, што жыць так болей ня можа, паехаў у вёску і прывёз адтуль сваю бомбу. Рубчастую, чорную-чорную... Доўга насіў яе з кута ў кут па кватэры — схаваць не было куды. Тут пазваніла ў дзьверы, вярнуўшыся са школы, дачка Зіна, і Марык таропка заштурхаў бомбу пад шафу, запхнуў яе венікам да самай сьцяны.

Рыма пасьля інстытуту выкладала ў пачатковых клясах, дачка пачала вучыцца ў яе. «Зайшоў бы, паглядзеў, як вучыцца, усё ж бацька», — адразу ж пачала тузаць Рыма, і Марык зайшоў, паглядзеў. Рыма вісела над дачкой, тыцкала ў буквар пальцам і працяжна, як плачуць, даводзіла: «Гэта літара *А*, зь яе пачынаецца слова *аловак*, а дзе яшчэ, пакажы, дзе яшчэ ў гэтым слове літара *А*... вось яшчэ літара *а*, толькі не вялікая, а маленькая, літары бываюць вялікія і маленькія, як і людзі, ты зразумела, Зіна... вось тваё імя напішам на дошцы, дзе ў ім літара *а*?..»

Быў пачатак восені, было сонечна, празрыста-прасторна — і ў той дзень Марык не пайшоў дахаты, піў з кім папала ў прывакзальным буфэце, бо школа была побач з вакзалам, і застаўся на вакзале начаваць. Уночы яго забралі ў міліцыю, у выцьвярэзьнік. Уранку пазванілі Рыме, каб прыйшла, заплаціла штраф, а то ў мужыка, калі ён мужык, не засталося ні капейчыны, усё прапіў. Рыма ў міліцыю не пабегла: «Рабіце зь ім што хочаце, з кім піў, хай тыя за яго і плацяць». Ёй нібыта ў асалоду было, што ён напіўся і патрапіў у міліцыю, зраўняўся з усімі мужыкамі — і ў яе цяпер такое ж гора, як і ва ўсіх астатніх баб.

Дачка, ледзь пасьпеўшы скончыць школу, выскачыла замуж за вайскоўца, якому заўсёды было дзе служыць, але ніколі не было дзе жыць. Праз тое ўнук Уладзік гадаваўся ў дзеда з бабай, Марык да яго прывык і, калі зяця паслалі ў Аўганістан, быў нават узрадаваўся. Ну, можа, ня тое каб узрадаваўся, але пра нешта такое падумаў.

Калі зяця забілі, дачка павесілася.

Неяк унук гуляўся з тэнісным мячыкам, той закаціўся пад шафу. Уладзік стаў даставаць яго ракеткай, раптам нешта загрукатала — і з-пад шафы выкацілася бомба, уся ў сівым павуціньні.

— Дзеда, што гэта? — пацягнуўся да бомбы Уладзік, але Марык перахапіў ягоную руку.

— Не чапай, бомба выбухне!.. Ідзі на вуліцы пабегай, Уладзік.

Марык асьцярожна абіраў з бомбы павуціньне — і яму ўспаміналася ўсё ягонае жыцьцё: школа, жаўтазубая настаўніца Зінаіда Раманаўна, інстытут, вясельле з Рымай, п'янка на вакзале, вясельле Зіны, радзіны Уладзіка... «Някепскае, урэшце, жыцьцё, ня з горшых, — думаў Марык, ківаючы сам сабе галавой, — дачку толькі шкада, магла б жыць, дурніца...»

Раптам Марык злавіў сябе на тым, што ня можа ўспомніць твар дачкі, стаў падымацца, каб перагартаць фатакарткі ў альбоме, і, ня ведаючы, куды падзець бомбу, зноў закаціў яе пад шафу, якую прывезьлі некалі ў пасаг бацькі Рымы. Шафа была дубовая, вялізная, непад'ёмная — і яе ня рухалі: яна стаяла і стаяла ў куце так, як яе ў кут паставілі.



Новы «ARCHE»

Ліпень-жнівень

Палітолаг Андрэй Казьвіч аглядае выдадзеныя сёлета тры кнігі пра палітыку — «Тот самый Климов» Яўгена Агурцова, «Работа над ошибками» Васіля Лявонава і нашумелае «Нашествие» Ўладзімера Мацікевіча. У сталай рубрыцы «Круглы стол» Ян Запруднік, Генадзь Цыхун, Аляксандар Старыкевіч намячаюць шляхі збліжэньня «тарашкевіцы» і «наркамаўкі». Павал Абрамовіч крытыкуе скандальны дзёньнік Вячаслава Адамчыка і ягоных публікатараў. Адкрываюць нумар кароткія рэфлексіі Славаміра Адамовіча, Валянціна Акудовіча, Алеся Анціпенкі, Юр'я Пацюпы, Веры Рыч, Яўгена Сьверсьцюка, Максіма Шчура і Сяргея Шыдлоўскага з нагоды сьмерці Васіля Быкава.

Тэмаю нумару стала Чэхія. Вацлаў Гавал, Ян Максімюк, Наталя Прыступа, Сяргей Сматрычэнка, Бржэціслаў Данчак і Ігар Карашчанка разважаюць над адметнасьцямі чэскай культуры, палітыкі, эканомікі, этнаграфіі і кулінарыі. Міхал Вівэг, Мілаш Урбан, Іржы Кратахвіл, Яхім Топал даюць уяўленьне аб сучаснай чэскай літаратуры.

Сьвежы «ARCHE» прадаецца ў кіёсках «Белсаюздруку», кнігарнях аб'яднаньня «Белкніга» і ў незалежных распаўсюднікаў.

«ARCHE»

/ НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ /

Анішчанка Я. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. — Менск: Хурсік, 2003. — 470 с. 200 ас.

Аўтар піша пра закулісныя пляны Расейскай імпэрыі адносна земляў Вялікага Княства, паказвае ваганьні беларускай шляхты, спробы заканадаўчымі мэтадамі ды зброяй выратаваць дзяржаўную самастойнасьць. Пытайцеся ў «Акадэмкнізе». Цана 16500 руб.

Грыбоўскі Ю., Козак К. Забытыя жаўнеры Польскага войска ў часы другой сусьветнай вайны: Матэрыялы і ўспаміны / Польскі ін-т у Менску; Гістарычная майстэрня ў Менску. — Менск, 2003. — 192 с.: іл. 300 ас.

Дасьледаваньне прысьвечанае службе беларусаў у Войску Польскім (1939—46 г.). У кнізе ёсьць успаміны й нататкі былых польскіх вайскоўцаў — удзельнікаў верасьнёвай кампаніі 1939 г., Арміі Краёвай і арміі Андэрса.

Лакотка А. Драўлянае сакральна-манумэнтальнае дойлідзтва Беларусі. — Менск: Беларусь, 2003. — 224 с.: іл. 2500 ас.

Вядомы знаўца беларускай архітэктуры разглядае кампазыцыйна-будаўнічыя асаблівасьці ды гісторыю драўляных храмаў — цэркваў, касьцёлаў, мячэтаў, сынагогаў, а таксама драбнейшых збудаваньняў — каплічак, званіцаў. Кніга багата ілюстраваная. У буйных менскіх кнігарнях каштуе 5000 руб.

Лепешаў І. Чаму мы так гаворым: Даведнік / Гарадзен. дзярж. ун-т імя Я.Купалы. — Горадня, 2003. — 155 с. 200 ас.

У даведніку разглядаецца паходжаньне і гісторыя функцыянаваньня ў мове больш як 400 фразэалягічных адзінак. Асобную частку даведніка складае альфабэтны сьпіс «Словы, якіх няма ў слоўніках». Пералік гэты зусім невялічкі, але нават яго дастаткова, каб зразумець, наколькі істотна лексыкаграфія адстае ад сучасных моўных працэсаў. Дзіўна бачыць у сьпісе «неадаптаваных літаратурнаю моваю» лексычных адзінак словы кшталту *апантанасьць, нататнік, сярэднявечча, шапік* ды інш. У «Акадэмкнізе» выданьне каштуе 4800 руб.

Царква. — 2003. — № 2 (37).

Чарговы нумар берасьцейскага грэка-каталіцкага выданьня «Царква» прапануе матэрыялы, прысьвечаныя сьвяту Пятра й Паўла, у прыватнасьці — пастырскае слова Апостальскага Візытатара для грэка-каталікоў Беларусі Сяргея Гаека. На старонках выданьня зьмешчаныя таксама навіны хрысьціянскага сьвету, артыкулы па гісторыі Уніі ў Беларусі, нататкі пра парафіяльнае жыцьцё берасьцейскіх грэка-каталікоў ды інш.

Kruczkowski T. Polacy na tle historii i codziennośći. — Слонім, 2003. 2000 ас.

Аўтар кнігі — старшыня Саюзу палякаў Беларусі. Сваю працу Кручкоўскі прысьвяціў «усім палякам, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі і адчуваюць сябе палякамі».

Symaniec Virginie. Le thйвtre en Biйlorussie (fin du XIXe siйcle — annйes 1920). — *Paris: l'Harmattan, 2003. — 316 с.*

Заерко А. Побеги из ада. — Санкт-Петербург: Невский простор, 2003. — 302 с. — (История истребления белорусского крестьянства). 500 ас.

Аўтар кніг «Тюрьмы Беларуси» ды «Кровавая граница» сабраў калясальную колькасьць сьведчаньняў пра пэрыяд 1920—30-х гадоў. Суразмоўцамі дасьледчыка сталі сотні старых, каля 500 зь якіх сёньня ўжо памерлі. Зьмест кнігі склалі 34 жыцьцёвыя трагедыі: абвінавачаньне ў кулацтве, высылка ў маланаселеныя раёны СССР, нечалавечыя ўмовы жыцьця й працы ў «спэцпасёлках» ды, нарэшце, уцёкі, поўнае небясьпекі вяртаньне на радзіму, вечны страх быць выкрытым. Пра свой лёс распавядаюць беларусы — ахвяры «клясавай барацьбы». Кожны з гэтых людзей мог бы стаць героем быкаўскай «Аблавы». Кніга зьмяшчае таксама мапу маршрутаў, якімі ўцекачы дабіраліся да Беларусі. У «Акадэмкнізе» выданьне каштуе 5600 руб.

Ярмусик Э. Католический костёл в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939—1945 гг.). — Горадня, 2002. — 240 с. 170 ас.

Сярод іншых аспэктаў дзейнасьці Касьцёлу раскрываюцца стасункі Касьцёлу ды камсамолу напярэдадні вайны, паказаныя спробы стварэньня беларускага аўтакефальнага Касьцёлу. У «Акадэмкнізе» выданьне каштуе 6000 руб.

Тацяна Барысік. Гаркну ў бліскучы мацюгальнік: Вершы. — Асіповічы: Асіповіцкі інфармацыйны цэнтар, 2003. 15 ас.

Паэтка, што сталася сёлета адкрыцьцём Аршанскага паэтычна-бардаўскага фэсту, прэзэнтуе сваю кніжку. Вострасацыяльнасьць (паэтка працуе сацыяльным пэдагогам у вясковай школе) і вобразнасьць, пэсымізм і лірыка («Прынясі мне скрыначку запалак,// Я збудую дом для чарцяняці»), мноства розных непрычасанасьцяў. Паэтка не баіцца выходзіць за межы свайго «я».

Тацяна Вабішчэвіч, Андрэй Мялешка

Зьміцер Бугаёў:
Мяне Лысая гара дагэтуль корміць

«Быў час, быў век, была эпоха...» — звыкла паўтараем мы славуты радок «Сказу пра Лысую гару». Пра тое, як насамрэч адбываліся падзеі, апісаныя ў паэме, карэспандэнту «НН» распавядае адзін з герояў «Сказу» — прафэсар-літаратуразнаўца Зьміцер Бугаёў.


АЛЕСЬ ПЫЖЕВІЧ

Навуменка зламаў дах

«НН»: Як пачыналася будаўніцтва на Лысай гары?

З.Б.: Выдзеліць пісьменьнікам участкі загадалі з Масквы. Машэраў быў супраць: маўляў, пісьменьнікі падхопяць «вірус уласьніцтва», як гэта тады называлася. Разбагацеюць, абмяшчаняцца, будуць менш духоўнымі. Ён баяўся, што мы пра камунізм забудзем, — трохі ідэалістам быў... Але паступіў загад з Масквы — і выдзелілі дачы. А гэтыя дачы дапамагалі выжываць. Я й дагэтуль там высаджваю бульбу, якую і сам ем, і сына з дачкой забясьпечваю.

«НН»: У «Сказе» пра Вас гаворыцца:

І Бугаёў, хоць быў вядомы
Як летуценьнік-кніжкаед,
Аднак ня меншую стадолу
На ўскрайку выстукаў усьлед.

З.Б.: Усё дакладна, у паэме шмат чаго апісана абсалютна дакладна. Калі пра Александровіча напісана, што ў яго крыніца прабілася ў падвале, — так і было. Калі сказана, што Фёдар Куляшоў прыхапіў лапік лесу, паставіўшы за межамі выдзеленых яму сотак хату, — дык і гэта было... Мне дастаўся ўчастак на ўскрайку, бо лепшыя раней цішком расхапалі тыя, хто й не належаў да Саюзу пісьменьнікаў. А я даведаўся пра тое, што дзеляць участкі, праз год — нават сябры не казалі. Паставіў ладную хату — фінскі дом. Тады не дазвалялася ставіць дамы зь бярвеньня — толькі з дошак (каб нельга было зімой адпачыць на тым участку). А мой быў абшаляваны дошкамі, але цёплы, нават зімаваць можна.

«НН»: А як яшчэ партыя «дбала пра духоўнасьць»?

З.Б.: Простым савецкім грамадзянам можна было мець толькі чатыры соткі, вышыня дома ад зямлі да вільчыка магла быць толькі тры мэтры. Не дазвалялася рабіць суцэльны фундамэнт, а толькі з слупкоў. Нельга было рабіць двухсхільныя («зламаныя») дахі — толькі аднасхільныя.

Але наш пісьменьніцкі каапэратыў гэтыя абмежаваньні закранулі мала: у нас быў Іван Навуменка, які ўжо і тады меў падтрымку ў высокага начальства. Ён першым «паламаў» страху і сказаў: «Хлопцы, рабіце так і вы. Калі што — у ЦК я пайду». І мы паставілі нармальныя хаты, я сабе ў доме нават другі паверх дабудаваў. Нам абышлося, а ў іншых і мералі вышыню ад зямлі да вільчыка...

Працягі ды расьцягі

«НН»: Як успрымалі паэму сучасьнікі?

З.Б.: Паэма выклікала вялікую сэнсацыю. Яна ўспрымалася як новае, сьмелае, вясёлае слова. Цікавасьць да яе была незвычайнай: яе цытавалі, перадрукоўвалі, таксісты ў Маскве прадавалі рукапісныя копіі па тры рублі — па тых часах бутэлька гарэлкі!

Зацікавіў твор найперш тым, што згадваліся знаёмыя асобы. Да таго ж — з гумарком: пра каго больш зьедліва, пра каго — менш. Зьедлівасьць у дачыненьні да «сяброў па літаратуры» вельмі падабалася тым, каго закраналі менш. Тут прыдаецца характарыстыка беларусаў, якую даў Віктар Каваленка: беларусу трэба, каб у яго было ўсё добра і каб яшчэ ў суседа карова здохла... Тады ён будзе зусім шчасьлівы.

Найперш паявілася першая частка — 33 старонкі, аддрукаваныя на тонкай папяроснай паперы. Пазьней ужо зьявіліся дадатковыя разьдзелы — «Мужчынскі страх», «Пудзілы» і «Вялікі рух». Яны больш пацяшальныя за папярэднія і — слабейшыя. І хутка пасьля зьяўленьня паэмы ўзьніклі розныя працягі, падробкі, пераважна бяздарныя.

«НН»: Таксама пра пісьменьнікаў?

З.Б.: Было і пра пісьменьнікаў — «Роздум ля параднай брамы». Антон Адамовіч назваў гэты разьдзел не працягам, а расьцягам паэмы. Быў знойдзены прыём, дык паводле ўзору і графаман можа рыфмаваць!

Ёсьць дадатак на дваццаць два радкі пра нібыта «выдатнага», а на самай справе практычна зусім слабога, але непамерна прэтэнцыёзнага дасьледчыка Шаўцова, які, маўляў, толькі й можа знайсьці аўтара паэмы. Ня ведаю, хто яго напісаў: мог і Бялевіч, мог і Астрэйка... Гэты Шаўцоў быў загадчыкам рэдакцыі мастацкай літаратуры ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», усе пісьменьнікі да яго насілі свае кніжкі — дык нехта, хутчэй за ўсё па ягонай просьбе, і дапісаў дагодлівую лухту пра незвычайныя дасьледчыцкія здольнасьці гэтага дзівака. Як дасьледчык той Шаўцоў быў вядомы сваімі выдумкамі. Гэта ён даказваў, нібыта ягоны дзед Яўхім Крупенька — нашчадак зьбеглага зь Сібіры дзекабрыста й аўтар «Тараса на Парнасе» ды «Энэіды навыварат».

І пазьней была цэлая куча перайманьняў розных аўтараў на розным узроўні — і пра Міністэрства культуры, і пра ўсё на сьвеце. Розных варыянтаў да чорта! Барыс Сачанка казаў, што ў яго тых варыянтаў зь дзясятак. А па руках хадзіла такая лухта, што ўсур'ёз ужо і не ўспрымалася.

> Партыя дбала пра духоўнасьць. Простым савецкім грамадзянам можна было мець толькі чатыры соткі, вышыня дома ад зямлі да вільчыка магла быць толькі тры мэтры. Не дазвалялася рабіць суцэльны фундамэнт, а толькі з слупкоў.

Манэўры Машэрава ды Кузьміна

«НН»: З апошняй рэдакцыі «Сказу», якую Ніл Гілевіч надрукаваў у «Народнай волі», зьнікла знакавая страфа пра стаўленьне мяшчанаў да беларускае мовы:

Калі б іх партыя хоць зрэдку
Не асаджала пугаўём,
Дык без загаду, без дэкрэту
Глынулі б бедную жыўём.

Сёньня аўтары кажуць, што гэта была «адчэпная» страфа. Ці шчырыя яны тут і наколькі шчырыя былі тады?

З.Б.: Ну, хіба мы ня ведалі, хто насамрэч кіруе ў краіне? Хіба хто сумняваўся, што гэта з партыйнай ініцыятывы зьявіўся загад, каб беларускую мову ў школах вывучаць па жаданьні бацькоў? А нават замежная мова вывучалася ў абавязковым парадку.

«НН»: А як ставілася да паэмы кіраўніцтва БССР?

З.Б.: Машэраў быў перш-наперш партыйным функцыянэрам. Тое, што цяпер зь яго робяць ідэальнага героя, — гэта ўсё лухта! Але ён усё ж быў разумны й імкнуўся паказаць, што ў нас усё спакойна — ня так, як у іншых рэспубліках. Ва Ўкраіне дысыдэнты і суды, у Расеі дысыдэнты і суды, а ў нас — ціха, мы з усімі праблемамі, маўляў, спраўляемся. Знайшлі ў Акадэміі дысыдэнтаў, паўшчувалі, але, прынамсі, у турму не пасадзілі.

Дакладна вядома, як на зьезьдзе пісьменьнікаў Анатоль Вялюгін падышоў да Машэрава і сказаў: «Пётар Міронавіч, я гэтай паэмы не пісаў». А Машэраў адказвае: «Анатоль, чаго ты адмаўляешся? Гэта ж харошая паэма». То ён зрабіў выгляд, што ў паэме няма нічога страшнага: сьмяюцца пісьменьнікі зь сябе — і хай сьмяюцца!

«НН»: Мікола Аўрамчык у сваім артыкуле («Дзеяслоў» №4) згадвае сакратара ЦК Кузьміна...

З.Б.: Гэта былы вайсковы лётчык, у яго была рэпутацыя ня самага артадаксальнага з цэкоўцаў. Ён паспрыяў Алесю Адамовічу, Васілю Быкаву дый да іншых пісьменьнікаў ставіўся памяркоўна. Аднаго разу ў нас было выязное паседжаньне прэзыдыюму праўленьня Саюзу пісьменьнікаў у Магілёве. Па дарозе назад Кузьмін прапанаваў надрукаваць «Сказ». (Ня думаю, што сапраўды ён хацеў друкаваць, — хутчэй пробны шар запускаў.) Дык большасьць пісьменьнікаў, тыя, якія там паказаныя ў сатырычным сьвятле, закрычалі: «Не, мы ў суд будзем падаваць!» Кузьмін быў задаволены, што ён аказаўся большым дэмакратам, чым некаторыя пісьменьнікі.

Прапаноўваў надрукаваць «Сказ...» і Машэраў, калі езьдзіў зь пісьменьнікамі на Нарач. Але я абсалютна перакананы, што гэта былі толькі манэўры кіраўнікоў Беларусі.

Гутарыў Зьміцер Дзядзенка

АЛЕСЬ РОДЗІН

Малюнкі на шпалерах

Беларусь цікавіць нямецкіх мастакоў. Б'янка Флегель з бэрлінскага мастацкага цэнтру «Тахелес» ехала сюды, нутром адчуваючы, што тут «нешта ёсьць». Гэтым «нечым» сталі нашыя шпалеры. Усе яе творы «беларускага пэрыяду» выкананыя на гэтым матэрыяле. Здавалася б, што можа быць больш вульгарным і пачварным за шпалеры, якімі (абсалютна аднолькавымі) абклееныя сьцены нашых аднолькавых кватэраў. Б'янка не пагаджаецца: «Яны такія прыгожыя!» З сабой у Бэрлін яна забрала цэлыя скруткі размаляваных шпалераў (зьбірала ў сяброў і знаёмых рэшткі, якія застаюцца пасьля рамонту).

Мастачка прабыла ў Беларусі два месяцы. Працавала ў майстэрні Алеся Родзіна, які перад гэтым паўгоду прабыў у Бэрліне. Наведвала лецішчы мастакоў. Траціну ўсяго часу бавіла на прыродзе, якая ёй спадабалася больш за ўсё ў Беларусі. Асабліва зачаравалі мастачку разнастайныя жужалкі. «Я люблю інсэктаў, люблю іх маляваць, мне падабаюцца гукі вашай прыроды, я хачу іх нават запісаць», — кажа Б'янка. Мастачка наведала Мір, Заслаўе, іншыя беларускія гарады, назвы якіх яна ня можа вымавіць.

Зь беларускім мастацтвам яна пазнаёмілася ў 2001 г., калі ў «Тахелесе» выстаўляліся беларусы. Тады яе зьдзівіла, як шмат мастакоў працуюць у акадэмічнай манеры. «Тэхнічна ў вас вельмі добрая школа. Ваша мастацтва мае вялікі патэнцыял, хаця гэты акадэмізм трошкі несвабодны. Але keep smiling — не журыцеся».

Папярэднік Б'янкі — нямецкі фотамастак Андрэас Штраўс — працаваў у Беларусі ў красавіку. 22-гадовы хлопец прыехаў зь Нямеччыны на матацыкле. Ён лічыў, што гэта яго абавязак — дабрацца да Беларусі ня надта камфартабэльным спосабам. Штраўс падаўся адразу ў Гомельскую вобласьць — фатаграфаваць у больніцах анкалягічных хворых. Даехаў матацыклам да самай «зоны», дзе яго разьвярнулі.

«Для зьмены мастацкай сытуацыі такія абмены даюць больш, чым дасягненьні асобных творцаў», — кажа куратар беларусканямецкага абмену Яўген Шунейка. Ён шкадуе, што няма такіх абменаў зь іншымі краінамі, з той жа Польшчай: «У стасунках з Варшавай у нас занадта шмат прозы. Ёсьць усталяваныя стэрэатыпы, што польскае мастацтва — гэта тое і тое. А немцам цікава адкрываць гэта невядомае мастацтва ў цэнтры Эўропы».

Вераніка Дзядок

Як у кіно

Віталь Шлапакоў, 18-гадовы студэнт-будаўнік Магілёўскага ўнівэрсытэту, скраў галаўную машыну картэжу сьпікера расейскай Думы Генадзя Селязьнёва. Ледзьве начальнік магілёўскага ДАІ выйшаў з свайго BMW-525, як нецьвярозы Шлапакоў (аналізы сьведчаць — выпіў каля 200 грамаў гарэлкі) сеў у машыну і паехаў. Каб яго злавіць, пагоня страляла па колах; «БМВ» разьвярнула і ў выніку ударыла ў слуп аўтамабіль «Ніву», што была на дарозе (без ахвяраў). Шлапакоў усяго толькі паспрачаўся зь сябрамі, што скрадзе машыну. Такія гарачыя студэнты вучацца ва ўнівэрсытэце, якім данядаўна кіраваў міністар адукацыі Аляксандар Радзькоў.

Прэм'ер Сяргей Сідорскі звольніў «па ўласным жаданьні» прэсавага сакратара і зьліквідаваў інфармацыйную ўправу пры Саўміне. Цяпер ні грамадзтва, ні журналісты інфармацыі аб дзейнасьці міністраў не дачакаюць. Сідорскаму ды жыць бы ў годзе 1977-м.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Яшчэ адзін работнік беларускай «вэртыкалі», самай эфэктыўнай і чэснай сыстэмы ўлады на сьвеце, трапіў у СІЗА. **Аляксандра Сасноўскага**, старшыню гарвыканкаму Бярозаўкі, вінавацяць у атрыманьні 1500 даляраў хабару. Гэтулькі, нібыта, заплаціў яму прадпрымальнік за права набыць нерухомасьць па заніжанай цане.

Аўтар вершу «Абяшчаў, абяшчаю, буду абяшчаць», за публікацыю якога пацярпела «Пагоня», выйшаў на сувязь. Ён гаварыў з Маркевічам і Мажэйкам падчас «гарачае лініі», зладжанай гарадзенскай газэтай «Биржа информации». Паэта не назваўся, толькі павініўся перад журналістамі. Але тыя на яго злосьці не трымаюць. Парад ананімных аўтараў працягваецца.

Добры чалавек бяз працы ня будзе. Гэтая ісьціна знайшла пацьверджаньне ў Горадні, дзе **Мікола Маркевіч** узначаліў гарадзкую арганізацыю ТБМ. Бліжэйшыя пляны — стварэньне беларускамоўных клясаў, спагнаньне складак зь сяброў арганізацыі, аднаўленьне беларускамоўнага выданьня ў Горадні.

Чэрыза Макубале, 24-гадовая жыхарка Замбіі, атрымала ад роднае ўлады дыпляматычны пашпарт. Гэта дадатковая ўзнагарода за перамогу ў першым афрыканскім reality show (каб пераможца магла прапагандаваць краіну ў сьвеце). Аснноўны ж прыз — 100 тыс. даляраў. Тэлешаленства — і ў Афрыцы тэлешаленства.

Прынцэса замужам за акрабатам

AFP

Прынцэса Манака Стэфанія выйшла замуж за партугальскага акрабата, на дзесяць гадоў маладзейшага. Апроч княства, 38-гадовая нявеста прынесла цыркачу ў пасаг траіх дзяцей: раней яна была замужам за сваім целаахоўнікам.

Арнольд Шварцэнэгер губэрнатарам Каліфорніі пакуль ня стане. Выбары зь яго ўдзелам адкласіся на няпэўны тэрмін. Выявілася, што ў штаце састарэлая сыстэма падліку галасоў, якая працуе з пэрфакартамі. Яе будуць мяняць на электронную аж да сакавіка. Лепей выклікалі б Лазавіка…

СМ

КРЫЖАВАНКА



НА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. Другі беларускі касманаўт. **6.** Роды ў каровы. **7.** Дурань, асталоп. **9.** Самы дробны друкарскі шрыфт. **10.** Туды маленькага Хрыста клалі. **12.** Ён зьяўляецца на сьценках пасудзіны, у якой доўга кіпяцяць ваду. **15.** Мера масы каштоўных камянёў. **16.** Хвароба, падчас якой моцна сьвярбіць скура, яшчэ гэтак называюць прычэплівага чалавека. **18.** Канкурэнт кантактных лінзаў. **19.** Штат на поўначы ЗША. **20.** Азбука, якую стварылі Кірыла і Мятод. **22.** Амэрыканка, дзеля якой брытанскі кароль Эдвард VIII выракся трону. **23.** Лёгкі летні абутак, вядомы з старажытнагрэцкіх часоў. **24.** Маленькая модная крама. **26.** Архітэктурны стыль, у якім збудаваны ДК прафсаюзаў у Менску. **29.** Амэрыканскі тхор, здольны выдзяляць вельмі сьмярдзючы сакрэт. **31.** Легендарны зьніклы востраў. **32.** Шматструнны музычны інструмэнт. **33.** Кока-…. **34.** Рыба-паразыт, якая прысмоктваецца да большае рыбіны і харчуецца рэшткамі здабычы «гаспадара».

НА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Ён чысьціць ветравое шкло. **2.** Вялікая марская птушка, рыфмуецца з словам «матрос». **3.** Трохскладовы вершаваны памер, якім напісаны Купалаў «Курган». **4.** Амэрыканскі актор, які ў рэмэйку «Салярысу» замяніў Данатаса Баніёніса. **5.** Горад, ад якога пайшоў адэкалён. **6.** Збажына, якую любяць коні і мядзьведзі. **8.** Ветлівы зваротак да жанчыны. **10.** Мяса. **11.** Прэм'ер-міністар БНР. **13.** Ён зьвязвае агурок з родным карэньнем. **14.** Настрадамусаў калега, чый псэўданім перакладаўся як «чорны павук». **17.** Доўгі адростак нэйрону. **18.** Папулярны ў савецкі час азэрбайджанскі ВІА, названы ў гонар ракі. **21.** Самастойнасьць. **24.** Адна балерына, дзьве балерыны, дзесяць …. **25.** Ваяр з Крымскае арды. **27.** Выбуховы снарад, а таксама выраз твару. **28.** Кітайскі ды ўйгурскі пяціструнны шчыпковы музычны інструмэнт, сваяк бандуры і цымбалаў. **29.** Ён ладзіў дуду з Грышкам. **30.** Брута — «агульная», «…» — чыстая.

Склаў Сяргей Петрыкевіч

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАНЬНІ

Сяргея Дубаўца — з Народзінамі! Прыватны чалавек

Сям'ю Ясюкоў з нараджэньнем Наталькі. Янку й Аленку — з дачушкай. Паказала броду да добрага роду. Пушкіны

Яўгена Бельскага віншую з Днём народзінаў! Гадуйся на радасьць бацькам ды Радзіме! Усяго-ўсяго! Міхась Лебедзь

Вітаю Юлю Б., Паліну Г. і ўвесь 610-ы. Жыве Беларусь! Жывем мы! Сяргей Г.

Віншую сп.Антося Мядзьведзкага з Днём народзінаў. Хай паўторыцца тое, што было з намі 6 верасьня.

Малады Фронт віншуе гарадзенскага маладафронтаўца Паўла Мажэйку з поўнай свабодай! Менскі МФ

На фэсьце пад Воршай Малады Фронт быў найлепшы! Таня Барысік і Паша Красоўскі — вы проста супэр! К.Астроскі

КАНТАКТЫ

Беларускамоўная дзяўчына (18 гадоў) шукае хлопца для супольных паходаў у тэатар, на канцэрты. Т.: 273-96-74

У в.Сьвіслач (Магілёўская вобл.) будзе ладзіцца прыбіраньне замчышча XI ст. Чакаем усіх 21 верасьня а 14.00. Начлег гарантуецца. Праезд на цягніку Асіповічы — Магілёў да ст.Ялізава. Т.: (02235) 29-8-46

Прадаецца лабрадор, самец, 1,5 гады, колер чорны, прызёр міжнародных выстаў. Т.: 275-40-92

Шукаем Прысутнага, каб набіць морду за паклёп на сьвята. Віктар Сьцяпанаў, Генадзь Шэпелеў, Сяржук Шынкевіч, Яўген Шчэрба

Вы можаце дапамагчы выданьню новага ліцэйскага кампакт-дыску. Будзем вельмі ўдзячныя за вашую падтрымку. Т.: 8-0296-11-16-02, 8-0296-68-58-21

Набуду этыкетку гарэлкі «Князь» прадукцыі Гомельскага ЛГЗ 1997—99 г. з выявай постаці Вялікага князя Вітаўта. Т.: 206-33-17

КВАТЭРА

Прыстойны студэнт здыме пакой ці 1-пакаёвую кватэру. Т.: 215-14-59

Здыму кватэру-аднапакаёўку ў Менску (з кастрычніка). Т.: 245-84-92, 8-029-662-09-37

ПРАЦА

Якасна выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Магчыма рэпэтытарства. Т.: 235-18-72 (пасьля 16.00)

Праца ў хаце па месцы жыхарства. Нескладана, добры заробак. Для атрыманьня інфармацыі дашліце капэрту з Вашым адрасам. А/с 107, 210026, Віцебск

Пачэснае Панства! **25** верасьня а **18.00** (чацьвер)

лекцыя-пэрформанс пана Скіргайлы Палянэцкага

«Вэрбальная магія як развой культуры псыхічнае чыннасьці праз вызуканьне Веля-Літоўскае мовы»

З удзелам гурту **«Stara Litva»** й тэатральнымі імправізацыямі. Апроч абгрунтаваньня пурыстычнае канцэпцыі, у лекцыі выкладаецца падсумаваньне псыхалягічных назіраньняў за размаітымі асобамі а грамадзтвам з гледзішча ўплыву мовы на псыхіку. Гэныя высновы надзвычай карысныя для асобаў, занепакоеных лёсам Нацыі й рэлігійна заангажаваных, але будуць шокавымі для асобаў, ня ўзьнёслых па-над паспалітымі стэрэатыпамі, якія цераз разумовую неабачлівасьць грамадзтва сталіся нормаю, догматам ды правам і забіваюць боскую сутнасьць Чалавека пакрыёма.

Найболей цікаваю імпрэза будзе для асобаў, якія могуць, жадаюць або жадалі б давесьці сваю шляхецкасьць.

Чакаем на Панства ў актавай залі гістфаку БДУ на 3-м паверсе, на Чырвонаармейскай, 6. Даезд да ст.м. «Кастрычніцкая» або «Купалаўская».

Даведкі на т.: 247-13-40, запрасеце пана Скіргайлу.

тамсама

9 кастрычніка а 18.00

лекцыя пана Алёксы Дзерманіса

«Балцкая іста беларускага народу»

Абгрунтаваньне чысьціні балцкага паходжаньня беларусаў з гледзішча лінгвістыкі, антрапалёгіі й археалёгіі.

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Тэрыторыя свабоды

25 верасьня ў Доме літаратара (вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца юбілейная творчая вечарына Ўладзімера Арлова «Тэрыторыя свабоды». Апроч пісьменьніка, удзел бяруць Алесь Пашкевіч, Лявон Баршчэўскі, Адам Глёбус… Новыя й старыя песьні сьпявае Зьміцер Бартосік. Чакаюцца нечаканкі. Уваход вольны. Пачатак у 18.30

Гарадзенская вандроўка

Калі хочаш даведацца пра гісторыю свайго народу, далучайся да «Гарадзенскай вандроўкі»! Збор ля пажарнай вежы каля Новага замку 28 верасьня ў 13.00. Тэма экскурсіі — гісторыя гарадзенскага габрэйства.

ЗБМ «Беларускі Шлях»

запрашае на падарожжа

«Браслаўскі край»

28 верасьня (нядзеля). Маршрут: Глыбокае—Удзела—Мосар—Браслаў—гара Маяк—Слабодка—Олса—Відзы—Мядзел.

Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)

ZMK — PARTY

Шаноўная хрысьціянская моладзь!

Запрашаем на вечар, прысьвечаны пачатку навучальнага году, што пройдзе 25 верасьня ў клюбе «Тунэль» (пр.Пушкіна, 28; ст.м. «Пушкінская»). У праграме: дыскатэка, конкурсы з каштоўнымі падарункамі, сустрэча з удзельнікамі гурту «Tesaurus» (экс-«Армагедон») і… Пачатак а 19-й. Цана квітка 3000 руб. Падрабязнасьці на сайце маладых каталікоў: http://zmk.by.ru

Адказы на крыжаванку з №32

Pa haryzantach: 1. Mizantrop. 4. Avans. 6. Hudok. 7.Ta●r. 9.Karuś. 10.Vo●aść. 11.Bydła. 15. Viły. 16. «Krama». 18. Raka. 20. Traktar. 21. Tuby●r. 22. Step. 24. Kałun. 26. NASA. 28. Nasyp. 29. Bryhada. 32. Ša÷● 33. Tartu. 35. Ibiza. 37. Losik. 38. Symfonija

Pa vertykach: 1. Masad. 2. Paro●3. Pahonia. 4. Akno. 5. Staś. 6. Huś●8. Rybak. 9. Kranštejn. 12. Astro÷ski. 13. Łyntupy. 14. Drabiny. 15. Virus. 16. Karak. 17. Anton. 19. Aresa. 23. Tupat. 25. Łahojsk. 27. Suška. 30. Rau●31. Dzik. 34. Rebus. 36. Imo●

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3404. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 01.00 17.09.2003.
Замова № 4813.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а